ЛіМ
ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА
ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ
27 студзеня 1995 г. № 4 (3776) Кошт 200 руб.

ДЭМАКРАТЫЯ І ДЭМАС

Уладзімір ГУРВІЧ: "Мы прывыклі бачыць у свабодзе найвялікшую каштоўнасць, якая дадзена чалавеку. Гэта безумоўна так, бо ўсё ягонае развіццё і ёсць набыццё свабоды, яе рэалізацыя, вызваленне сябе з палону неабходнасці. Але гэта, так бы мовіць, асноўны вектар руху. У рэальнасці ж адносіны паміж свабодай і чалавекам складваюцца больш драматычна".

3, 14—15

ЗАБЛЫТАНЫЯ КАРАНІ

Мікола ХАУСТОВІЧ: "Створаная палітыкамі блытаніна ў найменнях падзяліла адзіны народ на беларусаў і літвінаў ды штурхала яго ў розныя бакі. І толькі напрыканцы XIX стагоддзя, калі бар'ер між беларусамі ды літвінамі стаў непераадольным, літвін стаў канчаткова атаясамлівацца з жамойтам. Гэтаму спрыяла і афіцыйная палітыка царызму".

5, 12

ДЫК ДЗЕ "ХАОС"?

Алесь КАЎРУС: "Беларускім лінгвістам усе савецкія дзесяцігоддзі даводзілася балансаваць паміж рэальным станам і штодзённымі патрэбамі мовы і той гістарычнай перспектывай "грамадскай неабходнасцю", якую ёй абмалявалі тэарэтыкі "зліцця-злівання" нацый".

6—7, 12

"Я Ў СВЕТ НЯСУ ЖЫЦЦЁ..."

Гутарка з лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы Раісай БАРАВІКОВАЙ.

8—9

З ансамблем "Класік-Авангард" спявае Віктар СКОРАБАГАТАЎ.

ФАКТ ТАЛЕНТУ

Слухачы — а ў той вечар зала на Залатой Горцы поўнілася людам — нібыта патрапілі на свята і атрымалі падарунак. А той, дзеля каго было наладжана гэтае свята, пачуваўся сапраўдным імяніннікам: як жа яшчэ можа пачувацца кампазітар падчас уласнага аўтарскага канцэрта? Тым больш, калі канцэрт прысвечаны 20-годдзю творчай дзейнасці...

Кампазітара Віктара Капыцьку мы нейк па інерцыі "залічвалі ў маладыя", а ён жа, аказваецца, увайшоў у пару творчага росквіту ды прафесійнай сталасці. Восенню 94-га ягоная Імша ў гонар Францыска Асізскага гучала ў Нью-Йорку. "Калыханка", фантазія для камернага ансамбля на тэмы трох калыханак — беларускай, нямецкай ды французскай — выконвалася на фестывалі сучаснай музыкі ў Швейцарыі... Гэткія "факты біяграфіі", вядома ж, значаць нямала. Аднак большае значэнне мае сам "факт таленту", які засведчылі слухачы канцэрта, складзенага з музычных прэм'ер ды ўжо добра вядомых твораў В. Капыцькі. Гучалі куранты, створаныя паводле старабеларускага ананімнага зборніка, літургічныя песняспевы, прысвечаныя памяці а. Аляксандра Меня, кантата "Знакі", "Калыханка" для камернага ансамбля, вакальныя творы на вершы А. Пушкіна, Ф. Цютчава, "Застольная" з оперы "Ягоныя жонкі"...

У аўтарскім канцэрце В. Капыцькі бралі ўдзел выдатныя нашы выканаўцы: Віктар Скорабагатаў, Ганна Каржанеўская, Ансамбль салістаў "Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава, Дзяржаўны камерны хор Беларусі на чале з Ігарам Мацюховым... І панаваў вольны й радасны дух Творчасці.

Фота В. СТРАЛКОЎСКАГА

Кампазітар Віктар КАПЫЦЬКА.

Дзяржаўны камерны хор Беларусі.

Dainova

ЛІМ КОЛА ДЗЁН

Чачня і Беларусь... Па вялікім рахунку, у нашых народаў мала агульнага ў гісторыі, культуры, менталітэце. Але ёсць адное падабенства, якое падчас станавілася лёсавырашальным: выгаднае геапалітычнае становішча. Адной з прычын цяперашняе вайны за Чачню расійскія палітыкі называюць якраз тое, што Чачня з'яўляецца варотамі на Каўказ. Беларусь, як мы добра ведаем, для Расіі — вароты ў Еўропу. "Акно", як сказаў бы Пётр I. Таму, пэўна, і зачасцілі да нас апошнім часам расійскія пасланнікі. Чакаецца і прыезд самога прэзідэнта. Але ці не зарана расійцы пачынаюць святкаваць перамогу на поўдні і скіроўваць свае погляды на захад?.. Як бы там ні было, аднак сёння ў нас яшчэ ёсць шанцы пазбегнуць чарговага "добраахвотнага" далучэння да імперыі. І залежыць гэта не ад "палітычнай" волі "бацькі" нацыі, а ад волі кожнага "маленькага" беларуса ў самай далёкай вёсцы і сталіцы.

НАВЕДАННЕ ТЫДНЯ

Тры дні правёў на Беларусі міністр замежных спраў Расіі Андрэй Козыраў. Праграма візіту была надзіва шырокай: ад сустрэчы з творчай інтэлігенцыяй да доўгай гутаркі з прэзідэнтам нашай краіны. А. Козыраў — чалавек вопытны ў справах палітычных, шмат пабачыў на сваім вяку і, мяркуем, зробіць з гэтых сустрэч і гутарак аб'ектыўныя высновы. Прынамсі, была ў яго магчымасць упэўніцца, што не ўсім беларусам уласцівы дух лакейства, і што ёсць у нас людзі, якія гатовы бараніць незалежнасць сваёй дзяржавы.

ЗЫХОД ТЫДНЯ

Дзмітрый Булахаў, не спраўдзіўшы ніводнае свае надзеі, канчаткова пакінуў прэзідэнцкую каманду і прыняў прапанову часова ўзначаліць думу партыі Усебеларускага адзінства і згоды. Без перабольшання, менавіта Дзмітрый Булахаў разам з Віктарам Ганчаром былі асноўнымі арганізатарамі перамогі Лукашэнкі на выбарах. Многія галасавалі не за Лукашэнку, а за маладых і, здавалася, рашучых палітыкаў, што былі ў ягонай камандзе. В. Ганчар хоць паспеў пабыць віцэ-прэм'ерам, Д. Булахаў адно вымушаны быў толькі вытлумачыць "пазіцыю" прэзідэнта ля парламенцкага мікрафона. Але абодва ніякім чынам не змаглі паўплываць ні на эканамічны, ні на палітычны курс "свайго" прэзідэнта. Зыход з каманды стаў непазбежным... Толькі не даюць спакою некалькі пытанняў да іх: "Няўжо, хлопцы, вы не бачылі, на каго ставіце? Навошта ж вы падманвалі сябе і людзей? Моўчкі, нават без пакаяння, сысці — самае простае, а каму і як выпраўляць цяпер вашыя памылкі?"

ПАРАДА ТЫДНЯ

Група дэпутатаў Пінскага гарсавета у адказ на прапанову аб аб'яднанні Расіі і Беларусі, што зыходзіць ад маскоўскіх жырыноўцаў і камуністаў, а таксама ад некаторых нашых "саборнікаў", прыняла зварот да Дзяржаўнай думы Расіі. У звароце, у прыватнасці, гаворыцца: "Мы раім вам накіраваць свае намаганні на як можна хутчэйшае спыненне агрэсіі ў Чачні, як гэта робіць дэпутат вашай думы Сяргей Кавалёў, а не займацца стварэннем новай імперыі. І жадаем Расіі стаць дэмакратычнай дзяржавай, у якой з Беларуссю будуць раўнапраўныя, узаемавыгадныя адносіны".

ПУБЛІКАЦЫЯ ТЫДНЯ

"Беларускі нацыяналізм. Ці ёсць ён?" — так назваў свой артыкул у "Народнай газеце" (25 студзеня г. г.) паэт і публіцыст Сяргей Законнікаў. Здавалася б, пытанне рытарычнае, але чаму ж тады гэтак голасна крычаць пра нейкае "насилие" розныя "русскоязычные" саюзы і саборы? Вытрыманы і аргументаваны артыкул стаў адказам найперш ім, а па-другое — напамінам нам, што "на Зямлі ёсць адна Беларусь, другой няма. Толькі тут, у месцы, вызначаным для беларусаў вышэйшаю воляю, яны змогуць рэалізавацца як народ, як нацыя... Гісторыя дала апошні шанц, які мы абавязаны скарыстаць. Інакш усіх нас чакае праклён нашчадкаў". Гэты артыкул яшчэ і прыклад іншым пісьменнікам: не маўчыце, пішыце, каб хоць раз на тыдзень падобныя публікацыі з'яўляліся ў "Народнай" і іншых газетах. Кропля за кропляй — вада і камень прабівае...

"ПРЫЗНАННЕ" ТЫДНЯ

Аляксандр Фядута, які ўзяў на сябе адказнасць за выхад беларускіх газет з "белымі плямамі" на палосах, назваў расследаванне гэтага факта пракуратураю не поўным і не аб'ектыўным. Пракуратура не ўлічыла, што "была зроблена яшчэ публічная заява, аўтар якой сказаў, што, на ягоную думку, ёсць толькі адна асоба ў рэспубліцы, якая можа даць такі загад". Няцяжка зразумець, што гэтая асоба — наш прэзідэнт, аднак А. Фядута, кіруючыся "службовай этыкай", не назваў яго. Маўчыць і прэзідэнт. Але ёсць надзея, што адказваць камусьці за "белыя плямы" ўсё ж давядзецца: 84 дэпутаты Вярхоўнага Савета звярнуліся ў Канстытуцыйны суд са зваротам разгледзець канстытуцыйнасць дзеянняў прэзідэнта па манапалізацыі сродкаў масавай інфармацыі і абмежаванні свабоды друку.

БЛЮЗНЕРСТВА ТЫДНЯ

У гэтую лімаўскую намінацыю павінен быў патрапіць наш прэзідэнт са сваім чарговым выступленнем па радыё і тэлебачанні. Замест таго, каб прыслухацца да крыку адчаю бюджэтнікаў (настаўнікаў, выхавацеляў, медыкаў, работнікаў культуры), якія за месяц працы зарабляюць на пару кіло варанай кілбасы альбо на адзін месячны праязны білет на грамадскі транспарт, Аляксандр Рыгоравіч накінуўся на "забастоўшчыкаў", якія не бачаць, што ўжо адзінаццаць дзён не падае курс беларускага рубля, што "мы стали жить лучше", што адзін прэзідэнт стараецца палепшыць жыццё людзей, а ўсе астатнія, у тым ліку і "так называемые официальные профсоюзы", яму перашкаджаюць. Аднак свайго шэфа пераплюнуў дарадца прэзідэнта С. Посахаў у артыкуле "Давайте научим орудия стрелять маслом..." у "Народной газеце" за 26 студзеня г. г. Пакідаем гэты артыкул без каментарыяў, аддаючы перавагу ў спрэчцы з прэзідэнтам за "ганаровае" месца ў "Коле дзён" С. Посахаву.

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

"У Рэспубліцы Беларусь дэмаграфічная сітуацыя ў перыяд з 1988 па 1992 год змянілася наступным чынам: нараджальнасць знізілася з 16 (у разліку на 1000 чалавек) да 12,4; смяротнасць павялічылася з 10,1 да 11,3. У выніку знізіўся натуральны прырост насельніцтва з 5,9 да 1,1. А ў такіх абласцях, як Віцебская, Мінская і Магілёўская, няма натуральнага прыросту насельніцтва, наадварот, смяротнасць перавышае нараджальнасць. У 1993—94 гг. дэмаграфічная сітуацыя яшчэ больш пагоршылася. Цяпер сярэдняя працягласць жыцця ў Рэспубліцы Беларусь складае: мужчын 66,3 года, жанчын 75,3 года. У той жа час раней сярэдняя працягласць жыцця жанчын складала 80 гадоў і была адной з самых высокіх у свеце".

(З артыкула М. Прыстрома "Выміраем?", "Народная газета", 25 студзеня г. г.).

АБСУРД ТЫДНЯ

Беларускае тэлебачанне паведаміла: кампазітар Эдуард Ханок напісаў **першую** песню для беларускага войска. Сам кампазітар прыехаў на прэзентацыю песні ў адну з вайсковых часцей. Бачым на экране шэрагі салдат і што чуем: "трасянку", г. зн. "великий и могучий" у выкананні беларускіх хлопцаў. Такое знарок не прыдумаеш: "першая" (у двукоссі, бо ёсць у нашага войска свае песні здаўна, толькі вось прыгадваць іх нехта не хоча) песня для незалежнага беларускага войска і — па-руску. Раней хоць дзеля прыліку такога сабе не дазвалялі. Цяпер можна ўсё...

ЧАЧНЯ ПРЫСУТНІЧАЛА Ў ЗАЛЕ...

Міністр замежных спраў Расійскай Федэрацыі пажадаў сустрэцца з творчай інтэлігенцыяй Беларусі. Прыехаў ён, вядома, па больш важных справах — каб надаць новы імпульс двухбаковым адносінам напярэдадні парафіравання палітычнага пагаднення паміж дзвюма брацкімі дзяржавамі. Тым не менш, такое жаданне — ці такая дыпламатычная патрэба — мелі месца, і творчыя саюзы з дапамогай тэлефона хуценька сабралі свой актыў у Доме літаратара.

Андрэй Козыраў ва ўласцівай яму спакойна-дружалюбнай манеры найперш прызнаўся, што не рыхтаваў вялікага даклада, а больш разлічваў на дыялог, на гутарку "кухонную", у сэнсе — давяральную, шчырую. Аднак падзеі ў Чачні мала садзейнічалі ўзаемаразуменню і эмацыянальнаму кантакту паміж беларускай інтэлігенцыяй і прадстаўніком расійскай выканаўчай улады. Адсюль і насцярожанасць прысутных, і ледзь прыкметная напружанасць высокага госця. І хоць "гарачая кропка" на Каўказе не стала асноўнай тэмай гаворкі, яе невідочная прысутнасць увесь час адчувалася.

На ўсе пытанні А. Козыраў адказваў, карыстаючыся яго выразам, у "дыпламатычным ключы", г. зн. абцякальна і звышдалікатна. Гутарка працякала ў двух руслах — грамадска-палітычным і культурным і тычылася ўнутраных праблем як Расіі, так і Беларусі. Было зазначана, што мы вымушаны жыць у расійскай інфармацыйнай прасторы, якая фарміруе адлаведную свядомасць нашага народа (згадаем у дужках, што ў свой час краіны Балтыі вокамгненна перакрылі каналы сувязі). Да нас едуць сумніцельныя асобы тыпу Э. Лімонава, усемагчымыя "саборы" і "саюзы" праводзяць на нашай зямлі сваю шавіністычную палітыку. У гэтай сувязі прагучала пытанне, чаму для Расіі нацыяналізм — гэта добра, а для іншых народаў былога СССР — блага? Тут у Андрэя Уладзіміравіча з'явілася магчымасць паразважаць пра такую цікавую, на яго погляд, з'яву. Ён нават выклаў уласную класіфікацыю нацыяналізму, падзяліўшыся пры гэтым уражаннямі ад сустрэч у Югаславіі.

Значная частка адрасаваных А. Козыраву прэтэнзій магла б быць заяўлена ўласнаму ўраду. Напрыклад, калі вырашыцца пытанне з вяртаннем культурна-гістарычных каштоўнасцей (калі яно будзе пастаўлена афіцыйна, на дзяржаўным узроўні); чаму паўтара мільёна нашых суайчыннікаў у РФ не могуць падпісацца на беларускія газеты (бо нашу "валюту" пакуль ніхто не прымае ўсур'ёз); на якой падставе ўсе мастацкія стужкі "Беларусьфільма" захоўваюцца ў Маскве (бо адтуль 70 год фінансаваўся так званы беларускі кінематограф) і г. д.

Гучалі заклікі да раўнапраўных, роўнапаважлівых адносін — і было сустрэчнае тлумачэнне з залы: перш мы павінны паважаць самі сябе, а значыць — прывесці да ўлады кіраўніцтва, якое забяспечыць нармальнае жыццё народа, не 10—15 долараў зарплаты, як у нас, а 100, як у Расіі.

І хоць гэтую залу нельга параўнаць з парахавой бочкай, але быў усё ж момант, які пагражаў выбухам. Іскру кінуў прадстаўнік Савета Федэрацыі расійскага парламента (ён не прадставіўся), "тонка" выказаўшы нараканне, чаму ў складзе "міратворчых" расійскіх войск у Абхазіі і Чачні няма братоў-славян. Пратэстуючым гулам, як ветрам, здзьмухнула парламентарыя з трыбуны... Спасылкі А. Козырава на "крымінальны" дудаеўскі рэжым, які і стаў прычынай сілавога ўздзеяння, гучалі непераканаўча.

Удзельнікі сустрэчы з нашага боку спрабавалі тактоўна давесці да свядомасці афіцыйных асоб суседняй дзяржавы, што там не павінна быць самападману адносна агульных гістарычных каранёў. Так, мы памятаем пра іх, і няма ніякай варожасці ў нашага народа да расіян, але ж у беларусаў іншы менталітэт: без комплексу вялікадзяржаўнасці, з большай цярпімасцю, з большым непрыняццем крыві як спосабу вырашэння канфліктаў.

Наконт магчымага сумеснага пасяджэння Вярхоўнага Савета РБ і Думы было сказана міністрам, што гэта ўсяго толькі ініцыятыва апошняй. І гаворка ідзе не пра "ўваходжанне" Беларусі ў Расію, а пра сумеснае абмеркаванне агульных пытанняў.

Андрэй Козыраў выказаўся за поўную свабоду сродкаў масавай інфармацыі, за плюралізм меркаванняў, за супрацоўніцтва на аснове ўзаемапавагі, прызнання суверэнітэту і дзяржаўнасці. "Наравістая" творчая аўдыторыя слухала высокага госця з вялікай увагай, паводзіла сябе стрымана і з годнасцю, у выніку "клімат" у зале паступова змяніўся ў бок пацяплення.

Міністр замежных спраў РБ У. Сянько суправаджаў калегу згодна пратаколу, але слова не браў.

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

У час сустрэчы ў Доме літаратара.

Фота Я. КАЗЮЛІ, БЕЛІНФАРМ

ПЯТЫМ УГОДКАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

31 студзеня г. г. у Доме літаратара (Фрунзе, 5) адбудзецца пасяджэнне "круглага стала", які прысвячаецца пятым угодкам з дня прыняцця Вярхоўным Саветам Закона аб мовах. Пасяджэнне ладзіць Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны з удзелам камісіі Вярхоўнага Савета, прадстаўнікоў шэрагу міністэрстваў і ведамстваў, грамадскіх арганізацый.

Пачатак — у 15 гадзін 30 хвілін.

У 18.30 у вялікай зале — мастацкая частка з удзелам прафесійных і самадзейных калектываў.

Уваход свабодны.

САКРАТАРЫЯТ ТБМ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

ПОЙДЗЕШ НАЛЕВА...

ЭКСПРЭС-КАМЕНТАРЫЙ

З добра інфармаваных крыніц у адміністрацыі прэзідэнта нам стала вядома, што спадар Лукашэнка ў чарговы раз адклаў падпісанне шэрагу дакументаў, закліканых рэанімаваць прыватызацыю ў Рэспубліцы Беларусь.

Праблема раздзяржаўлення эканомікі, прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці, г. зн. праблема, пераважна эканамічная і юрыдычная, стала праблемай і палітычнай. Адлаведна і вырашаецца яна з куды большай аглядкай на палітычныя меркаванні. Пытанне пра тое, ці добра, што склалася так, а не інакш, мы апускаем, як акадэмічнае.

Аднак цяпер набліжаецца момант, калі сітуацыю ў гэтай сферы трэба ламаць. У чым адбіліся палітычныя меркаванні ў прыватызацыі? Калі ў двух словах, дык у народнай, г. зн. чэкавай прыватызацыі, і ў вельмі значных ільготах калектывам прыватызуемых прадпрыемстваў.

Большасць беларускіх эканамістаў, якія лічаць сябе рыначнікамі ліберальнай арыентацыі, крытыкуючы тэмпы і метады прыватызацыі ў Беларусі, дэманструюць неразуменне прыхаванага сэнсу пералічаных ільгот. Аднак такая знарочыстая наіўнасць да месца толькі што ў аперэце.

Неаспрэчна, што памкненні аднавіць гістарычную справядлівасць і вярнуць народу дабро, якое гэтаму народу належыць, маюць месца. Але ў аснове гэтага памкнення ляжалі матывы, куды больш празаічныя: у краіне проста няма грошай. Таму прыватызацыю, неабходнасць якой яшчэ ўраду Кебіча была больш чым зразумелая, трэба праводзіць ці то бясплатна, ці то ніяк. Адсюль і ваўчары, і заніжаныя ацэнкі маёмасці, і іншае, і іншае...

Часцяком можна пачуць думку, што калі б не лібералізацыя цэн папярэднічала прыватызацыі, а наадварот, то была б зусім іншая рэч... Але атрымалася інакш: грымнуў так званы шок без тэрапіі, за лічаныя месяцы ён ператварыў у пыл і зберажэнні насельніцтва, і зберажэнні прадпрыемстваў (абаротныя сродкі, амартызацыйныя фонды, фонды развіцця вытворчасці). І з гэтага моманту прыватызацыя, яшчэ не пачаўшыся, ужо была асуджана на бясплатнасць.

Гэтая ж "тэрапія" да крайнасці абвастрыла і палітычную неабходнасць бясплатнай прыватызацыі: публіцы, якая імкліва бяднела, трэба было штосьці пакласці ў рукі, прычым з абавязковай пячаткай і вялікай колькасцю нулёў. Вось і з'явіўся беларускі ваўчар (хоць нешта рэальнае, за якім трэба звыкла пастаяць у чарзе ў розных канторах), за які паабяцалі раздаць частачкі нацыянальнага багацця.

Аднак па добрай савецкай палітычнай традыцыі пераемнасць улады ў нас грунтуецца на прынцыпе "ты начальнік — я дурань, я начальнік — ты дурань". У адпаведнасці з гэтай выдатнай сентэнцыяй усе дзеянні папярэднікаў падлягаюць прадузятай крытыцы, у тым ліку з ужываннем норм крымінальнага заканадаўства. Манеўры вакол прыватызацыі —

БО СЛЁЗ УЖО НЯМА

СОТЫЯ "ТУТЭЙШЫЯ" НА КУПАЛАВАЙ СЦЭНЕ

Які спектакль, уражваючы, нават Зянона Пазняка прымусіць згадаць, што ягоная прафесія — усё-такі мастацтвазнаўца?

"Тутэйшыя". "Купалавым творам на Купалавай сцэне шэнціла, — заўважыў Зянон Станіслававіч са сцэны, віншуючы купалаўцаў з сотым паказам, — яны жылі тут доўга. "Паўлінцы" ўжо за пяцьдзесят, прызнанне і разуменне напаткалі "Раскіданае гняздо" ў пастаноўцы Барыса Луцэнкі. Не віна тэатра, што знайшліся сілы, якія скарацілі спектаклю ягоны век. Наш самы ўлюбёны, любімы спектакль — "Тутэйшыя". Услед за спектаклем назіраем сёння змены-перамены "палітычнай сітуацыі", — а яна, мовім так, метамарфозіцца. Але якою б яна ні была, — усё адно творчасць — гэта радасць, і мы жадаем вам творчых поспехаў і творчае радасці". І аддаў кветкі Марыі Захарэвіч.

Сотыя "Тутэйшыя" 23 студзеня ў соты раз нам паўтарылі вуснамі яе гераіні Ганулі: незвычайныя мы людзі. Хоць бы таму, што ўмеем так шчыра радавацца ў самую скрутную часіну. Нават у соты раз, калі "Тутэйшых" не ўшанавалі аншлагам (пралік тэатра з найпростаю рэкламаю, а мо і брак грошай на яе?), морам кветак, падарункаў ды абяцанняў зрабіць усё, каб... Каб жарты або іронія адсунуліся ўбок: Купалаў тэатр сёння — праўдзівая акадэмія сцэнічнага мастацтва і мог бы ўзяць на сябе навучальныя і выхаваўчыя клопаты пра будучыню... Ат! Тэатр, падобна, зняверваецца ў сваёй уласнай будучыні, пакуль сама пераканаўчасць, сама праўдзівасць майстэрства купалаўцаў міжволі пераконвае ў адваротным. "Тутэйшыя", па-за "палітычнай сітуацыяй", мяняліся не імкліва, не порстка, не пэўна; верагодна, што мяняліся больш пад уплывам праўды мастацкай, а не жыццёвай. Прыцьмелі гратэскавыя фарбы, шчодра выдаткаваныя на Здольніка і Зносака, а іх дачыненні рупнасцю або гнуткасцю, чуйнасцю да пераменаў у Аляксандра Лабуша ды Віктара Манаева... трагічна ачалавечыліся...

Спектакль нібыта стаміўся. Стаміўся ад "палітычнай сітуацыі". Выканаўцы міжволі вярнуліся да ўлюбёнага беларускага жанру — трагікамедыі, што ўсмешліва выкрывае, не папраўдзе знішчае, гуляе шматпланавасцю, абяззбройвае, а яшчэ больш — сама абяззбройваецца, пакуль дойдзе да эпілога. Дойдзе і паляжа, і будзе палягаць, і палягае якраз на мяжы геніяльнасці і дурноты беларускага народа...

Незвычайныя мы людзі. Смяёмся. Радуемся. Бо слёз ужо няма.

Жана ЛАШКЕВІЧ

З ЛЮБОЎЮ І АГНЁМ

СПРОБА ПАМФЛЕТА

Гэта парадыйная рэч, акрамя іншых хібаў, мае недахоп часавы — можа састарэць, не паспеўшы з'явіцца ў друку. Гэта, канешне, робіць сумніцельнымі яе шанцы быць надрукаванай. І ўсё ж словы ўяўнага эпіграфа "Рускія ідуць!", народжаныя ва ўлонні амерыканскага фальклору, відаць, не згубяць сваёй актуальнасці яшчэ доўга, пакуль будуць жыць месіянскія ілюзіі і старыя імперскія комплексы вялікамаскоўскага паходжання.

Васіль АЎРАМЕНКА

Цяжкія часы насталі для нашае вялікае дзяржавы. Сёння не тое, што раней, і нашае былое дабро з кулакамі ўжо не ўпраўляецца на ўсіх абшарах шостае часткі планеты, а таму мусім сказаць сваё важкае слова ўсім заблукаўшым.

Мы любім вас і вашу зямлю так самааддана, што не можам уявіць, як выжывеце вы без нас. Мы любім вас так моцна, што гатовы забіць вас пры адной толькі думцы, што вы будзеце не з намі. Гэта не проста рэўнасць, гэта божая воля і вашае выратаванне, бо толькі смяротна любячы ведае, што трэба ягонаму каханку, толькі ён знае, як усталяваць парадак і вывесці з цемры аблудаў. Наша любоў бязмежная, шчырая. О, нашы бедныя няўцямныя браты! Як вы маглі падумаць, што можа быць нешта лепшае за нашу адзінавернадзяржаўную любоў? Вы памыляліся, вас увялі ў зман розныя злыдні і чужынцы. Нядоўга вам засталося чакаць, мы імчым на дапамогу з агнём у грудзях і мячом у руках. Выбачайце, калі будзе крышачку балюча. Мы, як і раней, любім вас, хочам вам свайго дабра і міру. З намі бог, а мы — з вамі.

Усесаюзны панславянскі камітэт "За саборную Русь"

Перадрук

ДЭМАКРАТЫЯ І ДЭМАС

Нягледзячы на адсутнасць у нашай краіне пасля 1917 года і да самага апошняга моманту класічнай адукацыі, практычна ўсе расіяне ведаюць, што ў перакладзе са старажытнагрэчаскай слова "дэмакратыя" азначае ўладу дэмаса, гэта значыць народа. Але наколькі існуючыя ў свеце сістэмы, што называюць сябе дэмакратычнымі, адпавядаюць гэтай назве? Калі падыходзіць да сітуацыі з фармальнага пункту погляду, дык варта прызнаць, што пераважна гэтак яно і ёсць: у дзяржавах з развітым дэмакратычным уладкаваннем улада знаходзіцца ў руках народа ці, правільней, тых людзей, якіх народ сам выбірае. У гэтых краінах рэгулярна праводзяцца ўсеагульныя выбары, прэса і тэлебачанне бесперашкодна рэалізоўваюць свае правы на свабоду інфармацыі, што дазваляе ім нястомна крытыкаваць урад; парламент, палітычныя партыі дзейнічаюць без усялякіх абмежаванняў і досыць сумленна змагаюцца за галасы выбаршчыкаў.

Сённяшні варыянт дэмакратычнай сістэмы — вынік доўгага эвалюцыйнага развіцця, у ёй скандэнсавалася чалавечая мудрасць і цярпімасць, назапашаныя за мінуўшыя стагоддзі, сканцэнтраваўся шматвяковы гістарычны вопыт. У дэмакратыі набыў сваё выяўленне інстынкт самазахавання грамадства, які знайшоў пасля працяглага пошуку цывілізаваную форму для сваёй рэалізацыі. Так што дэмакратыя несумненна з'яўляецца вялікім дасягненнем палітычнага будаўніцтва. Яе перавагі перад іншымі формамі палітычных сістэм заключаюцца ў тым, што, з аднаго боку, яна здольная забяспечыць няўхільнае эвалюцыйнае развіццё грамадства, а з другога — падтрымку і зберажэнне грамадскай стабільнасці. Такім унікальным спалучэннем не валодае ніводны з дэспатычных рэжымаў. Але ў дэмакратыі ёсць свае ахілесавыя пяты.

Перш за ўсё трэба ўказаць на небяспеку, якую ўяўляюць сабой празмерныя дэмакратычныя ілюзіі. Неразуменне сутнасці дэмакратыі, фетышызацыя яе ідэалаў прыводзяць нярэдка да сумных вынікаў. У многіх выпадках дэмакратыю ўспрымаюць як вышэйшую каштоўнасць, якую неабходна ахоўваць і абараняць пры любых акалічнасцях. У сапраўднасці ж усё крыху інакш — **сама па сабе дэмакратыя не валодае нейкай звышкаштоўнасцю**, яна не больш чым **інструмент** для дасягнення пэўных мэт, для вырашэння задач, што стаяць перад грамадствам. Яе можна параўнаць з рамай, у якой вісіць каштоўная карціна. І калі палатну нанесена шкода, дык аніякая акаймоўка не можа яго паправіць.

Абсалютнай каштоўнасцю валодае не дэмакратыя, а свабода. Дэмакратыя — толькі спосаб яе найбольш поўнай рэалізацыі, канкрэтная форма, у якой яна існуе ў сучасным свеце. Таму калі людзі імкнуцца абараніць адцягненыя дэмакратычныя прынцыпы, не суадносячыся з тым, ці спрыяе гэта захаванню альбо ўмацаванню свабоды, дык нярэдка ўзнікае сітуацыя, калі **занадта шырокая дэмакратыя пачынае пагражаць самому існаванню свабоды.** Такія прыклады добра вядомыя: звяржэнне бальшавікамі Часовага ўрада, які спрабаваў утрымацца ў межах дэмакратыі і закона і не змог своечасова нейтралізаваць іх праціўнікаў няхай сабе нават недэмакратычнымі метадамі; прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі праз дэмакратычныя парламенцкія выбары... Такія дзіўныя на першы погляд калізіі адбываюцца з-за наяўнасці так званай дэмакратычнай пасткі, механізм якой мы толькі што апісалі: грамадства адстойвае **не мэту, а сродак, не свабоду, а дэмакратыю.** Гэтай сітуацыяй лоўка карыстаюцца праціўнікі і свабоды, і дэмакратыі. Зыходзячы з тактычных меркаванняў, яны раптам пачынаюць заяўляць аб сабе як аб палымянах прыхільніках дэмакратычных прынцыпаў, якія яны быццам бы гатовыя адстойваць да апошняй кроплі крыві. (Гэтак часта і адбываецца — толькі кроў звычайна не іхняя, а ці сапраўдных абаронцаў дэмакратыі, ці падманутых імі людзей). Антыдэмакратычныя сілы даўно ўжо ўсвядомілі, што пры пэўных абставінах дэмакратычныя інстытуты становяцца досыць зручнымі для пад'ёму на вяршыні ўлады. Такая сітуацыя ставіць сапраўдных дэмакратаў перад складаным выбарам: для таго, каб уратаваць дэмакратыю ўвогуле, ім даводзіцца ахвяраваць асобнымі яе часткамі, а ў крытычныя сітуацыі і ўсёй дэмакратычнай сістэмай. Але падобная вымушаная мера дае падставы супрацьлегламу лагеру выкарыстоўваць бязмежную дэмагогію, абвінавачваючы сваіх праціўнікаў у парушэнні свяшчэнных прынцыпаў дэмакратыі, у імкненні да дыктатуры і г. д. У гэтай сувязі дарэчы прывесці словы нямецкага філосафа К. Ясперса:

"У рашучыя моманты заўсёды застаюцца выбары, у якіх удзельнічае ўсё насельніцтва дадзенай краіны. Аднак форма дэмакратыі, гэта значыць права на свабоднае, роўнае і тайнае галасаванне, зусім не з'яўляецца гарантыяй свабоды... Свабода, асабліва калі яна даецца народу, не падрыхтаванаму да гэтага самавыхаваннем, знячэўку можа не толькі прывесці да ахлакратыі і ўрэшце да тыраніі, але ўжо да гэтага спрыяць таму, што ўлада апынецца ў руках выпадкова ўзнесенай клікі, бо насельніцтва, па сутнасці, не ведае, за што аддае галасы...

Тое, як сапраўдную дэмакратыю абараняюць ад ахлакратыі і тыраніі, ад выпадковай клікі і духоўна залежных людзей, з'яўляецца жыццёва важным пытаннем свабоды. Неабходна стварыць стрымліваючыя інстанцыі, здольныя супрацьдзейнічаць самазабойчым тэндэнцыям фармальнай дэмакратыі. Абсалютны суверэнітэт большасці, якая выпадкова апынулася ў дадзены момант ля ўлады, павінен быць абмежаваны чымсьці стабільным".

Калі звярнуць асаблівую ўвагу на канец гэтай доўгай цытаты, дык узнікае адчуванне незавершанасці думкі. У чым жа заключаецца гэтае самае стабільнае, якое павінна нейкім чынам абмежаваць суверэнітэт людзей, што выпадкова аказаліся пры ўладзе? Адказу Ясперс не дае. Між тым ён надзвычай важны і патрэбны, бо ад таго, як вырашаецца ў той ці іншы гістарычны момант дадзеная дылема, нярэдка залежаць лёсы дзяржавы і нават усяго свету. Знайсці рашэнне гэтай праблемы няпроста, бо ў ёй знайшла адлюстраванне ўжо пазначаная намі калізія свабоды і дэмакратыі. Адносіны, якія ўзнікаюць між імі, гэта не толькі адносіны супрацоўніцтва і партнёрства, іх таксама падзяляе моцнае энергетычнае поле супярэчнасцей.

1.

Па традыцыі, радзімай дэмакратыі лічыцца Грэцыя. Але чаму яна ўзнікла менавіта там, чаму менавіта ў гэтай краіне яна набыла такое моцнае развіццё і гучанне? Разгорнем адну са старонак грэчаскай гісторыі. З 725 па 325 год да нашай эры Элада зведвала сур'ёзную нястачу прадуктаў харчавання. Як яна паспрабавала выйсці з крызісу? Гарады Карынф і Халкіда сталі накіроўваць сваё лішняе насельніцтва для каланізацыі іншых тэрыторый, дзе ўзнаўляліся парадкі метраполіі. Ва ўласцівым ёй стылі павяла сябе Спарта: для задавальнення зямельнага голаду яна захапіла, суседнія грэчаскія землі. Гэта стала адной з прычын глабальнай мілітарызацыі Спарты.

Інакш адрэагавалі на сітуацыю Афіны. Там паспрабавалі пераарыентаваць эканоміку на экспарт, адначасова стала заахвочвацца развіццё рамёстваў і гандлю. Гэта дало штуршок да змены палітычнай сістэмы: наспяваючая сацыяльная рэвалюцыя была папярэджана дзякуючы выкарыстанню палітычных і эканамічных рэгулятараў і дэмакратызацыі грамадскага жыцця. Пазней гэтыя пераўтварэнні далі падставы Перыклу ахарактарызаваць дадзены перыяд школай для Элады.

(Адзначым, што падобная сітуацыя паўтаралася пасля ў гісторыі бясконцую колькасць разоў. І заўсёды пры яе вырашэнні ўзнікала, умоўна кажучы, спартанская дылема: ісці па шляху знешняй экспансіі і ўнутранай рэакцыі ці здзяйсняць глыбокія сацыяльныя і дэмакратычныя пераўтварэнні?)

Аб чым сведчыць гэтая гістарычная рэмінісцэнцыя? Патрэба ва ўсталяванні дэмакратычнага рэжыму паяўляецца там, дзе на той момант існуе найвышэйшы ўзровень свабоды. У свабодзе ж мелі патрэбу перш за ўсё тыя грамадствы, дзе сур'ёзнае развіццё атрымалі гандаль, рамесніцкая вытворчасць, гэта значыць там, дзе ўжо існаваў досыць глыбокі падзел працы. Патрэба ў свабодзе ў такіх грамадскіх сістэмах узнікае яшчэ і таму, што і занятак гандлем і рамяством вымагае ініцыятывы і асабістай зацікаўленасці ў выніках сваёй дзейнасці. Гэта прыводзіць да паяўлення адносна незалежнага і самастойнага пласта людзей, якія не выносяць над сабой грубага прымусу. Такія тэндэнцыі асабліва яўна праяўляліся ў марскіх цывілізацыях, бо займацца мараплаваннем, марской камерцыяй маглі толькі свабодныя члены грамадства. У сваю чаргу свабода, каб не ператварыцца ў анархію, вымагала пэўнай грамадскай арганізацыі, якая і вылілася ў сістэму, што атрымала назву дэмакратыі.

Вядома, наяўнасць развітога гандлю, хай нават марскога, зусім не азначае аўтаматычнай перамогі дэмакратыі: **грамадства знаходзіцца ў стане перманентнага вагання паміж свабодай і дэспатыяй.** Нават краіны, дзе, здавалася б, дэмакратычныя інстытуты ўкараніліся глыбока і на першы погляд беспаваротна, патэнцыяльна знаходзяцца ў тым жа стане. Выпадак жа з Афінамі адзін з нямногіх, дзе народ аддаў перавагу свабодзе. Гэтае лёсаноснае рашэнне прывяло да таго, што ў гэтай маленечкай дзяржаве аказаліся выпрацаванымі тыя прынцыпы, упершыню прайшлі апрабацыю тыя ідэі, якія пасля ў значнай ступені вызначылі шлях і характар развіцця еўрапейскай і сусветнай цывілізацыі. Пры гэтым гаворка зусім не ідзе аб ідэалізацыі Афінскай дзяржавы: дэмакратыя, якая там існавала, была вельмі недасканалая, нестабільная — то яна пераўтваралася ў форму ахлакратыі, то ўлада пераходзіла да арыстакратыі. Гэтая дэмакратыя пераследвала вальнадумства (прыгадаем пакаранне смерцю Сакрата), праводзіла імперскую палітыку (Пелапанескія войны за першынство Афін у Грэцыі). І ўсё ж той узровень свабоды, які быў тады дасягнуты, дазволіў зрабіць такі крок наперад у развіцці сацыяльнай думкі, што нават і цяпер мы пастаянна звяртаемся да гэтай спадчыны.

Старажытная Грэцыя аказалася першай краінай, якая паспрабавала ажыццявіць ідэю свабоды на дзяржаўным узроўні. Між тым праблема свабоды асобы ўзнікла ці не адразу, як толькі чалавек усвядоміў сябе самастойнай, унікальнай сутнасцю. Аднак свабода доўгі час не ўспрымалася архаічнымі грамадствамі як самастойная каштоўнасць. Так пачалі ўзнікаць рознага роду дэспатыі. Другі шлях быў куды больш цяжкі і доўгі, яго выбралі толькі нямногія нацыі і дзяржавы: ён праходзіў праз стварэнне палітычнай сістэмы, якая не адбірала б у народа свабоду, а знаходзіла спосаб уключыць яе ў дзяржаўны палітычны механізм. Так узнікла дэмакратыя.

Як ужо адзначалася, **дэмакратыя ёсць толькі форма, у якой выступае свабода**, так бы мовіць, яе віцмундзір. Крой жа мундзіра вызначаецца ўзроўнем развіцця грамадства, той ступенню свабоды, якую яно ў стане дазволіць сабе, каб не выклікаць разбуральных тэндэнцый. Гаворка ідзе аб каналізацыі свабоды, аб накіраванні яе па тых рэчышчах, дзе яна здольная стаць вільгаццю для арашэння сацыяльнай глебы, а не селевым знішчальным патокам.

М. Бярдзяеў пісаў: "Прымусовае дабро не ёсць ужо дабро, яно пераараджаецца ў зло. Свабоднае ж дабро, якое ёсць адзінае дабро, прадугледжвае свабоду зла".

Дэмакратыя спрабуе знайсці кампраміс, нейкі прамежкавы стан між той абсалютнай свабодай, якая аднолькава расчыняе дзверы дабру і злу, і той прымусовай свабодай, якая ўжо ёсць не бязмежнае дабро, але якая хоць неяк абмяжоўвае распаўсюджанне зла. У гэтай няпростай антыноміі і заключаецца галоўнае пытанне дэмакратыі.

2.

Адносіны, якія складваюцца паміж свабодай і дэмакратыяй, непазбежна падводзяць нас да другой тэмы — пра ўзаемаадносіны народа і свабоды, народа і дэмакратыі.

Мы прывыклі бачыць у свабодзе найвялікшую каштоўнасць, якая дадзена чалавеку. Гэта безумоўна так, бо ўсё ягонае развіццё і ёсць набыццё свабоды, яе рэалізацыя, вызваленне сябе з палону неабходнасці. Але гэта, так бы мовіць, асноўны

(Працяг на стар. 14)

толькі адзін з выпадкаў беларускай палітычнай практыкі.

Але тут ёсць нюансы, якія шматлікія эксперты не заўважаюць. Гэта зашоранасць робіцца зразумелай, калі ўлічыць, што большасць з іх лічыць эталонам заходнюю мадэль прыватызацыі, скажам, брытанскую. Калі ж прыгадваецца вопыт былых сацкраін, то ў асноўным у сувязі з "шокавай тэрапіяй" ў Польшчы. Між тым, вялікую цікавасць уяўляе вопыт Венгрыі, па якім можна меркаваць пра плюсы і мінусы альтэрнатыўнага "шокавай тэрапіі" спосабу рыначнай трансфармацыі — дынамічнай паслядоўнай паступовасці.

Венгерская праграма рэформ змяшчала наступны тэзіс: "Урад мае намер ажыццявіць характэрныя для рынкавай гаспадаркі формы і прапорцыі не шляхам адзіначасавай рэформы, а закончыўшы вырашальны рывок у гэтым напрамку на працягу 3—5 гадоў". Такім чынам, асноўны прынцып тут — не абвальная прыватызацыя, а працэс.

Другая асаблівасць венгерскай мадэлі прыватызацыі, у адрозненне ад іншых краін Усходняй Еўропы — яе пераважная платнасць. Бясплатная перадача ўласнасці новаму ўладальніку магчымая толькі ў выключных выпадках, калі гаворка ідзе пра такіх калектыўных уласнікаў, як страхавыя фонды, царква і да т.п.

Усеагульнае бязвыплатнае размеркаванне народных акцый, бонаў ці купонаў (як у нас), якія даюць права на частку дзяржаўнай маёмасці, ва ўмовах інфляцыі і зніжэння жыццёвага ўзроўню прывядзе да таго, што большасць жыхароў пачнуць іх прадаваць. І знешне дэмакратычнае рашэнне на справе стане канцэнтрацыяй уласнасці ў руках нямногіх асоб, якія за капейкі стануць уладальнікамі вялікага багацця.

Трэцяй асаблівасцю венгерскай прыватызацыі з'яўляецца пэўны накірунак прыватызацыйных сродкаў. Яны ідуць не ў бюджэт і не на пагашэнне дзяржаўнага доўгу, а накіроўваюцца на мадэрнізацыю прыватызацыйных мерапрыемстваў і стварэнне гарантыйных фондаў для банкаў, якія выдаюць крэдыты пад прыватызацыю.

Такая вось кароткая схема, ужытая ў Венгрыі, і якая — пры пэўных умовах — можа быць спраецыравана на Беларусь. Калі ж нам і далей ісці па шляху прадастаўлення льгот і зніжэння кошту, гэта прывядзе да карупцыі нябачных памераў.

Адным словам, як у той казцы: "Пойдзеш налева..." Вось і чакаем мы ад дзяржаўных мужоў выбару правільнага накірунку. Калі гэта ім пад сілу...

А. МАМЕТАЎ,
эканамічны аглядальнік "ЛіМа"

ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ

Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь узнагароджаны пісьменнік Зіновій Прыгодзіч. Такой высокай узнагародай адзначана шматгадовая плённая літаратурная дзейнасць Зіновія Кірылавіча і яго значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры.

ПЕРШЫ ПРЫВАТНЫ

У адным з будынкаў Віцебска, дзе доўгія гады жылі першыя сакратары абласнога камітэта партыі, цяпер размясціўся музей прыватных калекцый. Пакуль ён не мае аналагаў у рэспубліцы. Створаны музей на аснове унікальнай калекцыі віцябляніна Івана Галькевіча, які памёр у 1976 годзе ва ўзросце 74 гадоў.

На працягу жыцця Галькевіч сабраў тры калекцыі: першую ён перадаў гораду ў 1927 годзе, другая, на жаль, загінула ў гады вайны, трэцяя, сабраная за апошнія 30 гадоў разам з жонкай Аляксандрай Пятроўнай, перададзена дзяржаве. Збіральніку былі не чужыя ўсе віды калекцыянавання: нумізматыка, фалерыстыка, баністыка, скульптура, літаратура і многае іншае. Унікальны набор памятных медалёў, якія не адшукаеш і ў дзяржаўных музеях.

Сёння ў экспазіцыі, якая размясцілася ў чатырох залах, прадстаўлена толькі частка калекцыі Івана Галькевіча.

На здымку: у адной з залаў музея.

Аляксандр ХІТРОЎ, БЕЛІНФАРМ
Фота аўтара

ПАГЛЯДЗІЦЕ Ў ЛЮТЫМ...

1 лютага Дом літаратара запрашае ўсіх жадаючых у Саюз кінематаграфістаў Беларусі (Мінск, вул. К. Маркса, 5), дзе адбудзецца ў 18 гадзін 30 мінут прагляд дакументальнага відэафільма пра Алеся Адамовіча "Развітанне" (аўтар стужкі — Ф. Кучар).

Астатнія мерапрыемствы месяца традыцыйна пройдуць у самім Доме літаратара.

На 8 лютага запланавана вечарына "Сцежкамі песняра-пакутніка", прымеркаваная да 90-х угодкаў з дня нараджэння Алеся Пальчэўскага.

Прэзентацыя мастацкага фільма рэжысёра Дзмітрыя Зайцава "Кветкі правінцыі" паводле аднайменнага рамана Георгія Марчука пройдзе 15 лютага.

Прэм'ера кнігі мініяцюр і вершаў у прозе Анатоля Кірвеля "Урбанія" адбудзецца 23 лютага.

105-ыя ўгодкі з дня нараджэння пісьменніка Казіміра Сваяка адзначаюцца 28 лютага. Вечар называецца "Пішу, бо плача сэрца".

Усе гэтыя мерапрыемствы пачнуцца ў 18 гадз. 30 мінут.

Секцыя ж перакладу па тэме "Замежная літаратура і адукацыя" пачне работу ў 15 гадзін 22 лютага.

У СВЕТ — З ЛЕПШЫМ

У Расійскай Федэрацыі прынята так званая "Федэральная мэтавая праграма кнігавыдання Расіі". Згодна з ёю зялёнае святло даецца найбольш высокамастацкім творам не толькі пісьменнікаў Расіі. Не абыдзены ўвагай і літаратары з колішніх рэспублік былога Савецкага Саюза. Каб прыцягнуць увагу выдаўцоў да іх творчасці, выпускаецца і "Рэкламная бібліятэка паэзіі". Адной з чарговых кніжак у ёй стаў зборнік Валянціна Лукшы "Паданні даўніны глыбокай...". Творы, якія склалі яго, перакладзены на рускую мову Сяргеем Красікавым.

Пошта

АБ ДВУХМОЎІ,

ці ЯК БЕЛАРУСАМ ПРАПАНУЮЦЬ ІСЦІ ШЛЯХАМ ЦЁЦІ СОНІ

У апошні час абвастрыліся спрэчкі наконт двухмоўя на Беларусі. Кансерватыўныя і рэакцыйныя антыбеларускія сілы, абапіраючыся на падтрымку дзяржаўных чыноўнікаў і рэзкія выказванні прэзідэнта А. Лукашэнкі супраць беларускай мовы, прапануюць увядзенне дзяржаўнага двухмоўя, наданне рускай мове статуса дзяржаўнай. Наступ на беларускую мову ўзмацніўся з далейшай мэтай яе ліквідацыі і ўключэння беларусаў у склад адзінага вялікага рускага народа, ліквідацыі суверэнітэту Беларускай дзяржавы.

У гэтым наступе рэй вядуць нешматлікія Славянскі Сабор "Белая Русь" і філіял расійскай партыі Жырыноўскага на Беларусі — Ліберальна-дэмакратычная партыя (якім сродкі масавай інфармацыі Беларусі ўвесь час даюць рэкламу), а таксама наменклатура, цесна звязаная з маскоўскай наменклатурай, расійскімі ўрадавымі і прыватнымі банкаўскімі і прамысловымі коламі, прадстаўнікамі расійскага капіталізму. Падтрымліваюць гэтую палітыку колы, блізкія да расійскага ўрада, і большасць расійскіх дэмакратаў, якія (як і афіцыйныя расійскія колы) разглядаюць Беларусь як тэрыторыю, неабходную для Расіі ў якасці вайсковага плацдарма ў геапалітычных дачыненнях з Заходняй Еўропай, як тэрыторыю, праз якую ідуць гаспадарчыя шляхі на Захад, а беларускіх салдат — як дадатковыя сілы для вядзення каланіяльных войнаў. Такім чынам, барацьба за двухмоўе, білінгвізм, прыкрываючыся быццам бы абаронай правоў чалавека (у тым ліку пытаннем аб мове навучання ў школе і ВНУ), мае выразны імперскі, шавіністычны характар.

Да гэтай прапагандысцкай кампаніі далучыўся і вядомы на Беларусі маскоўскі даследчык па гісторыі кнігадрукавання XIV ст., доктар гістарычных навук, прафесар Яўген Львовіч Неміроўскі. Кнігі яго вядомыя на Беларусі, бо ён даследаваў і дзейнасць Ф. Скарыны і Івана Фёдарава на Беларусі. Ён супрацоўнічае з Інстытутамі літаратуры і гісторыі Акадэміі навук Беларусі.

У газеце "Книжное обозрение" (N 46, 1994 г.) Яўген Неміроўскі апублікаваў вялікі артыкул "О русификации и судьбе тети Сони". Гэты артыкул мае не толькі публіцыстычнае значэнне, але прэтэндуе і на гістарычны аналіз моўнай сітуацыі на Украіне і Беларусі. Але аналіз гэты зроблены павярхоўна, без ведання грунтоўных прац беларускіх, украінскіх і расійскіх вучоных у галіне мовазнаўства і гісторыі. Таму і асноўныя палажэнні і высновы ўвогуле памылковыя. Адчуваецца, што артыкул напісаны пад уражаннем удзелу прафесара Я. Неміроўскага ў рабоце Міжнароднага кангрэса ўкраіністаў у Львове восенню 1993 г., але чамусьці надрукаваны ў канцы 1994 г. Артыкул накіраваны супраць "украінскіх нацыяналістаў", але дасталося і беларусам. Асабліва не спадабаліся прафесару Я. Неміроўскаму выступы "ўкраінскіх нацыяналістаў" у секцыі кангрэса "Аднаўленне яўрэйскага нацыянальнага жыцця на Украіне", хаця, з нашага пункту гледжання, стварэнне такой секцыі на Міжнародным кангрэсе ўкраіністаў шмат аб чым сведчыць.

Паважаны маскоўскі прафесар параўноўвае лічбы выданняў кніг і газет на ўкраінскай і беларускай мовах у 1910—1913 гг. і ў 1990 г. з яўрэйскімі выданнямі (з кнігі польскага гісторыка Я. Кушлейкі "Польская кніга ў Расіі", 1993) і робіць на гэтым свае высновы, якім надае навуковы характар.

Якія гэта высновы? Я. Неміроўскі лічыць, што славутая русіфікацыя ў нас не адбывалася ў савецкі час. У 1990 г. 81,7% кніг на Беларусі выдавалася на рускай мове і толькі 15,3% на беларускай, а вось у Грузіі кніг выдавалася на нацыянальнай мове — 70,5%, у Азербайджане — 68,5%, у Эстоніі — 66,3%. "А значыць, прычыны адставання нацыянальнага кнігавыдання на Украіне і ў Беларусі трэба шукаць не ў прымусовай русіфікацыі, а ў чымсьці іншым", — піша Я. Неміроўскі.

Наадварот, піша аўтар артыкула, у гады савецкай улады ўкраінская і беларуская культуры расцвілі, дзякуючы праграмам украінізацыі і беларусізацыі. Так што, маўляў, няма чаго прад'яўляць бальшавікам прэтэнзіі і з нагоды знішчэння нацыянальнай культуры. Але Я. Неміроўскі не гаворыць пра генацыд, пра амаль поўнае фізічнае вынішчэнне навукоўцаў, пісьменнікаў, нацыянальнай інтэлігенцыі, ліквідацыю нацыянальнай школы і гвалтоўнае выгнанне нацыянальнай мовы з ужытку ў афіцыйных установах.

Больш таго! З пункту гледжання абрусеўшага маскоўскага сноба паважаны прафесар папікае беларусаў у тым, што яны не пакарысталіся свабодай у царскай Расіі пасля рэвалюцыі 1905 г. Маўляў, беларусы і не імкнуліся да кнігавыдання на роднай мове. У 1910 г., піша Я. Неміроўскі, было толькі 14 выданняў на беларускай мове, а газет — аніводнай (Я. Неміроўскі нібы нічога не чуў пра "Нашу Ніву"). А вось у яўрэяў на мове іўрыт і ідыш было выпушчана ажно 903 кнігі і 51 газета. Але доктар гістарычных навук Я. Неміроўскі проста не ведае, што беларуская мова была зусім забаронена ў царскай Расіі да 1905 г., а яўрэйская не толькі дазволена, але і падтрымлівалася царскімі ўладамі: у краіне існавалі дзяржаўныя яўрэйскія вучылішчы, дзе ўсё навучанне вялося на роднай мове. Прафесар Я. Неміроўскі піша, што царская Расія не была "турмой народаў".

Усё згаданае маскоўскім прафесарам дае яму магчымасць прыйсці да высновы, што пасля далучэння да Расіі, хоць русіфікацыя і была, але самі беларусы (і ўкраінцы) добраахвотна дамагаліся моўнай асіміляцыі, "нягледзячы на гераічныя намаганні перадавой нацыянальнай інтэлігенцыі захаваць" родную мову (і за гэта хоць дзякуй!). Ён падмацоўвае гэтую "добраахвотнасць" тым, што калісьці, з яго пункту гледжання, тут у XVI ст. была "агульная для ўкраінцаў і беларусаў мова" — "руская". Ніяк не можа прызнаць аўтар існаванне тады беларускай мовы.

У Я. Неміроўскага ніяк не паварочваецца язык назваць Беларусь і Украіну незалежнымі дзяржавамі. Для яго гэта — "былыя саюзныя рэспублікі".

Адсюль галоўны тэзіс прафесара Я. Неміроўскага: "Шлях білінгвізму, двухмоўя, застаецца ў былых саюзных рэспубліках адзіна рэальным шляхам, хочуць гэтага або не адэпты нацыянальнай мовы". Аказваецца, гэты шлях дапаможа рускамоўнаму беларускаму кнігавыданню заваяваць расійскі кніжны рынак, а беларускім пісьменнікам — сусветную вядомасць і выйсці з правінцыяльнасці.

Заканчваюцца павучэнні нам маскоўскага прафесара прапановай ісці шляхам адэскай цёці Соні, унукі якой будуць гаварыць і чытаць у Амерыцы па-англійску, у Ізраілі — на іўрыце, а ў Маскве — па-руску.

Што можна адказаць Я. Неміроўскаму? Няведанне беларускай гісторыі ўвогуле (за выключэннем кніжнай справы XVI ст., дзе прафесар — адзін з вышэйшых аўтарытэтаў), пагардлівыя адносіны да нацыянальных рухаў, заклікі да асіміляцыі праз білінгвізм, непрызнанне незалежнасці новых дзяржаў, якія стварыліся пасля распаду СССР, непрытоеная настальгія па Расійскай імперыі і Савецкім Саюзе — гэта быццам бы асабістыя погляды і асабістая справа пана прафесара. Але калі ён прапагандуе гэта ўсё ў агульнарасійскай газеце, то справа набывае не толькі публіцыстычны, але і палітычны характар. І таму доктар гістарычных навук Яўген Львовіч Неміроўскі свядома становіцца ў адны шэрагі з расійскімі жырыноўцамі, баркашоўцамі, шавіністамі і іншымі прыхільнікамі былой імперыі, а таксама далучаецца да ўсіх антыбеларускіх сіл і на Беларусі.

Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ,
доктар гістарычных навук, прафесар

Надзённае

ПАД ШЫРМАЙ РЭСТАЎРАЦЫІ

АДКРЫТЫ ЛІСТ СТАРШЫНІ МІНГАРВЫКАНКАМА СП. У. ЯРМОШЫНУ

Пытанне пра захаванне апошніх сапраўдных помнікаў нашай гісторыі і культуры, што засталіся ў Верхнім горадзе — гістарычным цэнтры Мінска, патрабуе самай пільнай увагі грамадства і асабліва службовых асоб. Заказчыкам усіх работ і адпаведна адказнымі за ўсё, што там адбываецца, з'яўляецца акцыянернае таварыства "Стары Менск". Практычна на ўсіх помніках, на якіх мусяць праводзіцца рэстаўрацыйныя працы, парушаюцца элементарныя метадыкі ў гэтай галіне. А ў большасці выпадкаў пад шырмай рэстаўрацыі будынкі 18—19-га ст. цалкам знішчаюцца (па вул. Інтэрнацыянальнай N 21/3, 25, 27: 33а, Герцэна 2а, 4, 6, 8 і па Музычным завулку 1).

На сённяшні дзень у Верхнім горадзе захаваўся толькі адзін помнік канца XVIII стагоддзя — жылы дом N 31 па вул. Інтэрнацыянальнай, дзе цалкам захавалася аўтэнтычнасць канструкцый. Рэалізацыя праектна-каштарыснай дакументацыі па яго рэканструкцыі і прыстасаванні пад філію бібліятэкі прывядзе да страты каштоўнага помніка, як гэта адбылося з іншымі будынкамі Верхняга горада.

Акрамя таго, ёсць звесткі, што ў двары кляштара базыльянак плануецца ўзвядзенне буйнога сучаснага комплексу з падземнымі гаражамі. Гэта супярэчыць першапачатковай канцэпцыі рэгенерацыі Верхняга горада і прывядзе да значных страт, знішчэння культурнага слоя.

Да гэтага часу не праведзена кансервацыя рэшткаў муроў і часткі роспісаў разбуранага летась дома N 2 па вул. Герцэна.

Просім звярнуць увагу на парушэнні заканадаўства і навуковых методык рэстаўрацыі Верхняга горада і прыняць неабходныя меры дзеля выратавання помнікаў старога Мінска. На наш погляд, тут павінен быць рашучы падыход з боку гарадскіх уладаў каб спыніць знішчэнне Верхняга горада як комплекснага помніка архітэктуры, горадабудаўніцтва і археалогіі, каб прыцягнуць да адказнасці чыноўнікаў, якія спрыялі гэтаму.

Трэба тэрмінова правесці кансервацыю муроў, якія цудам захаваліся, а таксама рэшткаў жывапісу 18—19 стагоддзяў (дом N 2 па вул. Герцэна).

Неабходна распрацаваць навукова абгрунтаваны праект рэстаўрацыі дома N 31 па вул. Інтэрнацыянальнай, які б прадугледжваў поўнае захаванне і кансервацыю ўсіх яго гістарычных канструкцый, а пасля гэтага вырашаць пытанне пра яго рэстаўрацыю і далейшае выкарыстанне.

На нашу думку, нельга праектаваць і ўзводзіць ніякіх падземных ці наземных сучасных пабудоў у Верхнім горадзе.

Мы просім правесці грамадскае абмеркаванне праектаў рэканструкцыі Верхняга горада і фактаў парушэння заканадаўства па ахове помнікаў у гістарычным цэнтры Мінска з удзелам дзяржаўных структур, грамадскіх устаноў, творчых саюзаў і ўсіх зацікаўленых асоб.

Мікола КУПАВА,
старшыня Камісіі па культуры Беларускага народнага фронту "Адраджэнне"

А, БАЧ, ЖЫВУЦЬ...

— А, бач, жывуць. І чорт іх не бярэ!
А гэты, бачыш, нават і смяецца...
Хоць "мінімалка" —
трыццаць тысяч "рэ", —
Па яйку ў дзень.
На хлеб не застаецца.

Людзей ператварылі ў жабракоў.
Для многіх і буханка ўжо —
раскоша.
Дзе ўзяць бабульцы
(семдзесят гадкоў!)
Наш в а ш паганы
спажывецкі кошык?

Жывём. Але без веры, без надзей.
Канае белы дзень пад чорнай сажай.
На яйка ў дзень
ды пасадзіць "вождей" —
Праз месяц і сваё мо
што засмажаць...

Аляксей БЕЛЫ

г. Баранавічы

Адгалоскі

ЗАБЛЫТАНЫЯ КАРАНІ

ЯШЧЭ ПРА БЕЛАРУСКУЮ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ІДЭЮ

Пэўна, шмат каго зацікавіў артыкул беластоцкага беларуса Алега Латышонка "Беларуская нацыянальная ідэя" ("Свіцязь. Гістарычна-культурны часопіс Гарадзеншчыны". 1994. N 2). Спроба паставіць праблему, якая раней — па вядомых прычынах — не распрацоўвалася, заслугоўвае ўвагі, але яе вырашэнне А. Латышонкам, на нашу думку, вельмі супярэчлівае ды не зусім адпавядае гістарычным фактам.

Перш-наперш нельга назваць слушным імкненне даследчыка звязаць станаўленне беларускай нацыянальнай ідэі з першымі згадкамі Alba Russii ў пэўных іншамоўных крыніцах. Аніводзін усходнеславянскі летапіс XI—XVII стагоддзяў не ведае тэрміна "Белая Русь", дык зусім неверагодна, каб існаваў ён у мове жыхароў Полаччыны ці Магілёўшчыны як саманазва. Alba Russiu з "Апісання земляў" (Дублінскі рукапіс) толькі з вялікімі намаганнямі можна дастасаваць да тэрыторыі сучаснай Беларусі. Даволі дзіўным здаецца той факт, што месіянер Вайслан сустрэўся тут ... з карэлам. Больш праўдападобна, што Alba Russia знаходзілася на поўначы Расіі (белая ад снегу?), паблізу ад карэльскіх земляў. Дарэчы, апісваючы землі, аўтар нічога не кажа пра размяшчэнне Alba Russii, хоць даволі дакладна падае становішча Літвы, Русі ды іншых, нават дробных краін. Неймаверна, але не карыстаўся, а значыць не ведаў тэрміна "Белая Русь" Францыск Скарына — палачанін, патрыёт свайго краю. Усё гэта наводзіць на думку, што толькі напрыканцы XVII—XVIII стагоддзяў гэтае найменне замацавалася за жыхарамі Віцебшчыны і Магілёўшчыны. І няма падстаў гаварыць пра "Белую Русь" як пра саманазву: тэрмінам у XIII—XVII стагоддзях карысталіся ці не выключна іншаземцы. Чаму? Пытанне застаецца адкрытым. Саманазва ж нашых продкаў у эпоху Сярэднявечча — літва, літвіны альбо русь, русіны. Калі будзе абгрунтавана даведзена, што літва — славянскае племя, дык усё стане на свае месцы, стане зразумелым, чаму найменне "русь" за параўнальна кароткі перыяд дастасавалася да аграмаднае прасторы. На нашу думку, звязана гэта з пашырэннем хрысціянства ўсходняга абраду сярод усходніх славян, у большай альбо меншай ступені залежных ад Кіева. Тыя літвіны, што прынялі хрысціянства, сталі называцца руссю, іншыя — захавалі сваё ранейшае найменне. Утворанае на славянскіх землях у XIII стагоддзі Вялікае княства Літоўскае толькі тады назвалася Рускім, калі ў ягоны склад увайшлі Кіеўскія землі — першапачатковая Русь. А вось рускім называецца насельніцтва не толькі Кіеўшчыны, але і праваслаўныя іншых частак Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Такім чынам, дзякуючы царкве, канфесіёнім "русь", у хуткім часе ператварыўся ў этнонім.

Найменні "Белая Русь", "беларускі", "беларусец" у адносінах да нашых земляў з'яўляюцца толькі напрыканцы XVII стагоддзя ў часе войнаў Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай. Відаць, менавіта ад маскоўцаў зыходзіла ініцыятыва назваць насельнікаў сумежнага гаспадарства (тых, хто вызнаваў рускую (праваслаўную) веру) беларусцамі. Пэўныя адрозненні (мова, лад жыцця ды іншае) не дазвалялі Маскве называць праваслаўных літвінаў гэтак жа, як і насельнікаў уласнае дзяржавы. Таму выкарыстанне тэрміна "беларусы" было надзвычай удалым: гэта давала Расіі мажлівасць пераканаўча абгрунтоўваць сваю захопніцкую палітыку.

У 1686 годзе Масковія і Рэч Паспалітая падпісалі Грымултоўскі трактат, паводле якога кіеўскі мітрапаліт (Кіеў з 1654 года ў складзе Расіі) станавіўся на чале праваслаўнай царквы Вялікага княства Літоўскага. Магілёўскі епіскап пачынае афіцыйна называцца беларускім. Саперніцтва цэркваў паспрыяла таму, што ў хуткім часе і каталіцкія іерархі ўсходніх рэгіёнаў называюцца беларускімі. Жорсткая рэлігійная барацьба, ганенні на праваслаўных, каталізацыйная палітыка езуітаў і польскага касцёла — усё гэта прымусіла "беларусцаў" шукаць дапамогі. Праваслаўныя іерархі (Іеранім Ваўчанскі, Георг Каніскі, Мельхіседэк Яворскі, Феафан Леантовіч) пачынаюць усё часцей і часцей звяртацца да Масковіі. Яны дамагліся, што ў Варшаве пры расійскім паслу знаходзіўся спецыяльны камісар, якому праваслаўныя дасылалі скаргі пра ганенні. Часам гэтыя скаргі накіроўваліся непасрэдна да цара. Найбольш яскравы прыклад — чалабітная Г. Каніскага на імя Кацярыны II, дзе магілёўскі епіскап настойліва раіць імператрыцы даслаць каралю Рэчы Паспалітай ультыматыўную грамату, як зрабіў гэта ў 1722 годзе Пётр I.

Яшчэ больш катэгарычнай была запіска Ф. Леантовіча ад 24 лістапада 1762 года, у якой ён адказваў на запыт "какая политическая польза может последовать Российскому нашему государству по случаю защищения грекороссийских наших в польском государстве исповедников" наступным чынам: "Российскому нашему государству можно будет на 600 верст самой лучшей и плодороднейшей земли, с бесчисленным православным народом, пред всем светом праведно и правильно у поляков отобрать". (В. Ключэўскі ў "Курсе русской истории" падаў гэты факт, як нібыта сказанае адным з ігуменаў у часе каранацыі Кацярыны II.)

Праваслаўныя іерархі абаранялі сваю веру і толькі веру. Сцвярджэнне А. Латышонка, што ў XVIII стагоддзі "адзіным ідэйным барацьбітом за беларушчыну быў беларускі праваслаўны епіскап Каніскі", не зусім карэктнае. Кацярына II (з дапамогаю Г. Каніскага) гуляла беларускаю картаю, вядома, не дзеля таго, каб інспіраваць беларускую думку, беларускае пытанне, беларускую аўтаномію. Як пакажа разгортванне падзей, гэта карта сталася часовым інструментам у руках царызму: лічаныя гады губерні называліся беларускімі, а пасля гэты тэрмін Мікалай I увогуле забараніў.

Але справа была зроблена. Узнікла база дзеля станаўлення беларускай нацыянальнай ідэі.

Тут варта зазначыць, што беларускі, вобразна кажучы, сцяг напрыканцы XVIII стагоддзя перахапілі ў праваслаўных езуіты, каб аддзячыць Кацярыне II за дазвол ордэну працягваць дзейнасць на тэрыторыі Расійскай імперыі. Езуіты пачалі называцца беларускімі, пачалі называць сваіх студэнтаў і шкаляроў беларусамі. А з тае прычыны, што уніяцкія святары навучаліся ў езуітаў, дык і Уніяцкая царква спрычынілася да пашырэння беларускай самасвядомасці сярод насельнікаў былога Вялікага княства Літоўскага.

У той час на тэрыторыі сучаснай Беларусі існаваў грунт дзеля ўзнікнення шэрагу нацыянальных рухаў. Лепш за ўсё пачуваліся літвіны. Іхняя "партыя" была наймацнейшай. Праўда, рымская легенда, што ляжала ў аснове літвінскага міфа, скіравала іхнюю дзейнасць у жамойцкі бок: узнікае тэзіс пра жамойцкую мову як родную мову старажытных літвінаў. Ідэолагі літвінскага руху імкнуцца давесці сваё неславянскае паходжанне: гэта, на іх думку, павінна абгрунтаваць беспадстаўнасць русіфікацыі літвінаў. (Нічога супраць русіфікацыі беларусаў яны не мелі). Дзякуючы Т. Нарбуту, узнікае цэласная канцэпцыя літвінскай гісторыі.

Нешматлікай, але надзвычай моцнай на Беларусі была "польская партыя". Яна мела ўплыў на літвінскую "партыю", імкнулася давесці, што ў тагачасных умовах барацьба з Масквою павінна ісці пад рэчыпаспалітаўскім (польскім) сцягам. З тае прычыны, што польская мова і касцёл лучылі літвінаў з палякамі, літвінскі рух не мог адасобіцца ад польскага.

Беларускі рух сваё станаўленне пачаў толькі ў трыццатыя гады XIX стагоддзя. Нейкі час ягоная дзейнасць ішла ў рэчышчы агульнага рэчыпаспалітаўскага руху. Яно й нядзіўна! Беларусы — выхаванцы езуітаў — яшчэ добра памяталі пра сувязі, якія лучылі іх з іншымі насельнікамі Вялікага княства Літоўскага. Крыху пазней, калі выхаваннем беларусаў занялася расійская школа, беларускі рух раздзяліўся на дзве плыні: адна з іх паранейшаму гарнулася да літвінскага ды рэчыпаспалітаўскага руху, другая стала на прарасійскія пазіцыі.

Зрэшты, у другой палове XIX стагоддзя гэтая прарасійская плынь беларускага руху перастае быць беларускай, гэтая плынь хутка прыйшла да "западноруссизма". Яе прадстаўнікі становяцца "истинно русскими людьми", што, трэба сказаць, і было пажаданым ды лагічным завяршэннем гульні царызму з "беларускаю картаю".

Аднак, як мы ўжо сказалі, беларускі рух складаўся з дзвюх плыняў. І калі адна з іх, прарасійская плынь, вяла рух да згубы, дык іншая здолела вылучыць са свайго асяроддзя прадстаўнікоў, што сфармавалі беларускую нацыянальную ідэю.

Першыя праявы беларускага руху заўважаюцца ў літаратурнай працы Каятана Касовіча, які ў 1835 годзе ў газеце "Молва" (NN 21 і 50) пісаў пра беларускія народныя песні.

Больш паспяховай беларускай працай трэба лічыць літаратурную і грамадскую дзейнасць братоў Грымалоўскіх — Валяр'яна, Клеменса, Юльяна. Менавіта яны ўпершыню ў гісторыі беларускага прыгожага пісьменства ў тытуле выдадзенага ў Пецярбурзе ў 1837 годзе польскамоўнага трохтомніка сказалі пра сваю нацыянальную прыналежнасць: "Вершаваныя творы трох братоў, Валяр'яна, Клеменса, Юльяна Грымалоўскіх, беларусаў". Замілаванне да беларускага фальклору, да звычаяў народа прыводзіць Грымалоўскіх да думкі пра неабходнасць творчасці на мове свайго народа. Мажліва, яны не былі першымі, хто разважаў над гэтым пытаннем, але ўпершыню ў пісьмовых крыніцах зафіксавана менавіта іхняе свядомае стаўленне да літаратурнай працы на беларускай мове. Вядомы тагачасны паэт Аляксандр Гроза ў лісце крытыку і пісьменніку Міхалу Грабоўскага ад 16 чэрвеня 1841 года пісаў: "Браты Грымалоўскія хочуць свой беларускі дыялект вывесці з усеагульнага забыцця. (...) Заахвочваю — як магу — гэтых найлепшага жадання маладых людзей. Я не так даўно пісаў да аднаго з іх, выказваючы яму, якая яго чакае слава, калі пакладзе кутні камень новай, славянскага роду літаратуры". І хоць беларускамоўных твораў братоў Грымалоўскіх мы сёння не ведаем, аднак лісты Яна Баршчэўскага да Юлі Корсак-Шапялевіч сведчаць, што на пачатку 40-х гадоў XIX стагоддзя Грымалоўскія знаходзіліся ў цэнтры літаратурна-грамадскага жыцця Беларусі.

Але найбольш плённай у распрацоўцы беларускай нацыянальнай ідэі была літаратурная і грамадская дзейнасць Яна Баршчэўскага. Сучаснікі сведчаць пра палымяны з юначых гадоў беларускі патрыятызм засцянковага шляхціца з Полаччыны. (Уніяцкі, а пазней праваслаўны епіскап Антоні Зубко ў часопісе "Русский вестник", т. 53 за 1864 год гаворыць, што Я. Баршчэўскі, яго далёкі сваяк, быў сынам уніяцкага святара з вёскі Мурагі, аднак хаваў сваё паходжанне). У часе вучобы ў Полацкай езуіцкай Акадэміі і гувернёрства на Беларусі ён пісаў літаратурныя творы на беларускай мове. Мова твораў вызначалася асяроддзем, дзеля якога яны пісаліся. Пераезд Я. Баршчэўскага ў Пецярбург, уплыў А. Міцкевіча, польскамоўных рамантыкаў прадвызначылі зварот паэта да творчасці на польскай мове. Але жыццё ў Пецярбурзе пазбавіла яго ад уплыву польскай ідэалогіі. Кола яго знаёмых абмяжоўваецца выхадцамі з Беларусі, патрыятызм якіх насіў беларускі характар. Добрае веданне Беларусі, яе народа, традыцый і гісторыі вылучае Я. Баршчэўскага ў асяроддзі пецярбургскіх беларусаў. Ён карыстаецца павагаю землякоў.

Знаёмства з Т. Шаўчэнкам падштурхнула паэта да выкарыстання ў сваёй творчасці (дасюль рэлігійна-сентыментальнай) беларускіх легенд і паданняў. Так узнікаюць балады "Русалка-зводніца", "Дзявочая крыніца", "Дзве бярозы", "Зарослае возера". Вядома, і да знаёмства з Кабзаром Я. Баршчэўскі любіў і ведаў свой край (таму ён і зацікавіў Вялікага Украінца), але цяпер узнікае жаданне служыць Бацькаўшчыне, аддаючы ёй свае веды. Менавіта цяпер ён згаджаецца стаць выдаўцом-рэдактарам альманаха "Незабудка", разумеючы, што нават такое малое выданне можа зрабіць шмат дзеля абуджэння літаратурна-грамадскай думкі на Беларусі.

З'яўленне ў "Незабудцы" балад Я. Баршчэўскага прыцягнула да іх увагу крытыкі: паэту раяць (М. Грабоўскі, Л. Штырмер, Р. Падбярэскі) перадаць змест балад прозаю. Так узнікае думка напісаць твор пра Беларусь, каб расказаць пра гэты малавядомы, але самабытны край свету і землякам. Можа, у першую чаргу землякам. Але Я. Баршчэўскі адмовіўся ад простай перадачы сродкамі польскай мовы беларускіх легенд і паданняў; ён не збіраўся дагаджаць польскай крытыцы, якая чакала ад яго напаўфальклорных зборнікаў. Ягоны "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" — гэта гімн роднай Беларусі, гэта сцвярджэнне яе самабытнасці, рэгіянальнай адасобленасці. Беларусь — гэта фантазія, гэта утопія, гэта мара. Пісьменнік спрабуе даць геаграфічнае апісанне краю, ягонай гісторыі, эканамічнага стану. З дапамогай сістэмы вобразных сродкаў Я. Баршчэўскі выказвае беларускую нацыянальную ідэю. (Пра гэта больш падрабязна гл. у нашым артыкуле "Ля вытокаў беларускае нацыянальнае ідэі". ("Полымя", 1994, N 11).

Беларускі нацыянальны рух 40-х гадоў XIX стагоддзя не здолеў цалкам сфармавацца і адасобіцца, але патрыятычныя памкненні нацыянальна свядомых прадстаўнікоў беларускага грамадства якраз і знайшлі сваё выяўленне ў выказанай Я. Баршчэўскім беларускай нацыянальнай ідэі. Гісторыка, як Т. Нарбут у літвінаў, беларусы ў той час не вылучылі са свайго асяроддзя, дык жывілі нацыянальную ідэю толькі літаратура ды фальклярыстыка. Асабліва значнымі былі працы А. Рыпінскага ("Беларусь"), І. Храпавіцкага ("Погляд на паэзію беларускага люду"), Р. Падбярэскага ("Беларусь і Ян Баршчэўскі" ды "Лісты пра Беларусь"), літаратурныя творы А. Грот-Спасоўскага, Т. Лады-Заблоцкага ды інш. Усё гэта стварала аўру вакол беларускай нацыянальнай ідэі.

Магутны зарад нацыянальнай энергіі, што несла кніга Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня", так ці інакш уздзейнічаў на беларусаў, абуджаючы іхнюю нацыянальную свядомасць. Непасрэдным прадаўжальнікам працы Я. Баршчэўскага ў 50—60-я гады XIX стагоддзя стаўся віцяблянін Арцём Вярыга-Дарэўскі. Ягоная літаратурна-грамадская праца прывабіла да беларускай справы нават асобных прадстаўнікоў літвінскага руху (В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, В. Каратынскі).

У сярэдзіне XIX стагоддзя беларуская нацыянальная ідэя спакваля працягвала сваё станаўленне, яна ўцягвала ў арбіту свайго ўздзеяння ўсё больш шырокія грамадскія колы з заходніх правінцый Расійскай імперыі. Вынішчэнне М. Мураўёвым у 1863—1864 гадах літаральна ўсяе апазіцыі да царызму на нейкі час запаволіла развіццё беларушчыны, але ўжо напрыканцы 80-х гадоў XIX стагоддзя ідэя Я. Баршчэўскага і ягоных наступнікаў знаходзіць сваіх новых прыхільнікаў. Паказальна, што сярод першых быў Карусь Каганец, сын высланага (мажліва, разам з А. Вярыгам-Дарэўскім) у Сібір паўстанца 1863 года.

Такім нам бачыцца шлях развіцця беларускай нацыянальнай ідэі ў XVIII—XIX стагоддзях. "Прывязванне" гэтага працэсу А. Латышонкам да Беласточчыны, на нашу думку, не можа лічыцца аб'ектыўным. Усе вядомыя сёння дакументы пярэчаць таму, што М. Бабровскі стаяў ля вытокаў беларускай нацыянальнай ідэі. М. Бабровскі і ягоныя аднадумцы ніколі не карысталіся тэрмінам "беларускі". Яны называлі сябе русінамі альбо рускімі ці нават літвінамі (напрыклад, І. Даніловіч называў мову Супрасльскага летапісу літвінскаю). Іх перш за ўсё хваляваў стан Уніяцкае царквы, якую ў часы Аляксандра I католікі ледзь не "ўз'ядналі" (асабліва ў заходніх раёнах Беларусі) з рыма-каталіцкім касцёлам. (Раім пазнаёміцца з фондам 824 у ЦДГА С.-Пецярбурга.)

Не можам пагадзіцца мы і са сцвярджэннем, што "ў другой палове XIX стагоддзя завяршаецца стварэнне беларусамі ўласнае гісторыі (Гурыновіч) і ўласнага этнагенетычнага міфа пра крывіцка-полацкія карані беларускае нацыі", бо гэты міф узнік якраз у 30-я гады XIX стагоддзя (гл.: І. Храпавіцкі, "Погляд на паэзію беларускага люду", прадмовы Я. Чачота да зборнікаў "Вясковыя песенькі").

Зусім не кампетэнтнымі атрымаліся развагі шаноўнага гісторыка пра праблемы беларускай літаратуры XIX стагоддзя. А. Латышонак цалкам адмаўляе існаванне ў ёй "праяў беларускай нацыянальнай ідэі". Нават у творах Ф. Багушэвіча, А В. Дуніна-Марцінкевіча аўтар артыкула ўвогуле лічыць паланізатарам: "утрымоўваў польскую школу". І гэта той, хто назваў адну са сваіх кніжак "Беларускі Дудар", паланізатар? А хіба няма "праяў беларускай нацыянальнай ідэі" ў ягоных "Літаратурных клопатах"? Творы В. Дуніна-Марцінкевіча, напісаныя дзеля адукацыі ды выхавання цёмнага вясковага люду, не маглі мець "праяў нацыянальнай ідэі", бо сталіся б незразумелымі (згадайма: "вы, дзетачкі, гэтага не паймёце"!) чытачу. Тое ж можна сказаць і пра большасць твораў Ф. Багушэвіча: толькі прадмовы і асобныя вершы ("Хмаркі") у даступнай форме неслі гэтую ідэю. Зусім іншая справа, калі літаратар звяртаўся да адукаванага чытача на польскай

(Працяг на стар. 12)

ШМАТ ІМЁНАЎ, ШМАТ ТВОРАЎ

І ў апошняй за мінулы год кніжцы часопіса "Першацвет". Дванаццаты нумар — гэта вершы Н. Русіян, А. Гурскага, В. Барысюка, В. Корбута, Л. Барадзейкі, Н. Раманенкі, А. Дуброўскага, В. Худаўца, Н. Насульскай. Старонкі прозы прадстаўлены творамі З. Вішнёва, Л. Рублеўскай, М. Канановіча, І. Хадарэнкі, В. Чаркоўскай, С. Мандрыка.

У раздзеле "Гасцёўня" з апавяданнямі выступае А. Кірвель, з вершамі — І. Карэнда. З паэтам складанага лёсу В. Губарэвічам знаёміць у раздзеле "Повязь" С. Чыгрын. Тут жа апублікаваны некалькі твораў гэтага аўтара.

М. Тычына асэнсоўвае творчы шлях У. Рубанава ("Пішацца — як ніколі"). В. Уласевіч рэцэнзуе кнігу М. Лукшы "Выспа" ("Выспа трагедый і выратаванняў"). Чытацкай увазе прапануецца крытычнае эсэ Я. Крыцкага "Па законе інерцыі". У "Жароўні" — гумарэска У. Цішурова "Каліст рат". "Першацвет" прадстаўляе мастака К. Шапашнікаву.

КАМЕНЬ ФІЛАМАТАЎ

Непадалёк ад вёскі Каргова, што пад Баранавічамі, ёсць унікальны валун (на здымку). У народзе яго называюць "Вялікі камень" або "Камень філаматаў". У мінулым стагоддзі каля гэтага каменя бывалі Тамаш Зан, Ігнат Дамейка, Ян Чачот, Адам Міцкевіч і іншыя пісьменнікі, паэты, асветнікі Беларусі. Унікальны валун навяваў свежыя думкі, жывіў творчасць.

Фота Эдуарда КАБЯКА, БЕЛІНФАРМ

НАШ РЫГОРКА — У ПЯТРУШКІ

Берасцейскі тэатр лялек меў гонар прадстаўляць Беларусь на Міжнародным свяце "У Пятрушкі", якое адбывалася ў Маскве ў Цэнтральным акадэмічным тэатры лялек імя С. Абразцова. У госці да расійцаў завіталі калектывы лялечнікаў з Украіны, Польшчы, Італіі, Швейцарыі. Свае спектаклі, большай часткай каляднай тэматыкі, рэпрэзентавалі тэатры лялек з розных куткоў самой Расіі. А берасцейцы паказалі на свяце адну са сваіх лепшых работ — спектакль "Рыгорка — ясная зорка" па п'есе А. Вярцінскага ў пастаноўцы Алега Жугжды. У выкананні Тамары Тэвасян, Івана Герасевіча, Уладзіміра Зайцава ды Юры Цеслі наш Рыгорка быў сустрэты маскоўскім Пятрушкам досыць прыхільна і ці то па-братэрску, ці то па-суседску цёпла.

РОЗНЫЯ ЖАРТЫ, БЛЮЗНЕРСТВЫ ДЫ ШТУКІ!

Рэальныя гістарычныя персанажы — берасцейскія скамарохі мінулага стагоддзя Ціт, Гарман і Гарасім — будуць дзейнічаць у новай пастаноўцы "Штукары" Берасцейскага тэатра лялек, прэм'ера якой падмеркавана да трэцяга Міжнароднага фестывалю тэатраў лялек. Увасабляць на сцэне п'есу Ігара Сідарука, у аснову якой пакладзеныя мясцовыя легенды ды паданні (іх якраз і распавядаюць скамарохі-штукары), узяліся адразу два рэжысёры — Сяргей Палешчанкаў ды Зміцер Нуянзін. Арыгінальную сцэнаграфію ды лялькі, імітаваныя пад дрэва, салому і гліну, прапанаваў тэатру мастак Валеры Рачкоўскі. А ці зажывуць на берасцейскай сцэне сапраўдным жыццём "Штукары" — будзе вядома вясною.

І. Х.

У апошнія гады акадэмічныя мовазнаўцы сталі часта выступаць на старонках газет, знаёміць грамадскасць з працай і планамі Інстытута мовазнаўства АН Беларусі. І гэта вельмі добра. Мы павінны ведаць, якія захады робяць навукоўцы, адгукаючыся на голас часу, каб наша літаратурная мова належным чынам выконвала свае функцыі.

Алесь КАЎРУС

ДЫК ДЗЕ "ХАОС"?

Неяк "Наша слова" (5. 10. 94) змясціла гутарку з дырэктарам Інстытута мовазнаўства А. Падлужным. Кіраўнік акадэмічнай установы паведамляе, у прыватнасці, пра падрыхтоўку навуковай граматыкі. Яна задумана як больш даступная за папярэднюю (1962 г.), дзе "вельмі падрабязна пададзена варыянтнасць усіх зменных слоў", і не будзе даваць "асабліва строгіх рэкамендацый". Такі падыход уяўляецца рацыянальным. Бо хто ж наважыцца адразу і беспамылкова вызначыць з некалькіх варыянтаў самы прыдатны, а вызначыўшы адзін, адкінуць астатнія?

Хочацца думаць: лінгвісты зафіксуюць літаратурныя нормы з улікам нацыянальнай спецыфікі мовы, якая ў цяперашнім "хаосе" (улюбёнае вызначэнне акадэмічных навукоўцаў) акурат і пачынае найпаўней узнаўляцца. На жаль, сапраўдныя намеры мовазнаўцаў недзе між радкоў. Такі ўжо іх стыль. Дырэктар інстытута распавядае: "Цяпер з'явілася некалькі работ, дзе прыводзіцца статыстыка не толькі тых форм, якія ўжываюцца ў літаратуры пасля 1933 года, але ўжываліся і да 1933 года. У кніжку ўключаецца таксама важны даведачны матэрыял (? — **А. К.**) для кожнага, хто карыстаецца беларускай мовай, і, безумоўна, будзе нейкая арыентацыя пры падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы школьных падручнікаў".

Можа, гэтыя "статыстыка" і "даведачны матэрыял" паслужаць на карысць беларускай мове. Але вось чамусьці ў сваім расповядзе акадэмік дэманструе невясёлую статыстыку: дзесяць разоў ужывае слова *работа* і толькі двойчы бясспрэчна нарматыўнае — *праца*. На рускі ўзор ён будуе фразу: "Мы перабралі дзесяткі варыянтаў **па кожнаму пункту правіл...**" А быў жа час, калі А. Падлужны ў сваіх навуковых **працах** ужываў прыназоўнік па ў адпаведнасці з беларускай граматыкай — з месным склонам: "класіфікацыя зычных **па спосабу і месцы** артыкуляцыі" (А. І. Падлужны, В. М. Чэкман. Гукі беларускай мовы. Мн., 1973).

Няшмат прасвятляе навуковую пазіцыю аўтараў новай граматыкі і крыху ранейшая інфармацыя А. Падлужнага (гл. "Навіны Акадэміі навук Беларусі" за 9.09.94): яна (новая граматыка) "не апісальнага тыпу ўсіх магчымых граматычных нормаў і правіл, а **найбольш распаўсюджаных і зручных** для ўжывання" (падкрэслена мною. — **А. К.**).

Такія крытэрыі вызначэння (выбару?) нормы небеззаганныя. Часам большую пашыранасць мае варыянт з тымі ці іншымі парушэннямі законаў беларускай мовы. Як прыклад згадаем словы *светасігнал, язычаства, абслугоўваючы* (прыметнік), што ўжываліся не адно дзесяцігоддзе ў літаратурнай мове, а потым выцесніліся словамі *святлосігнал, язычніцтва (паганства), абслуговы (абслугоўчы)*. А што значыць "зручны для ўжывання"? Тым, каму беларуская мова не родная, нязвыклая, зручнейшымі, відаць, будуць формы, агульныя з рускай мовай, напрыклад, формы назоўнікаў роднага склону множнага ліку з нулявым канчаткам: *пяць партызан, сучасных норм, новых кафедр, істотных рыс, гэтых правіл, асабовых імён.*

Увогуле ж падстаў для панікі і страху няма, калі змена нормаў адбываецца натуральна, без валюнтарызму з боку кадыфікатараў. "Літаратурная мова, якой бы багатай і апрацаванай яна ні была, адзначаў акад. М. Бірыла, не мае раз назаўсёды замацаваных норм. У кожнай літаратурнай мове адбываецца паступовае (!) намнажэнне фактаў, моўных сродкаў, якія прыводзяць да пэўных змен, да эвалюцыі нормы, новага элемента ў развіцці мовы" (з прадмовы да "Слоўніка беларускай мовы", Мн., 1987).

Дык майма на ўвазе: нормы хутка (праз 10—20 гадоў) не змяняюцца. І калі сёння мовазнаўцы заяўляюць (гл. "Высновы" камісіі па ўдакладненні правапісу), што "існуе неабходнасць у выпрацоўцы арфаэпічных нормаў", то гэта не можа не насцярожваць.

Як вядома, нормы і правілы літаратурнага вымаўлення даволі грунтоўна распрацаваныя (даследаванні М. Бірылы, Ф. Янкоўскага, А. Падлужнага), яны знайшлі адлюстраванне ў "Слоўніку беларускай мовы" (1987) пад рэдакцыяй акад. М. Бірылы. Названы слоўнік з'яўляецца даведнікам па арфаграфіі, арфаэпіі, акцэнтуацыі і словазмяненні. У ім вырашаецца задача падаць узорнае літаратурнае вымаўленне па магчымасці найбольшай колькасці слоў. У прыватнасці, абазначана асіміляцыйная мяккасць зычных: *асьвістаць, зьява, асіньнік, касьсё, хлусьня, прысьпічыць, прызьбе.*

Што ж разумець тады пад выразам "выпрацоўка арфаэпічных нормаў"? Адыход ад прынятых і ўсталяваных у маўленчай практыцы правілаў? Падумаць так ёсць падставы. Не змаглі ж члены камісіі дасягнуць "адзінства... у адносінах ужывання мяккага знака на пісьме..." Выходзіць, не ўсе ў камісіі заклапочаныя тым, каб захаваць адметную рысу беларускай фанетыкі — асіміляцыйную мяккасць зычных гукаў.

А вось ужо адкрытая заява А. Падлужнага, што ў "Слоўніку беларускай мовы" (1987) пад рэдакцыяй М. Бірылы ёсць "нямала памылак" ("Наша слова" 5.10.94). Што гэта? Традыцыйная аддзяка вучня свайму настаўніку ці чыста-сардэчнае прызнанне ў шматлікіх недахопах і **сваёй** працы? Доктар філалагічных навук А. Падлужны ўваходзіў у склад рэдкалегіі слоўніка. Спатрэбілася стаць акадэмікам, каб заўважыць "нямала памылак" (на жаль, не канкрэтызуецца — якіх). А можа, тут зусім і не памылкі, калі іх ільга разгледзець толькі вокам акадэміка? Магла ж проста адбыцца эвалюцыя поглядаў вучонага.

У планах навукоўцаў — значна папоўніць "Нарматыўны слоўнік беларускай мовы" за кошт слоўнікаў 20-х гадоў і "Беларуска-расійскага (Вялікалітоўска-расійскага) слоўніка" Я. Станкевіча. І праўда, чаму б не скарыстаць гатовых лексікаграфічных прац, кожная з якіх, несумненна, мае свае вартасці. Скажам, слоўнік Я. Станкевіча грунтуецца не толькі на моўным матэрыяле сучаснай беларускай літаратуры, у тым ліку з твораў пісьменнікаў-эмігрантаў. Ягонай крыніцай сталіся таксама помнікі беларускага пісьменства, публікацыі і запісы народна-дыялектнай мовы, слоўнікі розных тыпаў, фальклорныя творы.

Калі намер акадэмічных мовазнаўцаў сур'ёзны, то найперш варта звярнуцца да тых матэрыялаў слоўніка Я. Станкевіча, якія адлюстроўваюць своеасаблівасць беларускай мовы, у прыватнасці, да падачы і характарыстыкі прыназоўнікаў. У гэтых адносінах слоўнік дае шмат каштоўнага. Чаму звяртаем увагу менавіта на прыназоўнікі? Гэтыя службовыя словы бяруць вялікі ўдзел у афармленні падпарадкавальных сувязяў слоў, у пабудове словазлучэнняў і сказаў, надаюць спецыфіку мове.

Апошнія дзесяцігоддзі назіралася тэндэнцыя да пашырэння канструкцый з прыназоўнікамі, агульных з рускай мовай, і звужэння ўжытку спрадвечных беларускіх словазлучэнняў і сказаў. Тут пэўную ролю адыгралі мовазнаўцы. У граматыках, слоўніках, даведніках статус літаратурных надаваўся ў першую чаргу тым сродкам, якія бліжэйшыя да "ўсесаюзнай" мовы. Адметнае, спецыфічнае часта атрымлівала пазнаку: "застарэлае", "дыялектнае" і г. д. Або зусім не паказвалася, як, напрыклад, канструкцыі, што ўжываюцца ў творах класіка беларускай літаратуры М. Гарэцкага: Тры [сыны] засталіся гаспадарыць, а самы маладзейшы, **на імя** Васіль, **з** панскага **загаду** прыстаў да немца-млынара ў навуку ("Сасна"). **З прыкладу** іншых людзей муж яе павёз у Маскву пуд мукі, а там за гэтую муку набыў пяць пудоў солі ("Пад'езд"). І яму і ёй **у дакументах** па 40 гадоў ("Кіслая крыніца"). Ён дасканала ведаў і мог бясконца пераказваць **з памяці** жыццеапісанні ўсіх святых ("Пабожны мешчанін"). Найчасцей сёння ў такіх сплучэннях ўжываецца пад уплывам рускай мовы прыназоўнік *па*.

Самае непасрэднае дачыненне да распрацоўкі праблемы прыназоўнікаў мелі Г. Базыленка ("Граматыка беларускай мовы", Мн., 1962) і яе паслядоўнік П. Шуба (пяцітомны "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы", іншыя працы).

П. Шуба нязменна стаіць на пазіцыях прызнання нарматыўнасці ў беларускай мове некаторых канструкцый "прыназоўнік *па*+ давальны склон". У дапаможніку для універсітэтаў "Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія" (Мн., 1987) ён піша: "Ёсць рад значэнняў, у першую чаргу абмежавальных, прычынных і паасобных адценняў часавых, дзе форма давальнага склону (у адзіночным ліку) замацавалася як трывалая норма, параўн.: *урок па пісьму, дождж прайшоў як па заказу, прыбыў па вашаму загаду, рабілі па старому звычаю, таварыш па універсітэту, фільм па Горкаму, капуста па вядру, снег па лапцю, гурбы па мядзведзю, сказаць па сакрэту, зганьбіць па злому намеру, не знаходзіў адрасу па цэламу месяцу* і інш.".

Кідаецца ў вочы штучнасць некаторых словазлучэнняў. Форма давальнага склону прыметнікаў і займеннікаў — вынік уплыву рускай мовы. Што да спалучэнняў *па вядру, па лапцю, па сакрэту*, дык тут назоўнік у форме не давальнага, як сцвярджае П. Шуба, а меснага склону. Нагадаем, што беларуская мова мае сінанімічныя канструкцыі: *урок пісьма, прыбыў паводле вашага загаду (на ваш загад, з вашага загаду), фільм паводле Горкага, сказаць пад сакрэтам* і інш. П. Шуба не хоча пагадзіцца нават з тымі ўжываннямі прыназоўніка па з месным склонам, якія "ўзаконіў" школьны "Арфаграфічны слоўнік" (Мн., 1990) М. Лобана і М. Судніка. Слоўнік падае за норму: *таварыш па атрадзе, загад па універсітэце.*

Яшчэ ў 60-я гады шмат хто з навукоўцаў, педагогаў і журналістаў разумеў, што канструкцыі "прыназоўнік *па* + *давальны склон*" неправамерныя ў беларускай мове. Так, настаўнік, аўтар школьных падручнікаў і дапаможнікаў Н. Шэўчык у водгуку на другі том акадэмічнай "Граматыкі беларускай мовы" ("ЛіМ". 19.12.1967) пераканальна давёў, што спалучэнні прыназоўніка *па* з формамі давальнага склону не ўласцівыя беларускай мове. А тое, што ў словазлучэннях тыпу *агент па збыту, праверыць па журналу* назоўнікі ўжытыя з канчаткам *-у*, далёка яшчэ не паказнік, што гэта давальны склон. У беларускай мове ёсць шмат выпадкаў, калі ў месным склоне назоўнік канчаецца на *-у(-ю): на шляху, на калу, па Рыгору, у рукапісу, у ценю* і інш. Значыць, і дапасаваны да такога назоўніка прыметнік набывае канчатак меснага склону. Некаторыя назоўнікі ўжываюцца з варыянтнымі канчаткамі доўгі час: у Пецярбурзе — у Пецярбургу, у кажусе — у кажуху, на ланцузе — на ланцугу. Але незалежна ад канчатка назоўніка прыметнік мае форму меснага склону: гуляць па летнім Пецярбурзе — гуляць па **летнім** Пецярбургу.

Сцвярджаць, што ў беларускай мове прыназоўнік *па* замацаваўся з давальным склонам — значыць упарта ігнараваць сучасную літаратурную практыку. Сёння, як і шмат гадоў назад, многія беларускія выданні правільна ўжываюць сплучэнні з прыназоўнікам *па*: **Па абмеркаваным пытанні** прынята адпаведная пастанова; меркаванняў **па дакладзе і праекце** новага Палажэння было шмат ("Настаўніцкая газета". 29.10.94). Дзейнасць па **фармаванні** гэтых уменняў павінна быць распачата значна раней; разгорнуты адказ на пытанне настаўніка ці сфармуляваны ім тэзіс **па мастацкім творы** ("Роднае слова". 1994. N 10). Яны [дзённікі] хутчэй напісаны **па прынцыпе**: не тое, што помніцца, а тое, што мроіцца... ("Полымя". 1994. N 10). Быў прыняты **па конкурсе** ў Цэнтральную музычную школу-дзесяцігодку **па класе** скрыпкі ("ЛіМ". 28.10.94).

Новая акадэмічная граматыка мусіць "пайсці насустрач" беларускай мове — зняць путы з канструкцый "па + месны склон", увогуле падаць сапраўдны беларускі сінтаксіс. Але ці збудзецца гэтае пажаданне? Цяжка сказаць. З паведамлення А. Падлужнага даведваемся, што да падрыхтоўкі граматыкі запрошаны "работнікі Белдзяржуніверсітэта"...

Сёння мовазнаўцы, асабліва акадэмічныя, у разгубленасці і страху перад "тым хаосам, які існуе не толькі ў правапісе, а і ў лексіцы, граматыцы, сінтаксісе" (А. Падлужны). Бясспрэчна, памылак у пісьмовай і вуснай літаратурнай мове шмат. Бо ў моўным працэсе бяруць удзел людзі, якія не аднолькава добра валодаюць мовай. Часта не выконваюць як належыць сваіх абавязкаў рэдактары, а найперш аўтары (навукоўцы, пісьменнікі, журналісты), перакладчыкі. І ўсё ж не трэба завастраць сітуацыю, падгараваць грамадства, каб павялічыць "цяжар" сваёй працы, як гэта любяць рабіць мовазнаўцы.

Роля лінгвістаў не павінна зводзіцца да ролі суддзяў моўнай практыкі. Найперш ім самім трэба вызначыцца ў моўнай палітыцы. І не падстаўляць мове падножкі там, дзе яна ідзе "правільным курсам", не спрыяць пашырэнню "хаосу".

На жаль, спрычыняюцца да моўнага бязладдзя навукоўцы і тады, калі свядома парушаюць літаратурныя нормы, а ў выніку — разбураюць сістэмы беларускай мовы. Звернемся зноў да кнігі П. Шубы. Няма сумніву, прафесар цудоўна ведае, што словазлучэнні і сказы: **падрыхтавацца к экзаменам, халаднавата станавілася к раніцы, прыйсці за разлікам, догляд за хворым, табун у трыста коней** не адпавядаюць літаратурным нормам нашай мовы. Але такімі прыкладамі ён ілюструе ўжыванне прыназоўнікаў. Памацняе "хаос" у мове падача прыкладаў з лексічнымі, марфалагічнымі памылкамі, з парушэннем спалу-

чальнасці слоў: *піліць бервяно на дошкі* (замест: *пілаваць...*), *хадзіць па маліну* (замест *хадзіць у(па) маліны*), *ашчаджаць па кавалку, рассмяяцца не да ладу, пах ад кветак, перацерці снег на муку.*

Многія беды мовы з таго, што ў некаторых беларускіх навукоўцаў няма ўпэўненасці ў добрай перспектыве нацыянальнай справы. Адсюль гэтая неакрэсленасць, супярэчлівасць выказванняў адносна функцыянавання і развіцця беларускай мовы, неадэкватнасць тэарэтычных вывадаў і практычных мерапрыемстваў яе надзённым патрэбам.

Дырэктар Інстытута мовазнаўства пагаджаецца (гл. "Наша слова" за 5.10.94), што ў цяперашніх слоўніках "сустракаюцца яўныя русізмы" і гэта "трэба выправіць", але адначасова нібы апраўдвае такое становішча: русізмы "часцей за ўсё бяруцца з мастацкіх твораў, з нейкіх пісьмовых тэкстаў", "картатэка — аснова нашай работы", але "мы яе зараз не можам папаўняць належным чынам".

А вось як паказвае А. Падлужны працу "моваведаў" у справе дасканалення беларускай арфаграфіі: "Рабочай групе прыходзілася (!) **шмат працаваць**, каб кожны раз вынесці **нешта талковае** на пленарнае пасяджэнне камісіі", але: "на жаль, лепшага, чым ёсць, **нічога не змаглі прыдумаць**".

Не вызначаецца паслядоўнасцю, лагічнасцю і сам дакумент дзяржаўнай камісіі па ўдасканаленні правапісу "Высновы" ("Звязда". 13.09.94). Камісія прызнае, што "беларускі правапіс вельмі ўжо ж недасканалы". Сапраўды, у ім нямала недарэчнага. Напрыклад, трэба пісаць: дзень — дзянёк, дзеці — дзяціны, але нельга: дзесяць — дзясяты, сем — сямнаццаць.

Як быць у такой сітуацыі? Напэўна, трэба дасканаліць правілы арфаграфіі. Але камісія, спаслаўшыся на грамадскую думку, палічыла, што ў цяперашніх абставінах гэтае "мовазнаўчае мерапрыемства" немэтазгоднае. Праўда, няздзейсненыя "рэфарматары" пачуваюцца не зусім камфортна, робячы такую "выснову", і таму спрабуюць суцешыць і супакоіць сябе, а разам і грамадскасць: "...наогул мова не належыць да тых катэгорый, дзе трэба праяўляць паспешлівасць, паддавацца пачуццю боязі — хаця б не спазніцца".

І ўсё ж камісія, праз сваю кампетэнтнасць і разважлівасць, убачыла небяспеку: "Найвялікшая сёння наша бяда... у тым, што ўвогуле беларускай мове... пагражае асіміляцыя і паглынанне з боку ...мовы нацыянальных зносін", актуальная задача цяпер — "пашырэнне беларускай літаратурнай мовы ў грамадскіх зносінах". Здавалася б, ад гэтай "глабальнай" высновы ўсяго толькі крок да лагічнага вываду: з "пагрозай увогуле" трэба змагацца канкрэтнымі дзеяннямі, у тым ліку ўдасканальваць правапіс. Але такі крок не зроблены.

Дзякуй камісіі, што пакідае хоць надзею: рэформу правапісу можна будзе праводзіць тады, "як наступіць трывалая палітычная стабілізацыя ў рэспубліцы, канчаткова ўсталюецца і ўмацуецца дзяржаўнасць Беларусі, яе суверэнітэт і незалежнасць". Усталюецца і ўмацуецца... Само?! Без умацавання пазіцый дзяржаўнай мовы?

Камісія "разгледзела стан літаратурнай мовы і яе ўжыванне ў апошнія гады ў пісьмовай і вуснай формах" і выявіла, што нормы і правілы літаратурнай мовы "пачалі масава парушацца". Гэтыя парушэнні, адзначаюць аўтары "Высноў", не толькі ад неахайнасці ("па неахайнасці") і праз непісьменнасць ("па непісьменнасці"), "пачалося зусім свядомае і мэтанакіраванае ўкараненне і пашырэнне... іншых нормаў і правілаў".

Цікава, а да якога "разраду" аднесці моўныя хібы, якіх шмат у невялікім тэксце "Высноў"? Напрыклад: "**Не дасягнута было адзінства** толькі ў адносінах ужывання мяккага знака на пісьме і ў прыватнасці, для абазначэння асіміляцыйнай мяккасці зычных. **Гэта галоўная праблема сучаснага разнабою ў правапісе...**"

"Змяненні ж у правапісе цягнуць за сабой не толькі матэрыяльныя выдаткі і затраты значнага часу на іх (?) пашырэнне і ўкараненне, але і зніжэнне прэстыжу беларускай літаратурнай мовы, тэмпаў яе пашырэння ва ўжыванні. Ды і змяненні ў правапісе непазбежна вядуць да нестабільнасці **яе самой**".

"Аднак праца Камісіі была **сканцэнтравана**, як гэта і належала, **над пытаннямі** правапісу".

"...становішча беларускай мовы ў нашым грамадстве ўсё яшчэ досыць **кволае**".

Словы *існуючы* і *зараз* у "Высновах" выцеснілі ўсе наяўныя беларускія адпаведнікі: "пазбавіцца ад *існуючага зараз* правапіснага разнабою і канфрантацыі", "*існуючую зараз* у літаратурнай мове сітуацыю", "абмеркаванне *існуючых* праблем літаратурнай мовы" і г. д. Так вырашаецца праблема ўзбагачэння слоўніка, актуальнасць якой падкрэсліла камісія?

Лічыць, што аўтары "неахайныя" і "вольна разумеюць" нормы, не дае іх высокі статус членаў дзяржаўнай камісіі, якой даручана справа велізарнай адказнасці. Хочацца выключыць і "непісьменнасць": у складзе камісіі акадэмікі, дактары філалогіі, пісьменнікі. Тады застаецца апошняе — "свядомае і мэтанакіраванае ўкараненне і пашырэнне"... Але наўрад ці пагодзяцца шаноўныя нарматворцы з такой кваліфікацыяй сваіх моўна-стылёвых недаглядаў. Дык, значыць, трэба і ім, навукоўцам, больш

(Працяг на стар. 12)

Часопісы ў снежні

ТАК ВОСЬ І ЖЫВЁМ...

Яшчэ не так даўно пісьменнікам, якія спрабавалі паказаць што-небудзь негатыўнае з нашага жыцця, даводзілася нялёгка. Вельмі ж неахвотна бралі рэдакцыі падобныя творы. Выдавецтвы іх таксама "адштурхоўвалі", спасылаючыся на нетыповасць сітуацый — альбо на тое, што, маўляў, тэма ўзята важная і адказная, але не раскрыта па-майстэрску...

Цяпер жа — пішы пра што хочаш і друкуй, дзе хочаш — ніхто асаблівых перашкод на тваім шляху ставіць не збіраецца. Але — парадокс дый годзе! Тады былі творы, але іх не пускалі ў друк. Цяпер ці не перад кожным — "зялёнае святло", а значных па сваёй задуме твораў не так і шмат. Назіраецца, бадай, тое, што і раней, толькі так сказаць, з адваротным знакам. Тады знаходзіліся ахвотнікі ўсхваляць сацыялістычны лад жыцця, а сёння з'явілася нямала выкрывальнікаў усіх бед, што абрынуліся на нас у постсавецкім грамадстве, але і тыя пісалі нецікава, шаблонна, і сённяшнія творцы — гэтаксама.

Тым большую радасць адчуваеш, калі сутыкаешся з тым, што глыбока асэнсавана аўтарам, за чым стаіць не проста жаданне пісаць на актуальную тэму, а неабходнасць выказацца, перадаўшы вуснамі лірычнага героя ўласны боль, асабістую трывогу.

Гэтымі якасцямі валодае, напрыклад, А. Зэкаў, які ў снежаньскім нумары "Маладосці" выступае са змястоўнай паэтычнай нізкай. (Дарэчы, у "Полымі" ён надрукаваў невялікія апавяданні, у якіх відочна дакументальная аснова). У вершах ягоных — адчуванне суровых рэалій нашага жыцця і разуменне дыялектыкі яго, дзе ўсё ўзаемазвязана і дзе, разам з тым, кожны чалавек ўсё ж абавязкова вылучаецца з шэрагу іншых, не важна, лепшымі ці горшымі якасцямі. Зразумець яго — значыць і самому яшчэ раз наблізіцца да ісціны, адчуўшы, наколькі цяжкая дарога да яе і наколькі патрэбная яна. Ды гэта, думаецца, добра бачна з верша "Сусед":

Ваўкаваты мой сусед
самагонку вечна глушыць
і глядзіць ваўком на свет,
толькі вось пагляд той скрушны,
бо адзін — на цэлы дом! —
без дзяцей жыве, без жонкі,
адзічэлы ходзіць днём,
сум заліўшы самагонкай.
Ў тым віна яго? бяда? —
разбярыся тут за часам.

А мне так яго шкада,
хоць ты йдзі з ім выпі разам.

Вось і ўвесь верш. За некалькімі радкамі паўстае лёс чалавека, якога асудзіць лягчэй, чым зразумець. Раней мы — толькі асуджалі. Ды і як было не асуджаць, калі — ці не ўсе — дбалі адно пра шчасце ўсяго чалавецтва, а наконт канкрэтнага чалавека... Ды што з яго возьмеш — звычайны "вінцік". Цяпер, як быццам, усё інакш, хоць не так жа даўно гаварылі яшчэ пра чалавечы фактар, пра сацыялізм з чалавечым тварам. Ды і капіталізм, відаць, будуем з гэтым самым тварам. Аднак — яшчэ болей абасамляемся адзін ад аднаго, кожны наравіцца схавацца ва ўласнай шкарлупіне. Так спакайней, цяплей і — бяспечней...

Лірычнаму герою А. Зэкава баліць... І за іншых, калі яны непрыкаянцы, забытыя, незаўважаныя. Аднак ён не хавае і асабістага болю. Болю маральнага, духоўнага. Ён не саромеецца прызнацца, калі нешта робіць не так. Бо — не так як след усё атрымліваецца, бо — такі збег абставін. Ды абставіны абставінамі, а ўсё роўна ўсяго гняце трывога, няпэўнасць і віна. Як у вершы "А я ўсё ж спазніўся крышку...", прысвечаным паэтам роднаму дзеду. Не стала блізкага чалавека, пахавалі яго, пахавалі без унука:

Як ля апошняга парога,
стаю ля свежага крыжа,
адзін, самотны, вінаваты,
пад адзінокаю сасной,
бы на крыжы на тым распяты
прад ім апошняю віной.

Суровыя рэаліі не дазваляюць драмаць сумленню паэтаў, і таму ў вершы многіх аўтараў апошнім часам уладна ўрываецца палітыка. Здавалася б, М. Маляўка (часопіс "Маладосць") у сваёй творчасці меней за ўсё схільны да гучнай публіцыстычнасці, але чытаеш верш "Спектакль" і радуешся: настолькі тонка ўдалося яму спасцігнуць сапраўдны сэнс многага з таго, што адбылося і адбываецца: "Раскідалі хату старую, а новай — няма".

І ўсё ж М. Маляўка па-ранейшаму дасягае найбольшага поспеху ў вершах лірычнага плана, у якіх шмат асабістага — любасці да Бацькаўшчыны, а калі канкрэтней — да роднай і мілай сэрцу Стаўбцоўшчыны, да Мікалаеўшчыны, адкуль пачалася паэтава дарога. Аб гэтым сведчыць верш "Пад небам асеннім". Як кранальна сказана і як непаўторна: "Галінкай, карэньчыкам кожным пад небам асеннім дрыжыш". Быццам адчуваеш гэты холад асенняй вёскі. Адчуваеш і разумееш паэтава жаданне:

Каб мог, асцярожна ўзяў бы
Ў далоні цябе, пагушкаў,
Сагрэў бы дыханнем, зяблую,
Як неадлётную птушку.

Ды нішто слота і холад, калі кожная сустрэча з вёскай маленства нясе цяпло: "Не хутка ўсміхнуся вясне, але і такая, халодная, ты ўжо саграваеш мяне, о Мікалаеўшчына родная!"

Дзвюма вялікімі падборкамі прадстаўлены ў "Полымі" і "Беларусі" М. Кусянкоў. Абедзве — з кнігі "Чага", сустрэча чытача з якой наперадзе. Паэт шукае ратунку для бацькоўскай зямлі — спакутаванай, знявечанай, абпаленай чарнобыльскім прысакам. І знаходзіць яго:

Вярнуся ж у лес я, і колькі б наўпрост
Брысці не прыйшлося,
Знайду я той чорны, як вугаль, нарост
На белай бярозе.
Знайду і збалелай зямлі прынясу
Ўсясільную чагу.

Увогуле, як бачна з гэтых падборак, чарговая паэтычная кніга М. Кусянкова мецьме тую скіраванасць, якую мы ўсё часцей называем набліжэннем да Беларусі. У сцвярджэнні лірычнага героя: "Трэба, каб я тут араў і сеяў" — разуменне, што ніхто за саміх беларусаў на іх роднай зямлі нічога не зробіць. Самім нам будаваць дзяржаўнасць, ладзіць яе дом, каб годна стаяў і перад іншымі за яго не было сорамна.

З празаічных твораў вылучыў бы раздзелы з рамана В. Хомчанкі "Забітае — не забытае" ("Полымя"). Безумоўна, месцамі можна заўважыць і пэўную фрагментарнасць, але ж — гэта твор незавершаны і ўжо ніколі не будзе дапісаны. Таму трэба гаварыць аб асноўных накірунках аўтарскай задумы. Як бачна, Васіль Фёдаравіч хацеў паказаць, наколькі ў трыццатыя гады страх паралізаваў ці не ўсё грамадства, і як самыя сумленныя і смелыя знішчаліся, не могучы нічога зрабіць перад таталітарнай сістэмай. У цэнтры два вобразы колішніх аднапалчан. Колісь Піскуноў і Клімаў служылі ў адным кавалерыйскім эскадроне. Першы на той час належаў да тых, хто дапамагаў знаходзіць "ворагаў народа", таму за кратамі апынуўся і Клімаў. І вось сустрэча праз дзесяцігоддзі. Па збегу абставін дачы Піскунова і Клімава аказаліся поруч. Можна толькі здагадвацца, як складуцца ўзаемаадносіны гэтых людзей. Хаця — здагадвацца якраз не так і проста. Верагодней за ўсё, што Клімаў так і не зможа дараваць колішняга Піскунову. Хаця — як сказаць. Час жа многія раны залечвае, ды і невядома яшчэ, як жыў далей сам Клімаў. Апублікаваныя раздзелы рамана заканчваюцца тым момантам, калі Клімаў адважыўся на ўцёкі з лагера, вырашыў падацца на фронт: "Усялякая ўдача і няўдача можа залежаць ад зусім малой дробязі ці збегу абставін, якіх зусім немагчыма было прадбачыць. Не мог прадбачыць і Клімаў, што ў той дзень, у нядзелю, з дзвюх суседніх калон уцякуць яшчэ дзевяць зэкаў. І, як потым выявілася, ва ўсіх уцекачоў была такая ж мэта, як і ў Клімава — трапіць на фронт..."

Кнігу "непрыдуманых апавяданняў пра падзеі 30-х гадоў, сведкам і ахвярай якіх быў", напісаў і П. Прудзікаў. У "Маладосці" — два з гэтых твораў: "Самазабойца" і "Жывая мішэнь". Тое, пра што расказвае аўтар, жудаснае і страшнае. Яно і сведчанне трагічнага часу, але яно і напамінак аб тым, як важна жыць у грамадстве ў згодзе, каб перажытае намі ніколі не паўтарылася.

А вось аповесць Ю. Станкевіча "Свінапузь" ("Маладосць") выклікае іншы настрой. Твор гэты — сатырычна-гумарыстычны. Ю. Станкевіч вельмі праўдзіва і пераканаўча выкрывае графаманства, паказвае тых, хто рвецца ў літаратуру, не маючы ні кропелькі таленту, а толькі амбіцыі.

Іван Чыгрынаў працягвае асваенне драматургічнага жанру. І з кожным разам пашырае кола сваіх мастакоўскіх пошукаў: у "Маладосці" друкуе драму "Савіцкі", тым самым заглыбляецца ў гады рэвалюцыйнай барацьбы. А тут, як вядома, шырокае поле дзейнасці для пісьменніка, які не прывык верыць стэрэатыпам гісторыі. Чыгрынаў жа акурат да такіх і адносіцца. Таму, імкнучыся да праўды, аб'ектыўнасці, ён не баіцца па-свойму глянуць на супярэчлівыя падзеі і — дасягае поспеху. Савіцкі паўстае і ахвярай свайго часу і барацьбітом, які не толькі ўзвышаецца над гэтым часам, а ў нечым як бы і "стварае" яго, фарміруе тую атмасферу, у якой пачынаюць апраўдвацца любыя сродкі дзеля дасягнення мэты. Ці не ў гэтым трагізм не толькі саміх барацьбітоў, але і іх наступнікаў, калі, дбаючы аб справядлівасці, да гэтай справядлівасці многія ішлі зусім не праведнымі мэтамі. Забывалі, што сродкі, узятыя на ўзбраенне дзеля дасягнення нечага, павінны быць вартымі гэтага выніку.

Дарэчы, з І. Чыгрынавым мы сустракаемся і ў часопісе "Беларусь" (артыкул М. Тычыны "Пісьменнік — гэта лёс" у сувязі з 60-годдзем Івана Гаўрылавіча) і ў "Нёмане", дзе змешчана гутарка Д. Бугаёва і І. Чыгрынава "Літаратура — маё жыццё". Абодва матэрыялы прыцягваюць увагу, дазваляюць зразумець, наколькі адчувальная прысутнасць І. Чыгрынава ў сучаснай беларускай літаратуры (і колішняй савецкай), як глыбока, у прыватнасці, асэнсоўвае ён тэму мінулай вайны, ідучы, як правіла, па цаліку.

І яшчэ пра "Беларусь". Як вядома, нядаўна споўнілася 70 гадоў беларускаму кіно. Не сказаць, каб юбілей нашым друкам шырока адзначаўся, а калі і з'явіліся ў некаторых газетах і часопісах матэрыялы, дык мелі яны традыцыйны юбілейны характар. Іншым шляхам пайшоў часопіс "Беларусь". Гаворка на старонках найперш аб тым трывожным становішчы, у якім апынуўся нацыянальны кінематограф. Сваімі меркаваннямі дзеляцца рэжысёры, крытыкі, драматургі, генеральны дырэктар кінастудыі "Беларусьфільм" Ю. Цвяткоў, галоўны рэдактар студыі дакументальных фільмаў "Летапіс" С. Палякоў. Трывожныя развагі, нічога не скажаш. Але, нягледзячы ні на што, беларускае кіно жыве і фільмы здымаюцца, вось толькі для каго?.. Калі б гэта гаварыў не генеральны дырэктар кінастудыі "Беларусьфільм" па вытворчасці і эканоміцы А. Шкадарэвіч, дык не паверыў бы. Аказваецца, беларускія стужкі заказваюць Ханты-Мансійск і Паўднёва-Сахалінск. "І разам з тым — ніводную копію айчыннага фільма не набыў пракат Беларусі. Кожны наш фільм мае два варыянты — на рускай і беларускай мовах. Мы прапаноўвалі беларускія варыянты прадстаўнікам нашых пракатных арганізацый. Тыя адмовіліся, спасылаючыся на адсутнасць сродкаў. Але на амерыканскія стужкі трэцяга гатунку грошы ў іх адразу знайшліся".

Так вось і жывём...

М. АНДРЭЕНКА

ПА ПРАБЛЕМАХ ТЭРМІНАЛОГІІ

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны пры ўдзеле Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь, Акадэміі навук Беларусі, Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны праводзяць 18—19 траўня 1995 г. у Мінску II Нацыянальную канферэнцыю "Праблемы беларускай навуковай тэрміналогіі".

На канферэнцыі будуць разглядацца тэарэтычныя і дастасоўныя праблемы распрацоўкі, сістэматызацыі і практычнага выкарыстання беларускай навуковай тэрміналогіі ў розных галінах навукі, тэхнікі, культуры і народнай гаспадаркі. Працу канферэнцыі плануецца арганізаваць у форме пленарных пасяджэнняў і работы тэматычных секцый. Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны ў выніковым зборніку.

Аргкамітэт запрашае навукоўцаў і прыхільнікаў роднай мовы прыняць удзел у канферэнцыі. Заяўку на ўдзел трэба падаваць да 1 сакавіка 1995 г. на адрас: 220005, Мінск, вул. Румянцава, 13, ТБМ імя Ф. Скарыны, аргкамітэт тэрміналагічнай канферэнцыі. Просім паведаміць назву Вашага даклада (і дадаць кароткую анатацыю яго зместу аб'ёмам да 1/2 старонкі), а таксама звесткі пра Ваша месца працы і пасаду, навуковую ступень і навуковае званне, службовы і хатні адрас і тэлефоны.

Кантактныя тэлефоны аргкамітэта: 332511, 395061 (старшыня аргкамітэта Язэп Стапановіч), 394447 (сакратар аргкамітэта Святлана Бельская).

ІВАН ШАМЯКІН ПРА ДЗЯЦІНСТВА І ЛЁСЫ

Так можна вызначыць у некалькіх словах змест гутаркі Л. Забалоцкай з народным пісьменнікам Беларусі І. Шамякіным "Плынь глыбокая жыцця", змешчанай у дванаццатым нумары часопіса "Пралеска" за мінулы год. У гэтым жа нумары — слова галоўнага рэдактара "Пралескі" А. Сачанкі "Эліксір свята", артыкул А. Марціновіча "Аўтар кнігі пра Купалу" (да 85-годдзя з дня нараджэння З. Бандарынай), навагодняе інтэрв'ю З. Лысенкі з кампазітарам Л. Захлеўным "З новай песняй!", чарговая падборка "Вясёлы вулей" (творы У. Мацвеенкі і Э. Агняцвет), песня "Калядная" (муз. Л. Захлеўнага, словы Л. Пранчака), іншыя матэрыялы.

ВЯРТАННЕ АЎГЕНА КАЛУБОВІЧА

Як мы паведамлялі раней, апошнім часам на Беларусі выйшлі дзве кнігі аднаго з найбольш вядомых прадстаўнікоў беларускага замежжа Аўгена Калубовіча "Крокі гісторыі" і "На крыжовай дарозе", змест якіх склалі вўтабіяграфічная дакументальна-мастацкая аповесць аўтара аб перажытым у часы сталінізму, а таксама яго артыкулы, нарысы, прысвечаныя вядомым нацыянальным дзеячам, асноўным момантам супярэчлівай беларускай перадвоеннай гісторыі.

Нядаўна ж мінскі клуб "Спадчына" пад кіраўніцтвам А. Белага наладзіў прэзентацыю згаданых выданняў, што адначасова стала і свайго роду вяртаннем А. Калубовіча на Бацькаўшчыну. На вечарыне выступілі сам А. Белы, сын А. Калубовіча Аўген Аўгенавіч, пробашч касцёла Святых Сымона і Алены ксёндз У. Завальнюк; паплечнік А. Калубовіча, удзельнік Другога усебеларускага кангрэса А. Анішчык, колішні вучань Беларускай гімназіі імя Я. Купалы ў Міхельдорфе Ц. Вострыкаў (дарэчы, у гэтай гімназіі ў свой час А. Калубовіч працаваў выкладчыкам), А. Грыцкевіч, А. Мальдзіс, Г. Сурмач, Ю. Хадыка, Л. Мірачыцкі.

НЯМА ТАГО, ШТО РАНЬШ БЫЛО...

Гэтыя радкі М. Багдановіча, якія сталі папулярнай песняй, прыгадаліся на вечарыне, прысвечанай 20-годдзю Гомельскага абласнога таварыства "Кніга". А калі больш дакладна, то няма былых сустрэч пісьменнікаў і артыстаў з чытачамі, паездак па мясцінах, звязаных з жыццём і творчай дзейнасцю вядомых беларускіх і расійскіх пісьменнікаў...

З настальгіяй гаварылі пра гэта старшыня Гомельскага гарсавета, удзельніца з'езда кнігалюбаў былога СССР С. Гальдадзе, начальнік упраўлення культуры аблвыканкама паэт А. Маісеенка, адказны сакратар абласной пісьменніцкай арганізацыі В. Ткачоў, шматлікія сябры таварыства.

І як бы сёння ні было цяжка, але выключна ўсе прыйшлі да адной думкі: каб больш не ўспаміналіся самотныя радкі знакамітага паэта, трэба зноў сустракацца пісьменнікам са сваімі чытачамі, бо цікавасць людзей да літаратурных твораў расце з дня на дзень — абрыдлі ім розныя баевікі ды эратычны шырспажыў, якія запаланілі ўсё наўсцяж. А кніга, пагадзіцеся, была, ёсць і будзе!

Васіль БАРХАНАЎ

З ДАПАМОГАЙ БАНКА

У Літве, як і ў іншых колішніх савецкіх рэспубліках, і раней з цікавасцю ставіліся да творчасці народнага пісьменніка Беларусі Быкава, выдавалі яго творы. Але цяпер, бадай, як і ўсюды, тут узнікаюць цяжкасці з кнігавыданнем. Тым не менш літоўцам хочацца, каб творы Васіля Уладзіміравіча паранейшаму знаходзілі дарогу да тутэйшага чытача. Выдавецкі цэнтр Літвы вырашыў выпусціць у перакладзе на літоўскую мову яго аповесці "Альпійская балада" і "Воўчая зграя". Дапамогу ў выданні вырашыла аказаць праўленне "Белзнешэканомбанка". І, вядома ж, садзейнічае ў гэтай справе пасольства Рэспублікі Беларусь у Літве. Дарэчы, "Белзнешэканомбанк" фінансуе многія культурныя, навуковыя, спартыўныя мерапрыемствы, што праводзяцца за мяжой.

Паэзія

Алесь ЖЫГУНОЎ



МАЯ ТРОЙЦА

Памерлі ці знямелі жаўрукі?
Нібы ў жалобе, сціхлыліся хаты.
Спяваюцца патроху землякі
І кажуць, што Чарнобыль вінаваты.

Што п'янства — грэх, — даведзена даўно,
Але і слодыч горкая, вядома.
І сам я п'ю нясмачнае віно,
Калі ў гасцях, калі бываю дома —

За бацьку, маці, цётак і дзядзькоў,
За іх цяпер і днюю і начую.
Сярод шматпавярховых мацюкоў
Вясковыя навіны я пачую,

Што сёлета ўрадзіла ярына
І старшыня тылы свае мацуе.
І вёска вось такая не адна:
Спяваецца, а ўсё-такі працуе,

І корміць, і ратуе гарады,
На ласку не скупая і на слёзы...
І ціха адыходзіць на клады,
Пад шумныя траецкія бярозы.

•

Мы пераходзім зноў на "вы",
Інтымнасць лёгкую згубілі.
Усе акенцы сінявы
Хмарынкі смутныя закрылі.

І, пэўна, чорт не разбярэ —
Жыццё якое пражываем.
Учора — лета на дварэ,
А сёння проста замярзаем.

І я зняверыўся ў сабе
І памыліўся я ў прыродзе,
А ўжо за спінаю сапе
Маё наступнае стагоддзе.

Ці хопіць сіл яму гадзіць,
Каб зразумець сябе і Бога,
Які з аблок уніз глядзіць
І не гаворыць анічога?

РАЗМОВА З САРОКАЙ

Чарга сарокі — ёй прашыты,
Імкліва падаю на дол.
Ужо забіты і забыты,
Я азіраюся наўкол.

Там, дзе заранка заіграла,
Мая каханая жыве.
І тое, што мяне не стала,
То ёй зусім не ў галаве.

Ды і сябры не ўспомняць ярка,
На гэта многа ёсць прычын.
Збліжала нас найболей чарка
І анекдоты пра жанчын.

А вось зласліўцы мяне ўспомняць.
Збярэцца недзе ў шалашы
І чарку скрушную напоўняць
За супакой маёй душы.

Яна, маўляў, ужо далёка,
Няма там тостаў і прамоў...
Загаварыўся я, сарока,
А мне пара, пайду дамоў.

•

Галоўкі астраў у маіх руках
Так ветла раскашуюцца на сонцы.
Дашчэнту абмялелая рака
У слоіку змясцілася на донцы.

Іду да мамы, крочу пад гару,
Іду да мамы мілай у адведкі.
Я з ёй пабуду, з ёй пагавару
І падару запозненыя кветкі.

Іх пры жыцці ніколі не дарыў.
На вуснах ад слязінкі загарчэла.
Пабыў у мамы, з ёй пагаварыў —
І жыць на свеце крышку палягчэла.

•

Гэта ты, прыгожая такая?
Падыдзі і сэрца супакой.
Матыльком разбуджаным лятае
Сумны мой, паніклівы настрой.

У душы сцінаецца трывога,
Скрозь такія горасныя дні.
Мне твая патрэбна дапамога,
Ты мяне святлом сваім крані.

І настрой праясніцца, магчыма,
Будуць росы раннія звінець.
Як змагла з такімі вось вачыма
Ты ў жахлівым свеце ацалець?!

Павел ПРУДНІКАЎ



ТУРЭМНЫ КАРЦЭР

Вось ён цёмны, жудасны трохкутнік —
Скрозь граніт, жалеза і бетон.
Я, былы зняволены пакутнік,
Праклінаю мне абрыдлы дом!

У астрозе, што завуць "Крыжамі",
Я ў бетоннай пастцы "загараў".
Холад там мяне змяёю джаліў,
А на нервах опер-следчы граў.

Там мяне сцябалі бізунамі
І вадзілі двойчы на "расстрэл".
Тое ўсё цяпер здаецца снамі,
Бо інакшы лёс мяне сустрэў.

Толькі не, забыць такое нельга
З незагойнай ранай на душы.
Хай сабе стаю сягоння ў чэргах,
Ды пакуль што можна яшчэ жыць.

А было — ў краіне панавалі
Што ні дзень даносы, хапуны.
І пасля ў трохкутнікі кідалі
"Небяспечных ворагаў" паны.

Хто пабыў у гэтай душалоўцы,
Дажываў знявечаным свой век.
Там ніхто не гладзіў па галоўцы.
Раз патрапіў —
ты не чалавек.

БАЦЬКУ

Ты калісь гаварыў:
— Будзь сумленным, сынок,
У сям'і, у дарозе, за працай.
Хай заўсёды гарыць дабрыні вугалёк
І чароўныя сны табе сняцца.

Ты тады быў бадзёрым, у росквіце сіл,
Ні хвароб ты не ведаў ні суму.
Падымаўся на золку. Араў і касіў...
Каб не жыць у галечы, ты думаў.

Я запамятаў шчырыя словы твае
І тваю працавітую постаць.
Як цяпер мне, татуля, цябе не стае —
Той парады і слоў тваіх простых!..

Я цябе перажыў аж на дваццаць гадоў!
Ды ад іх не чакаю спагады.
Часта сню я цябе і старэнькі наш дом,
І хаджу да цябе за парадай.

Я цяпер з пасівелай, як лунь, галавой
Праклінаю свой прыцемак-вечар.
Больш не рвуся бяздумна, без памяці ў бой,
А чакаю з табою сустрэчы...

АПОШНІ ПРЫПЫНАК

Дапіваю свой кубак-бакал —
Перажытага горкія рэшткі.
Колькі год я па свеце блукаў,
Нібы той непрыкаяны грэшнік.

Засталіся вунь толькі круті
Там, дзе плыў незвычайны мой човен,
Дзе губляў я сяброў дарагіх —
Ля Байкала, Нарылкі, Пячоры...

Калыханку мне пела тайга
На бяскрайнім сібірскім абшары,
А гайдала на крылах пурга,
Разганяючы чорныя мары.

Ды пранёс праз усё я жыццё
Веру ў сілу і моц Чалавека.
Абраджаў недавер і нішчё
Незайздроснага нашага веку.

Я не ведаю, колькі яшчэ
Паблукаю па маці-зямельцы.
Знаю толькі,
што я не Кашчэй,
А таму й не ўспрымаю бяссмерце.

Лаўрэаты-94

Прадстаўляць Раісу Баравікову чытачу няма патрэбы: гэтае імя даўно заняло годнае месца ў нашай літаратуры. Яе паэзія — гэта шчырая, да гранічнай адкрытасці споведзь жаночай душы: закаханай, смуткуючай, радаснай, зажуранай, узнёслай, летуценнай, збалелай, роспачнай... І заўсёды — прыгожай, чыстай і светлай у сваіх пачуццях.

Працяг гэтай споведзі на новым жыццёвым узроўні ("з грузам у сорак гадоў жыву") — і ў кнізе "Люстэрка для самотнай", якая сталася, так сказаць, падставай для прысуджэння высокай узнагароды. Некалі паэт сказаў: "Я — паэт, гэтым і цікавы". Р. Баравікова магла б паўтарыць гэтыя словы, дадаўшы да слова паэт адно-аднюсенькае азначэнне: жанчына. Хто б яшчэ, акрамя паэта-жанчыны, мог бы сказаць вось так: "Што поспехі, што адчуванне ўлады супроць гарачай волі пачуцця?!" Ах, пачуццё, пачуццё! Найперш — пачуццё кахання. Хіба гады маюць, могуць мець над ім уладу? "Раптоўны жар... І ўсё няпроста... Хвалюе дотык Ваш няўзнак, а не пахвалішся ўжо ўзростам, хоць і ўслаўляў яго Бальзак". Што ні кажыце, а гэта — кранае, знаходзіць жывы водгук і ў маёй, чытацкай душы, якая таксама не пахваліцца ўжо ўзростам. І прачытала, не — праглынула я гэтую не надта і вялікую кніжку (нейкая сотня вершаў і драматычная паэма "Барбара Радзівіл") у адзін прысест, не адрываючыся, прачытала з адчуваннем, што гэта не паэтэса, а сама я зведвала ўсё, чым поўніліся радкі вершаў. І, узнесеная на высокую хвалю суперажывання, я чытала, перачытвала, паўтарала ў думках найбольш упадабанае, кранальнае:

"Калі адчай, хоць закрычы,
калі туга па Вас даймае,
тады мне дамавік іграе,
сама не ведаю, на чым..."

"Караблік папяровы на вадзе,
дзіцячы смех з паветра узарвецца,
і сэрца стук... Я знаю, яно б'ецца
так у вялікім шчасці ці ў бядзе..."

"Выходзь да люду пры парадзе
ці выстаўляй каптан з рыззя,
ў аднойчы сказанай няпраўдзе
калісь патоне праўда ўся..."

"Адумалася: ну які ж тут сорам?
Каханне — шчасце і працяг быцця.
Хіба са светам я дзялюся горам,
я ў свет нясу жыццё — сваё дзіця..."

З такім настроем я і напрасілася на сустрэчу з паэтэсай-лаўрэаткай...

— Раіса Андрэеўна, як вы ўспрынялі прысуджэнне вам Дзяржаўнай прэміі Беларусі?

— Для мяне гэты момант быў вельмі прыемны, бо Дзяржаўная прэмія на сённяшні дзень — гэта самая высокая ўзнагарода для любога творцы. У дадатак гэта было для мяне ў нейкім сэнсе і прыемнай нечаканасцю, таму што была і альтэрнатыва, і наогул сёння такі час, які не надта спрыяе пэўнасці ці ўпэўненасці. Было радасна і хораша і ад усведамлення таго, што ў Камітэце па прэміях менавіта за мяне аддалі свае галасы паважаныя, сумленныя, шчырыя людзі. Усё гэта і радуе, і акрыляе, і натхняе.

— Прэміяй адзначана кніга "Люстэрка для самотнай". Дык, значыць, яна — своеасаблівая вяршыня творчасці? Ці, як прынята гаварыць, лепшая ваша кніга яшчэ наперадзе?

— Самому цяжка — ды і не выпадае — нешта ацэньваць. Тут хутчэй можна гаварыць пра вельмі асабістыя адносіны. Вось, напрыклад, драматычная паэма "Барбара Радзівіл". Яна для мяне рэч асаблівая, хоць, можа, і не скажу, што самая дарагая. Пакуль адшуквала матэрыял, ужывалася ў вобраз гераіні, шліфавала радкі, мінула нямала гадоў. Карацей кажучы, паэма забрала ў мяне не толькі шмат часу, але і вялікай душэўнай аддачы...

"Я Ў СВЕТ НЯСУ ЖЫЦЦЁ..."

ГУТАРКА З ЛАЎРЭАТАМ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ РАІСАЙ БАРАВІКОВАЙ

— А што падштурхнула вас звярнуцца да гістарычнай тэматыкі? Як узнікла задумка твора?

— У нашай гісторыі, на жаль, збераглося не так і шмат імёнаў. Тым больш — жаночых! А тут прачытала ў летапісе Рачынскага пра Барбару Радзівіл, пра гісторыю яе кароткага жыцця і яе трагічнага кахання. Сюжэт захапіў мяне. Сама таямніца кахання, загадкавая да гэтага часу смерць Барбары Радзівіл — была яна атручана па загадзе каралевы Боны Сфорца ці памерла з нейкае іншае прычыны, легенда пра чорную даму Нясвіжа — тут хоцькі-няхоцькі возьмешся за пяро... Вядома, здабыты гістарычны матэрыял клаўся ў паэму не жыўцом, штосьці дадумвалася, дапрацоўвалася, уключалася ў работу фантазія. Нехта іншы паглядзеў бы на гэты сюжэт іначай і напісаў пра ўсё гэта інакш, а ў мяне напісалася менавіта гэтак, і для мяне "Барбара Радзівіл" — дарагі момант з майго жыцця, а не толькі твор. Пасля ўжо паводле паэмы пісалася п'еса, але гэта ўжо зусім новы твор. П'еса стваралася па законах тэатральных, па законах драматургіі. У выніку я зноў нямала часу жыла ў гэтым вобразе, захаплялася ім. Так вось і сталася, што паэма ў кнізе асабіста для мяне ўспрымаецца ці не галоўным творам, хоць, можа, чытачы будуць іншай думкі наконт гэтага. А што да вершаў, дык паасобныя, калі б давялося кніжку перавыдаваць, сёння ўжо не ўключыла б у яе. Гэта, мне здаецца, натуральна, бо з цягам часу на свае ўласныя вершы пачынаеш усё ж глядзець трошкі адчужана, ужо як бы збоку. А што да лепшай кніжкі, якая яшчэ наперадзе... Гэтага пэўна ніхто не можа сказаць. Можа быць і лепшай, а можа — і слабейшай. Калі, скажам, азірнуцца назад, дык у мяне і цяпер хінецца душа да кніжкі "Адгукнуся голасам жалейкі". Проста той момант жыцця, калі пісалася яна, быў для мяне і горкі, і салодкі, неразгаданы да канца, згадкі аб ім жывуць, зберагаюцца і сёння, і мо таму многія вершы з тае кніжкі больш задавальняюць мяне, чым вершы, сабраныя ў "Люстэрку для самотнай". Але, зноў жа, гэта чыста асабістае адчуванне...

— Раіса Андрэеўна, а што вы можаце сказаць пра сваіх літаратурных настаўнікаў?

— Гэтае пытанне таксама няпростае. У маладосці, у гады студэнцтва мяне захапляла паэзія Ахматавай, Цвятаевай, па сённяшні дзень я люблю перачытваць Пятрарку, санеты Шэкспіра ў перакладах Дубоўкі. У любога паэта, якога чытаеш, нечаму вучышся. Люблю перачытваць і нашу класіку: Багдановіча, Купалу. Тут хочацца гаварыць не пра настаўнікаў, а найперш пра паэтаў, да якіх зведваеш нейкае асаблівае пачуццё — пачуццё любві і ўдзячнасці, пра паэтаў, без якіх твой уласны паэтычны шлях ці адбыўся б. Сёння, калі ўжо нямала пражыта і калі часцей, азіраешся назад, мне заўсёды вельмі дарагі для душы і сэрца воблік паэта і чалавека Аляксея Пысіна. Ён заўважыў мае першыя вучнёўскія спробы на старонках раённай газеты, падтрымаў маё жаданне пісаць, параіў паступаць у літаратурны інстытут. Вельмі дарагі мне і Пімен Емяльянавіч Панчанка. Дагэтуль у мяне захавалася ягоная паштовачка. Я прасіла ў яго рэкамендацыю для паступлення ў Саюз пісьменнікаў, паслала яму першую сваю кніжачку. І вось ён прыслаў мне паштоўку з пералікам тых вершаў, якія яму спадабаліся, напісаў, што дасць рэкамендацыю, і неяк вельмі далікатна сказаў, што пра недахопы — іншым разам. З адной кніжкай тады не надта ахвотна прымалі ў саюз. І тут мяне вельмі падтрымаў Ніл Сымонавіч Гілевіч. Ён папрасіў рукапіс маёй другой кніжкі, які быў здадзены ў выдавецтва, прачытаў яго, сказаў пра мяне і маю творчасць добрыя словы, і я была прынята ў СП, а кожнаму маладому паэту хочацца хутчэй уступіць у творчы саюз, каб набыць статус прафесійнасці. Я заўсёды нашу ў душы пачуццё ўдзячнасці людзям з нашага літаратурнага асяроддзя, якія і падтрымаюць, і дапамогуць, і параяць. Кожны з названых мною людзей можа быць маім настаўнікам. Стасункі з імі дапамагалі мне набываць і жыццёвы, і творчы вопыт.

— Раіса Андрэеўна, хацелася б, каб вы падзяліліся з чытачамі некаторымі сакрэтамі "творчай лабараторыі". Як узнікаюць, нараджаюцца ў вас вершы? З чаго ўсё пачынаецца?

— Тут для мяне важныя два моманты. Трэба, каб зусім нечакана прыйшоў, уварваўся першы радок, а, можа, зусім і не першы, можа, ён потым стане алошнім, але — каб ён загучаў ува мне, гэты радок будучага верша. Ён можа прыйсці дзе заўгодна — у дарозе, у рэдакцыйным пакоі, на кухні...

— І вы яго тут жа занатоўваеце на паперы?

— Ён запамінаецца, але я ўсё ж сапраўды стараюся яго запісаць. На маім пісьмовым стале такіх запісаў — процьма, і я прашу маіх сямейнікаў і блізка не падыходзіць да яго, бо толькі я адна магу разабрацца, дзе і што ляжыць там. Дык вось, мне патрэбен гэты першы радок і — адпаведны настрой, альбо натхненне, згаданы мною другі момант. Прыходзіць у душу нейкае ўзрушэнне, вельмі глыбокі смутак, жаль, і тады гэты душэўны настрой быццам штосьці падштурхоўвае ўва мне, і за тым першым радком пачынаюць з'яўляцца, нараджацца наступныя радкі верша.

У нас шмат цудоўных паэтаў. Прынамсі, дзесяткі са два сапраўдных, самага высокага ўзроўню паэтычных зорак. У кожнага з іх вершы нараджаюцца па-рознаму, у кожнага свая псіхалогія творчасці, і гэта заўсёды цікава. Ёсць паэты, якія могуць плённа працаваць у Доме творчасці, скажам. А вось я там пакутую, а не пішу. Мне здаецца, што мне дапамагаюць нават родныя сцены. Некалькі разоў даводзілася мяняць кватэру, і гэта былі пакутлівыя для мяне часіны, бо — магу працаваць толькі там, дзе прывыкла, дзе я адчуваю нейкі свой творчы фон, тое, што стварае творчы настрой. Ёсць у мяне, прызнаюся, і музыка пэўная. Калі, напрыклад, доўгі час не пішацца, а патрэба пісаць адчуваецца, узнікае, я ўключаю "сваю" музыку. Я ведаю зусім пэўна, што калі прагучыць дарагая для мяне мелодыя, неабходны "рабочы" настрой прыйдзе. Гэты самы настрой можа ўзнікнуць і ў часе чытання чужых вершаў...

Наогул, мне часам думаецца, што за кожным вершам стаіць вялікая энергія. У сувязі з гэтым успамінаецца Канстанцыя Буйла. Неяк у "Работніцы і сялянцы" яшчэ ў 80-я гады мяне папрасілі з'ездзіць да яе ў Маскву і зрабіць матэрыял. Я паехала. Мы чыталі вершы, перачытвалі Купалу, знаходзілі любімыя радкі ў яго — я свае, яна свае, і яна раптам кажа: вось калі я чытаю верш і мяне працінаюць дрыжыкі, значыць — гэта сапраўдная паэзія. А пасля я прачытала ў Рэрыха пра нявывучаную касмічную энергію, што прыводзіць у нейкі рух нервовыя клеткі чалавека і выклікае дрыжыкі, быццам мурашы пабеглі па скуры. Я прачытала гэта і ўспомніла Канстанцыю Антонаўну. Відаць, сапраўды паэт аддае, напаўняе свой верш нейкай сваёй, унутранай, душэўнай, касмічнай энергіяй, якая пасля, у часе чытання, перадаецца чытачу і выклікае "мурашоў на скуры", так званае суперажыванне. Інакш чым яшчэ вытлумачыць яго? Я ведаю, многія людзі разважаюць паблажліва: маўляў, якія там мукі-пакуты, сеў і напісаў вершык! А гэта ж далёка не так! Гэта і настрой, і падрыхтаванасць душы, гэта і нешта няўлоўнае, невыказнае, што змушае цябе працаваць апантана і дзень, і другі, і трэці, а потым быццам усё зачыніцца і ты не ведаеш, калі зноў гэта прыйдзе да цябе...

— Калі ўжо зайшла гаворка пра "творчыя сакрэты", дык скажыце і пра вашы ўзаемаадносіны з рэдактарамі вашых кніг. Ці часта рэдактарская рука ўмешвалася ў вашы вершы?

— Я не надта люблю, калі мяне правяць. Ведаю, што многія маладыя паэты не пярэчаць супраць гэтага. Сама колькі разоў чула ад іх, калі працавала літаратурным кансультантам: калі вы лічыце, што трэба паправіць, — праўце. Я не прымаю гэтага. Бывала, друкуючы вершы ў часопісе, згаджалася на нейкія рэдактарскія праўкі. Але пры выданні кнігі вяртала тым вершам ранейшы, першапачатковы выгляд, аднаўляла свае радкі. Лічу, што гэта, хоць няхай і слабое, кволае, але — сваё. Творчасць — гэта вельмі індывідуальная рэч, і кожнае чужое ўмяшанне

для мяне вельмі балючае, я штораз страшэнна перажываю.

Вядома, і рэдактары бываюць розныя. Скажам, у выдавецтве "Мастацкая літаратура" Леанід Дранько-Майсюк — рэдактар вельмі далікатны, з тонкім, высокім густам. Ён рэдагаваў дзве мае кніжкі, у тым ліку "Люстэрка для самотнай", і ў радкі ніколі не ўмешваўся.

— Раіса Андрэеўна, банальнае пытанне, аднак жа — як вы ўмудраецеся сумяшчаць і творчасць, і працу ў часопісе, і хатнія, сямейныя клопаты?

— Гэта вельмі цяжка, калі па шчырасці. Для паэта наогул, а для паэтэсы — тым больш. Зрэшты, гэта якраз і падкрэслівае, што няма паэтаў і паэтэс, а ёсць проста паэты. Я доўгі час з усіх сіл трымалася быць на так званым вольным хлебе, гэта значыць, старалася не "служыць" дзе-небудзь у рэдакцыі ці выдавецтве. Але ж як іначай выжыць? Сёння ніякі муж у адзіночку на зарплату не можа ўтрымліваць сям'ю. Вымушана была пайсці на працу ў рэдакцыю "Работніцы і сялянкі" і я, працую тут з прыемнасцю, прыжылася, здаецца, у нашым слаўным невялічкім калектыве. Люблю я выконваць і грамадскія абавязкі, бываць у школах, выступаць перад дзецьмі, хоць і гэта таксама забірае не лішні для творчага чалавека час. А яшчэ больш часу губіць наш неўладкаваны быт. Я люблю быць дома, люблю сваіх хатніх. І хоць часта ўшчуваю, павучаю іх, але ж люблю і гатаваць ім, і прыбраць, і памыць. Я ўдзячна ім, што яны не ўмешваюцца ў мой, скажу гучна, творчы працэс. Для іх я мама і жонка, і толькі.

— Што вы думаеце пра нашу сучасную паэзію? Ці спрыяе ёй наш сённяшні час, нашы сённяшнія варункі?

— Я ўжо казала, што ў нас нямала проста выдатных паэтаў — і старэйшага, і сярэдняга, і малодшага пакаленняў. А вось кантактаў ранейшых паміж намі няма, на жаль. Наогул, творчае жыццё неяк змізарнела, аціхла, мы вельмі рэдка куды-небудзь выязджаем, сустракаемся. Раней жа было інакш, і паэзію нашу ведалі, цанілі не толькі тут, дома, але і далёка за межамі Беларусі. Прынамсі, так здавалася. А цяпер? Час проста вар'яцкі. Людзі заняты найперш побытам, матэрыяльнымі патрэбамі, а на духоўны спажытак асабліва не зважаюць. Толькі ж — ці можна гэтак доўга жыць? Высокі дух павінен прысутнічаць, ён стрымлівае тыя ці іншыя крайнасці. Паэт павінен быць трошкі вольны, адлучаны ад будзённых клопатаў, ну не тое што лунаць у аблоках, але ўсё ж павінен быць хоць трошкі акрылены. А час — прызямляе, абяскрыльвае. І яшчэ адно. Творчага чалавека трэба ўсё ж падхвальваць, творчаму руху, росту спрыяюць добрыя словы. На жаль, сёння не толькі творцы, паэты — уся наша літаратура прыніжана, занядбана, і гэта крыўдна, недаравальна, недапушчальна...

— Раіса Андрэеўна, усё гэта сапраўды крыўдна і балюча. Дык што — і перспектывы, будучыні няма? Ці мо ўсё ж прыйдзе іншы час — і для нашай літаратуры, і для ўсіх нас, для дзяржавы нашай?

— У мяне погляд на ўсё гэта даволі аптымістычны. Я не сказала, бадай, пра галоўнае ў самым пачатку нашай гаворкі. Я рада, што высокая ўзнагарода носіць імя незалежнай Рэспублікі Беларусь. А гэта ўжо — назаўсёды! Вяртання назад — не будзе! Гісторыя дала нам шанц — і мы адродзімся. Зарука гэтаму — наш народ, душа якога — жыве. Вось, скажам, "Звязда" аб'явіла конкурс прыпевак. Колькі яна надрукавала гэтых прыпевак з усіх куткоў Беларусі! І заўважце — ніхто не прыслаў аніводнай на рускай мове, толькі на мове роднай. І гэта прысылалі простыя, звычайныя людзі, якія любяць дасціпнае, трапнае слова. Скажу і пра такі момант. Раней, чуючы недзе беларускае слова, можна было не сумнявацца, што гаворыць яго пісьменнік ці журналіст, ну яшчэ настаўнік. А сёння папытайце пра што-небудзь на вуліцы, у транспарце — вам часта адкажуць па-беларуску. І асабліва часта — моладзь. Як той казаў, працэс пайшоў. А вазьміце фірму "Дайнова", банк "Дукат" — там усе супрацоўнікі ведаюць беларускую мову, гавораць і працуюць на ёй... Усё гэта падтрымлівае маё аптымістычнае пачуццё.

Хочацца тут і маленства сваё прыгадаць. У нашай хаце адзначаліся ўсе народныя святы. Дзяды, скажам, памятаю. Мама на Дзяды заўсёды шмат гатавала, смажыла. І пакідала нанач стол з ежаю. Казала: "Ноччу дзяды прыйдуць, хай павячэраюць з намі". Я старалася на заснуць, прыслухоўвалася, ці не бразгане клямка, як дзяды будуць ісці ў хату... А як зіму праганялі? Бабуля брала памяло, махала ім і казала: "Ідзі, зіма, з хаты, ідзі прэч!" Гэта, пэўна, і давала, закладвала ўва мне нейкі творчы пачатак. І ўсё гэта жыве і сёння. Прынамсі, у нас, на Брэстчыне, дзе я нарадзілася і расла...

— Хачу вярнуцца да "Барбары Радзівіл". П'еса паводле паэмы пастаўлена на "Вольнай сцэне" рэжысёрам Валерыем Мазынскім. Скажыце, вас не захапіў тэатр? Не прадоўжацца вашы стасункі з ім?

— Для мяне тэатр — храм. А чаму паспрабавала зазірнуць у яго? Ува мне заўсёды жыве жаданне заглянуць у суседні жанр — у прозу, скажам, у драматургію. Але разам з тым ува мне заўсёды прысутнічае і пачуццё, што тым самым я здраджу галоўнаму — паэзіі. Што, напісаўшы апавяданне, я марна страчу час, дараваны мне на верш. Я некалькі разоў падступалася да аповесці, але гэтая самая боязь змушала мяне спыніцца. Ёсць у мяне нямала фантастычных, самых неверагодных сюжэтаў, але — няма смеласці, рашучасці ахвяраваць дзеля іх ажыццяўлення паэзіяй. Тое ж самае і з драматургіяй. Вось нарэшце рашылася, выйшла, так сказаць, на сцэну. А другі раз — наважуся? Не ведаю. Новая п'еса амаль напісана, гэты раз не вершам, засталося толькі адшліфаваць, зрабіць аправу, але — ці скончу, ці давяду яе да ладу? Я ўсё чакаю вершаў, я ўсё збіраю, раскідваю па стале свае радкі, строфы...

— А ўсё-такі, што сёння на тым стале, акрамя гэтага?

— Пішу апавяданне, зноў з той жа самай аглядкай на здраду. Ляжаць на стале незавершаныя нататкі пра Амерыку, пра сваю нядаўнюю паездку туды. А яшчэ — працую над кніжкай для дзяцей. Як бачыце, я ў творчай форме, хай Бог дае адно здароўя і часу...

— Дзякуй вам, Раіса Андрэеўна, за гутарку. Яшчэ раз ад імя "ЛіМа" і лімаўцаў віншую вас са слаўнай падзеяй у вашым пісьменніцкім лёсе і жадаю вам добрага творчага плёну.

Гутарку вяла
Марыя ГІЛЕВІЧ

Музыка

АКУСТЫЧНЫ ВЕРНІСАЖ З УДЗЕЛАМ...

Artist — слова, якое і перакладаецца парознаму, і ў перакладзе мае не адно значэнне. Мастак, артыст; майстар сваёй справы. Мастак, які займаецца вытанчанымі штукарствамі (больш ужываецца пра музыкантаў, акцёраў). Асоба, якая дасягнула высокага мастацтва ў пэўнай галіне...

Artist — якраз **тое** слова! Менавіта яно, і ў гэткім шрыфтавым абрысе, і ва ўсім яго тлумачальным аб'ёме пасуе да партрэта Аляксандра Літвіноўскага. Спадар Літвіноўскі, як вядома, кампазітар. Але "кампазітар" — не больш чым нейтральна-дакладнае вызначэнне прафесійнай прыналежнасці мастака, які й малюе, рыфмуе, здатны да відачынства, дасціпнай імправізаванай ігры, быццам ён — мудрае дзіця далёкай эпохі Адраджэння, а не пасталелы ў свае трыццаць два відавочца нашага, армагедонавага часу. Зрэшты, на тое і Artist...

Сп. Літвіноўскі, аднак, малюе, рыфмуе, ладзіць відачынства, творыць артыстычную імправізацыю не толькі й не столькі ў літаральным сэнсе. Бліскуча робіць ён гэта ў сферы, скажам так, мастацкага, эстэтычнага гуку, насычаючы эмацыянальную памяць слухачоў акрэсленымі вобразамі, настраёвымі імпрэсіямі, дзівоснымі перазовамі гістарычных глыбіняў з пульсам дня сённяшняга, з галасамі народных традыцый, з непрадказальным рухам авангарда...

Чалавек з развітой культурай слухання праз музычны малюнак А. Літвіноўскага пачуе тое самае цудоўнае імгненне, што лучыць мінулае з будучыняй. Нездарма ж яго першы аўтарскі канцэрт выпраўляўся да публікі пад назваю "Метамарфозы часу. Ад традыцыі да авангарда".

А ўрэшце, падзел музыкі на "колішнюю" ды "заўтрашнюю", "старую" ды "новую" — гэта яшчэ адна ўмоўнасць у бясконцай чарадзе чыста зямных умоўнасцяў ды чалавечых забабонаў. Усё было і ўсё вяртаецца. І не трэба, ратуючыся ад страху напрыканцы XX стагоддзя, ідэалізаваць уклад Сярэднявечча. І не трэба спяшацца з адкрыццямі, не зазірнуўшы ў раку забыцця... Але калі мастак убачыў шлях да крыніцы Вечнага і зрабіў некалькі ўпэўненых крокаў, ён ужо не паверне назад па чужых слядах і наўрад ці рынецца на злом галавы ў нязведанасць, бо яна можа стацца ўсяго толькі падманлівай нязведанасцю пустаты.

Аляксандр Літвіноўскі ласкаю Божай знайшоў гэты шлях, і яго творчыя крокі ўражваюць грунтоўнасцю. Сімфанічная фрэска "Krewa", кантаты "Вяселле" ды "Зборная суботка", электронныя кампазіцыі "Сцікс", "Фея прыліваў", "Ра", "Харугва", "Вітраж"...

З "Вітража", дарэчы, пачынаўся і аўтарскі канцэрт — зімовым вечарам, у зале на Залатой Горцы. Гэтая прыгожая кампазіцыя набыла другое жыццё: перастораная для аргана, яна разгортвалася ў ігры свежых акустычных фарбаў і абертонаў, гучала як прэлюдыя, як уводзіны ў праграму вечара, як запрашэнне на вернісаж музыкі. Каляровы "Вітраж" высакародна ззяў у касцёльных прыцемках. Голас аргана далікатна запаўняў камерныя аб'ёмы ўтульнай культавай будыніны. І калі дасюль архітэктуру называлі застылай музыкай, дык цяпер напрошвалася іншае параўнанне — параўнанне музыкі з анімацыйнай — чаму б і не?! — архітэктурай.

"Дойлід-аніматар", Artist, сам сядзеў за арганам, захоплены актам Творчасці. Між тым, А. Літвіноўскі надзіва хутка (за пару дзён да канцэрта) і ўпэўнена зрабіў арган "сваім." З адметным голасам, з яркай і арыстакратычнай рэгістроўкай.

Потым было прэзентаванае некалі Камерным аркестрам "Concertino-barocco" ў новай версіі (для квінтэта струнных) і ў вытанчаным выкананні маладых музыкантаў, якія разам з аўтарам нібыта прыпынілі крок на старадаўняй галерэі, зірнулі на жывапісныя палотны, пачулі Мелодыю ў інтанацыйным атачэнні Рэальнасці.

"Intavolatura", сюіта для гітары сола, — грацыёзная ігра-гульня паміж Рэнесансам і авангардам. Выдатны выканаўца Яўген Грыдзюшка літаральна варажыў на сцэне разам са сваёй гітарай, якая падавала голас то нібыта здалёк, то нібыта з глыбінь касцельных сутарэнняў, то яна шаптала, то скардзілася, то пяяла, то гаварыла, то працінала пытаннямі...

А следам — выбух: піяніст Алег Крымер, які сваёй фенаменальнай тэхнікай і наступальным тэмпераментам здатны выклікаць у публікі штосьці блізкае да шоку! Зразумела, гэтага вымагаў матэрыял, фартэпіянны дыпціх, у якім эпатажны "Perpetuum mobile" неспадзявана ўраўнаважвала неспешная, засяроджаная на драматычным стане, "Passacalia".

Знаёмы, а ўсё такі ж непрадказальны ў прыёмах і сродках ўтварэння гукавой матэрыі "Wir" для квартэта валторнаў; дасканалы, просты й загадкавы, як жыццё вулею, "Ul" для струннага квінтэта. Фрагменты з вядомай містэрыі "Францыск", перастораныя з дыхтоўнай сімфанічнай партытуры на не менш важкі ў вобразным сэнсе дуэт баса (Алег Гардынец) ды аргана (Аляксандр Літвіноўскі). Атрымаўся, дарэчы, дзівосны эфект арганічнага спалучэння быццам бы неспалучальнага: магутнасці опернага баса, моцы каралеўскага інструмента, драматычнага напалу душэўнай барацьбы героя твора і той найтанчэйшай пранікнёнасці, якой валодае выключна камерная музыка.

Кампазітар Аляксандр ЛІТВІНОЎСКІ.

Удзельнік імпрэзы — мужчынскі камерны хор "Унія".

Вянцом гэтага музычнага вернісажа былі тры фрагменты з новага твора А. Літвіноўскага — Імшы для мужчынскага хору, створанай па высокіх законах грыгарыянскага харалу. Мо й не трэба казаць, як падзейнічаў на слухачоў прасветлены дух прыгожай і гарманічнай музыкі: спяваў жа непаўторны хор "Унія" пад кіраўніцтвам Кірылы Насаева. (Для гэтых унікальных галасоў твор і прызначаны).

Удзельнікамі вечарыны ў зале — у храме! — на Залатой Горцы былі яркія асобы нашага мастацкага свету. Дзякуй ініцыятыўнай і дзелавітай арганізатарцы і вядучай канцэрта, музыказнаўцы Іне Шайхатовіч. Дзякую — а ўсё ж мушу перапрасіць. Бо на мой суб'ектыўны густ, драматургія праграмы, як і сама музыка (як і сама публіка!), не вымагала нейкіх асаблівых настойлівых каментарыяў. Мо таму тэмпераментныя шматслоўныя сольныя імправізацыі вядучай падаліся залішнімі, дый павявала ад іх, на жаль, хутчэй рускім дэкадансам, чым беларускім Адраджэннем...

Зрэшты, сумненні ды заўвагі растаюць у паветры на золку новага дня — музыка пакідае ў душы добры напамінак на год, на тры, на пяць... На ўсё жыццё.

С. БЕРАСЦЕНЬ

Фота В. СТРАЛКОЎСКАГА

"МУЗЫЧНЫ ПАДВАЛ"

Мала хто паверыць, што маладыя спевакі і музыканты з невялікага гарадка Камянец уваходзіць у лік вядомых выканаўцаў беларускай эстрады. Але гэта сапраўды так. Моладзь з мясцовай студыі "Музычны падвал" стала прызёрам некалькіх тэлеконкурсаў песні. А пятнаццацігадовая выканаўца Таня Каліна заняла трэцяе месца на фестывалі ў Маладзечне.

Творы і аранжыроўкі, створаныя кіраўніком студыі Сяргеем Сухамліным, выкарыстоўваць у сваім рэпертуары такія эстрадныя зоркі Беларусі, як Аляксандр Саладуха, Андрэй Хлястоў, Алена Сауленайтэ і іншыя.

На здымках: арганізатар "Музычнага падвала" Сяргей Сухамлін. Ім напісана для выканальнікаў больш за сто песень; кожны вечар збіраюцца ва ўтульным памяшканні студыі "Музычны падвал" маладыя выканаўцы і музыканты Камянца.

Фота Рамана КАБЯКА, БЕЛІНФАРМ

ТРЭЦІ ПА ЛІКУ, ЁН ЖА — "АПОШНІ..."

За два гады Слонімскі беларускі драматычны тэатр паставіў два спектаклі па п'есах свайго ж, слонімскага літаратара Аляксея Якімовіча — "Чарадзейныя суніцы" і "Хітрыкі бабы Ягі". І вось — новая прэм'ера — "Апошні дыназаўрык". Ён, як і папярэднія, адрасаваны самым юным гледачам.

Апошні дыназаўрык (ролю яго выконваюць Васіль Сявец і Анжэла Прэдка) трапляе з невядомай планеты на нашу Зямлю якраз напярэдадні Новага года. Першымі зямлянамі, з кім сустрэўся Дыназаўрык, былі Зюзя-зімавіца (Уладзімір Навумік і Ірына Яцук) і Бабуля-барабуля (Ніна Жукоўская і Таццяна Натарава). Яны... хочуць замарозіць апошняга дыназаўрыка! Але на дапамогу яму прыходзіць дзед Мароз (Віктар Шчарбакоў і Алег Савушкін) і Снягурка (Іна Ёрш)...

Спектакль "Апошні дыназаўрык" паставіла малады рэжысёр-дэбютант Таццяна Дубік. Прыгожае і яркае афармленне ажыццявіла маладая мастачка Людміла Лобач.

Сяргей ЧЫГРЫН

Беларускае замежжа

АГЛЯД ЁСЦЬ... АГЛЯД

"ЛіМ" па магчымасці больш-менш рэгулярна расказвае пра перыядычныя выданні беларускага замежжа і асобныя кнігі. Больш чым іншым шанцуе часопісу "Полацак", кожны чарговы нумар якога трапляе ў рэдакцыю. Нядаўна ж мы атрымалі і два нумары квартальніка "Belarusian review", пазначаныя летам і восенню мінулага года.

Часопіс "Беларускі агляд" выдаецца каліфарнійскім аддзелам БАЗа (Беларуска-амерыканскага задзіночання). Як сведчыць яго галоўны рэдактар Джоў Прайс, ідэя выдання з'явілася даўно, а пачаў выходзіць "Беларускі агляд" з ліпеня 1989 года.

Здавалася б, дзіўна... Беларускі часопіс выходзіць не па-беларуску, а па-англійску. Але на тое ёсць важкія прычыны. Вось што наконт гэтага гаворыць сам Д. Прайс: "Першая — мы, беларуская эміграцыя ў Злучаных Штатах, заўважылі, што маладое пакаленне беларусаў мала цікавіцца Бацькаўшчынай сваіх продкаў, неяк адыходзіць ад беларускіх спраў. Прычына такога становішча, аказваецца, вельмі простая — яно недастаткова валодае беларускай мовай. Дагэтуль амаль уся інфармацыя пра Беларусь на эміграцыі падавалася па-беларуску. А мясцовая англамоўная прэса мала ўвагі адводзіла падзеям на Беларусі. А другая прычына вынікае, так бы мовіць, з першай. Паколькі англамоўная прэса па сутнасці абыходзіла Беларусь, дык мы вырашылі яе зацікавіць падзеямі на Бацькаўшчыне. Праз гэты ж самы "Беларускі агляд". Мы свой часопіс рассылаем у рэдакцыі амерыканскіх газет, у бібліятэкі, навуковыя ўстановы. Прытым не толькі ЗША, а і Канады, Еўропы. Акрамя таго, у свой час зрабілі заклік да бацькоў-беларусаў, чые дзеці не размаўляюць па-беларуску, праз газету "Беларус", каб яны дасылалі адрасы сваіх дзяцей".

Адлаведным чынам у "Беларускім аглядзе" падбіраюцца і матэрыялы. Змяшчаюцца перадавыя артыкулы на самыя важныя палітычныя падзеі. Аўтарамі гэтых публікацый з'яўляюцца супрацоўнікі рэдакцыі, прадстаўнікі беларускай дыяспары, замежныя палітыкі і журналісты з ЗША, Канады, Англіі. Пад рубрыкай "Форум Беларусі" падаюцца меркаванні суайчыннікаў з Беларусі на актуальныя тэмы палітыкі і эканомікі.

Ды, бадай, лепей уяўленне аб "Беларускім аглядзе" атрымаць, калі бліжэй пазнаёміцца з адным з яго нумароў. Для прыкладу, возьмем апошні, трэці. У перадавіцы Д. Прайс разглядае пытанне вяртання Беларусі ў Еўропу, ролю эміграцыі ў гэтым важным працэсе. Былы амерыканскі амбасадар у Беларусі Д. Суорц дзеліцца сваімі думкамі пра Беларусь і яе месца ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Падрабязна расказваецца пра новага амерыканскага пасла ў Рэспубліцы Беларусь К. Ялавіца. У артыкуле Я. Запрудніка гаворыцца пра культурную палітыку новага беларускага ўрада (у аснову пакладзены даклад, прачытаны на семінары для амерыканскага пасла ў Беларусь).

Што ж, відочна, што "Беларускі агляд" — выданне, якое патрэбна ў замежжы ўсім, хто хоча болей ведаць пра Рэспубліку Беларусь.

Тэатразнаўца Мікалай Манохін быў шчыра ўражаны акцёрскім мастацтвам Уладзіміра Самойлава ў ролі Рычарда III і вырашыў напісаць пра яго. Але... "не так, як усе людзі..." Ездзіў у Горкі, глядзеў акцёра ў спектаклях. Перагледзеў усе ягоныя работы ў тэатры імя У. Маякоўскага (Масква) і ў кіно. Даведаўшыся, што Уладзімір Якаўлевіч — любімы акцёр кінарэжысёра Вячаслава Нікіфарава, напрасіўся да яго папрацаваць на пляцоўцы ў спадзяванні наблізіцца да свайго куміра на здымках фільмаў "Бацькі і дзеці", "Дуброўскі", "Вялікая прыгода", "Хлеб пахне порахам"...

У гэтыя студзеньскія дні народны артыст Азербайджана і народны артыст СССР, лаўрэат дзяржаўных прэмій Расіі Уладзімір Самойлаў адзначае свой сямідзесяцігадовы юбілей. З ім гутарыць Мікалай Манохін.

"НЕ МНЕ МЕРКАВАЦЬ ПРА ВЯРШЫНІ..."

— Уладзімір Якаўлевіч, які ваш самы любімы фільм?

— "Чапаеў". Зроблены проста, дабротна. Высокапрафесійна. Галоўнае — па-філасофску глыбока. Некалькі дзесяткаў разоў глядзеў і заўсёды лавіў сябе на думцы: чым жа ён падкупляе, зачароўвае? Шчырасцю. Цудоўнай рэжысурай. Акцёрскім ансамблем.

— Ваш самы дрэнны фільм?

— Ой, шмат... Усіх не пералічыць... Але я табе скажу, што мне сёе-тое не падабаецца нават з таго, што атрымала шырокае, так бы мовіць, прызнанне... "Балада пра салдата", напрыклад. Адкуль, хто, дзеля чаго, навошта ўзняў такі гвалт вакол гэтай досыць пасрэднай стужкі? Якія толькі эпітэты не вешалі на гэтае кіно! І — узрушэнне, і — адкрыццё, і — новае слова ў сусветным кінамастацтве, і чаго толькі не пісалі крытыкі... Паглядзеў яго на гастролях у Валгаградзе. Выйшаў з кінатэатра ніколькі не ўражаны. Паглядзеў яшчэ раз. Спакойны. На здымках фільма "26 бакінскіх камісараў" пад Баку, у пяску — гляджу трэці раз і пытаюся ў сябе: чаму не разумею нованароджаны шэдэўр? Хто там, што новае адкрыў? Бачу трывалыя, шчыра ўкрадзеныя штампы...

— Ці любіце вы дублі?

— Гэта работа. Звычайная, чарнавая. Самы адказны, кульмінацыйны момант у нашай прафесіі, ды, пэўна, і ў кінематографе — таксама. Без дубляў нельга. Бо дублі здымаюць не толькі з-за памылкі, скажам, акцёра або акцёрскага ансамблю: нехта выбіваецца, не цягне... ды ці мала чым можа быць незадаволены рэжысёр? На здымках штохвілінна здараюцца нейкія нечаканасці чыста тэхнічнага характару, якія вымагаюць абавязковага паўтору. Іншае пытанне, што ў кіно не заўсёды трапляюцца бяскрыўдныя ролі. Надараюцца і досыць крыўдныя кур'ёзы. У "Вяселлі ў Малінаўцы", дзе я біў Папандопулу, да слова сказаць — па-майстэрску сыгранага Мішам Вадзяным, здымалі пяць дубляў. Рэжысёр Тутышкін прасіў Мішу цярпець, мне шаптаў: біць па-сапраўднаму. Я біў. Вадзяному было не да смеху. Крыўдна? Безумоўна. Але яшчэ больш крыўдна стала, калі ён даведаўся, што ў фільм увайшоў першы дубль. У "Сібірыядзе" мне таксама перапала. Міхалкоў-Канчалоўскі здымаў шмат дубляў. А я там і дровы сек, і за сынам з вялізным натуральным дрынам ганяўся. Выматаўся. У адным эпізодзе трэба было ўпасці тварам на мурашнік. Прыемнага мала. На чарговым дублі ляжу і чакаю каманду "стоп". Здымалі буйна. Каманды няма, відаць, рэжысёр вырашыў на хаду памяняць ракурс, пашырыць кампазіцыю кадра. Адчуваю нясцерпны сверб — да болю. Трываю. Пасля каманды "стоп" асістэнты рэжысёра агледзелі шыю і... выцягнулі вялізнага кляшча, які паспеў глыбока ўсмактацца ў цела... Тут да месца сказаць, што знаёмства з Андронам Міхалковым-Канчалоўскім, якое адбылося ў ягоным кабінеце на "Масфільме", ледзь не спынілася на першым здымачным дні пад Калініным. Ды і ўвогуле, ён мне не глянуўся... Фрагмент аднаго фільма здымалі на дачы Сяргея Міхалкова. Пазнаёміўся з ягонай жонкай. Вось дзе сапраўды — сама жаноцкасць і чароўнасць. Спытаў: як ёй удалося так захавацца? Адказала, не думаючы: "Я ніколі не ведала трох рэчаў: дзе ў мяне пячонка, дзе сэрца і дзе муж".

— Палохаюць альбо раздражняюць вас каманды "Пачалі!", "Стоп!"?

— О! Яшчэ як! Упершыню пачутую каманду "Матор!" і "Пачалі!" я буду помніць да канца дзён сваіх, але — гэта асобная гаворка. А што датычыць тэхналогіі здымачных пляцовак, стварэння, так сказаць, нармальнага творча-дзелавога мікраклімату... Трэба мяняць атмасферу. Павышаць культуру кіназдымачных груп. Чуў, што калі амерыканскі акцёр Стайгер здымаўся ў Бандарчука ў ролі Напалеона, яго запрасілі на здымачную пляцоўку, ён увайшоў у кадр і раптам нехта са "светлякоў" папрасіў адну хвілінку — паправіць святло. Акцёр даведаўся аб прычыне затрымкі, сеў у машыну і паехаў у гасцініцу, сказаўшы перакладчыку, каб перадалі рэжысёру: "Калі будзе гатовы, няхай паведаміць. Акцёр даўно гатовы". Гэта не капрыз суперзоркі — гэта павага да сваёй прафесіі. Бандарчуку давялося асабіста паехаць, прасіць прабачэння ў акцёра. У нас ж на кіназдымачных пляцоўках такі вэрхал, што часам дзіву даешся, як наогул здымаюць фільм. Крык, шум, гвалт. "Я — гатовы!". Я — не гатовы!" "Каго чакаем?" "Каго не чакаем?" Адны робяць выгляд, што плацяць за вельмі нялёгкую працу, другія... Робяць выгляд, што працуюць? Адным словам: шуму і крыку — аж занадта. Часам каманды "Матор!", "Пачалі!", "Стоп!" падаюцца з такой эмацыянальнасцю, што ствараецца ўражанне, быццам для рэжысёра ў гэтым — увесь сэнс таго, што адбываецца. Няхай зразумеюць мяне правільна. Я не хачу прынізіць ці зменшыць працу ніводнага чалавека здымачнай пляцоўкі. Але галоўная персона кадра — акцёр. І трэба старацца ствараць такую абстаноўку, каб акцёра нішто не раздражняла: ні касцюм, ні рэквізіт, ні святло. А асабліва — празмерныя крыкі.

— Працуючы на сцэне, на здымачнай пляцоўцы, ці адчуваеце раздваенне, г. зн.: дзейнічаеце і назіраеце, гаворыце і слухаеце адначасова? Дакладней: ці сочыце вы за гармоніяй дзеяння?

— А як жа? Абавязкова!

— Працуючы на сцэне з партнёрам, вы ідзяце па дзеянні ад партнёра (ягонага настрою, рытму, музычнасці тэкставага гучання і г. д.) або чакаеце рэпліку і незалежна ад таго, хто і як іграе — выбудоўваеце малюнак вобраза свайго героя?

— Усё творчае жыццё ішоў ад партнёра! Гэтаму мяне вучылі і ў вучылішчы, і ў Кемераве, і ў Горкім...

— Многія крытыкі і рэжысёры называюць вас акцёрам выключнай інтэлектуальнай сілы, акцёрам-мысляром на сцэне. Як вам гэта ўдаецца?

— Гэта гучна сказана. Аднойчы на гастролях у Ленінградзе на спектакль "Юпітэр смяецца" прыйшла адна старая актрыса. Добрая актрыса. Пасля спектакля яна зрабіла мне своеасаблівы камплімент: "Добра падманваеш... Ты часам бываеш вельмі разумным". І ўспомніла да месца Ленскага, які некалі сказаў, што артыст — калі занадта доўга думае або занадта разумны — ужо не артыст.

Правільна! Артыст павінен умець — быць! Тэатр — гэта гульня! Хто не гуляе — той прайграе!

...Збоку відней. Калі атрымліваецца — значыць папрацаваў ад душы. Як? На гэта адказаць амаль немагчыма. А як спяваюць? Як музыкуюць? Як адсякаюць лішняе? У кожнага свой падыход, свае тайны. Я — не выключэнне.

— Працуючы над вобразам, вы стараецеся аднавіць у памяці ўбачанае? Скапіраваць яго? Альбо вы ідзяце ад сябе?

— Толькі ад сябе, з сябе. Я не веру ў тэорыю — шукаць героя ў калгасе. Артыст, калі ён, вядома, артыст, як і пісьменнік, расказвае... пра сябе і толькі пра сябе. Нягледзячы ні на тэкст, ні на рознасць эпох, я заўсёды бачу ў вобразе толькі самога сябе. Два разы зрабіў выключэнне, здрадзіў свайму прынцыпу: першы — у спектаклі І. Друцэ "Свята душы". Герой быў падобны на майго дзеда-малдаваніна. Іграў дзеда. Успомніў яго манеру размаўляць, рухацца, жэстыкуляваць, дачыняцца з іншымі... Гэтая роля ў тэатры імя Маякоўскага была адна з любімых. Аднойчы ў Адэсе я паехаў у вёску, выйшаў з машыны каля хаты, дзе жыў дзед — там у той час жыў яго сын, мой дзядзька — Антон. Дзядзька, убачыўшы мяне, крыкнуў жонцы на поўным сур'ёзе: "Клава, дывісь! Дзід Дзімітры прыіхав!" Гэта была для мяне самая высокая, ухвальная рэцэнзія...

...Другі раз — у спектаклі "Ляцяць пералётныя птушкі". Я не мог... пазбавіцца ад вобразу свайго цесця. Роля была напісана нібыта з яго. І я нібы ўнутрана прысвяціў гэтую работу шчыра паважанаму мною чалавеку.

— Звычка строіцца, пазіраваць, прыцягваць увагу ўласціва амаль усім акцёрам, ад пачаткоўцаў да вялікіх. Гэта зразумела: пастаяннае знаходжанне на вачах у публікі, выдаткі прафесіі. Чаму гэтых выдаткаў зусім няма ў вас?

— Відаць, таму, што сама прырода не дазваляе спекуляваць патаемным. Павінен прызнацца, я пакутліва, асабліва ў маладыя гады, саромеўся сваёй прафесіі. На пытанне "дзе вы працуеце?" ніколі не адказваў дакладна. Прыдумваў, хлусіў. Не люблю канцэрты. На эстрадзе адчуваю сябе голым. Неяк ляцім з Кемерава ў Маскву з адным, відаць па вопратцы, чыноўнікам: дублёнка, шапка пыжыкавая. Прыстаў: адкуль я вас ведаю? Вядома, ён бачыў мяне на сцэне. У той час тэатр у Кемераве, асабліва прэм'ерныя спектаклі, ніхто не прапускаў. За час палёту той "чыжык-пыжык" празумкаў мне ўсе вушы, дамагаючыся, дзе мы з ім маглі сустракацца. Назваў усе дэфіцытныя базы горада, усе падазроныя месцы і лазні... Пра тэатр нават і не згадаў. Так я яму і не адкрыўся. Быў яшчэ і такі выпадак, калі зрабілася па-сапраўднаму сорамна, і я не змог нічога адказаць. Дырэктар Кемераўскага тэатра, грэчаскі яўрэй, неяк на поўным сур'ёзе, з гэтакім прыкрым спачуваннем пытаецца: "Вось пагляджу я на цябе і думаю: усё пры табе ёсць, прырода не пакрыўдзіла... Дык няўжо табе не сорамна крычаць?.. Крычаць кожны дзень адно і тое ж? Столькі ў свеце цікавых прафесій... А тут? Крычы і крычы!" Я не ведаў, што яму адказаць. Помню, сапраўды было сорамна...

— Вас называюць акцёрам, які валодае майстэрствам пераўвасаблення. Наколькі мне вядома, вы амаль не карыстаецеся грымам. Скажыце, ці памагаюць вам наклейкі, прычоскі і іншае?

— У пачатку карыстаўся актыўна ўсім: грымам, парыкамі, гумозай. Правільна знойдзены грым заўсёды выклікае цэласнасць унутранага самаадчування. Бывалі і такія ролі, дзе без грыму проста немагчыма. У "Васілісе Мяленцьевай" я іграў Івана Грознага. Як жа без грыму? Павінен быць падобным, хоць знешне. Цікавы быў грым у "Саборы Парыжскай маці боскай". З задавальненнем іграў Квазімоду. Купіў у аптэцы пратэзнае вока. Сваё адно заклейваў, а тое умацоўваў на ўзроўні дзюбкі носа. Выгляд быў незвычайны. Самому было страшна. Сашка, сын, не вытрымліваў — плакаў. У ролі Квазімоды я надаваў шмат увагі знешняму малюнку: акрамя грыма — гарбу, кульгавасці. Ляцеў на сцэну з верхняй ложы на канаце пад аглушальны гук звона. Эфект! Да Квазімоды я двойчы сыграў Леніна. Іграю Квазімоду, а да мяне падыходзяць сябры і кажуць: "Валодзя, ты чаму картавіш?.." У тэатры грымам карыстаўся з задавальненнем. Апошні парык надзяваў у "Рычардзе III". У кіно таксама былі гістарычныя вобразы: Шаўмян, Нарыманаў, складаны грым рабілі, асабліва на пробах, Савінкаву. Дзякуй грымёрам. Іх праца сыграла, я б сказаў, ці не галоўнае значэнне пры зацвярджэнні. Тут да месца сказаць і пра касцюм. Касцюм, на мой погляд, з'яўляецца адным з асноўных кампанентаў. Нездарма ў даўніну на тэатры надавалася вялікая ўвага "абжыванню касцюма". Касцюм — гэта сутнасць чалавека, персанажа, героя.

— Ці была ў вашай творчай біяграфіі роля, у якой увасобіўся ўвесь акцёрскі персанал і вы адчулі, што ўзняліся да самых вяршыняў тэатральнага мастацтва?

— Што да вяршыняў, дык не мне пра іх меркаваць. І наогул, вяршыні — справа спартсменаў. Акцёру ў кожнай вялікай або малой ролі даводзіцца пераадольваць шмат прыступак і іншых перашкод на шляху стварэння вобраза. Але наконт ролі... Рычард.

— Працуючы над тэкстам ролі, ці дапускаеце вы скарачэнні або перастаноўкі?

— У Астроўскага гэта зрабіць немагчыма. Парушаецца ўнутраная музычнасць тэксту і ўся дынаміка партытуры кавалка, фрагмента, сцэны. А вось іграў я ролю аднаго пенсіянера, былога франтавіка, нястомнага шукальніка праўды-маткі. Герой прыязджае да сябра, прафесара, дырэктара сур'ёзнага інстытута, па дапамогу. Таксама галоўная дзейная асоба ў п'есе. Увесь другі акт мы з ім мусім высвятляць, што ў жыцці з намі здарылася. А ў жыцці пазасцэнічным здарылася так, што акцёр, які іграе майго сябра, забыўся, што ў яго ўвечары спектакль. Трэба пачынаць другі акт, акцёра ў тэатры няма. Пачалі ў спадзяванні, што вось-вось падыдзе. Ужо і час яго з'яўлення на рэпліку. Я — на сцэне з ягонай жонкай па п'есе. Невялікая паўза. Я гучна кажу, каб чула памрэж за кулісамі: "Штосьці Коля твой затрымліваецца..." Актрыса разумее маю "ігру выратавання становішча" і гэтак жа знарочыста гучна — перш за ўсё да памрэжа: "Так! Час яму быць! Пайду гляну... Можа, ён на кухню прайшоў!" І ідзе за кулісы, пакінуўшы мяне аднаго на сцэне. Я доўга, уважліва разглядваў кватэру, у якой жыве мой франтавы сябар, нават уключыў імпартны магнітафон, а ён, як ні дзіўна, зайграў, прайшоўся раздругі, азіраючыся. Уваходзіць актрыса-жонка і кажа: "Званіў Коля, ён затрымліваецца...", а сама мне на вуха шэпча: "Акцёра ў тэатры няма!" Тады я кажу: "Ну, што ж, затрымліваецца, дык і няхай". Я вось чаго да вас прыехаў..." І прамаўляю тэкст, які я павінен быў гаварыць свайму сябру, ягонай жонцы. Яна мне падтаквае. І — сыгралі ўвесь другі акт. Апладысменты былі. Сябры віншавалі: "Як ты хораша іграў". Ніхто не заўважыў адсутнасці персанажа. Вось такая ў нас сучасная драматургія.

— Ці лёгка вы працуеце над засваеннем тэксту?

— Цяжка. Я ўзяў сабе даўно за аснову: не прамаўляць тэкст, пакуль не адкажу сабе на пытанні ўсе: што, адкуль, навошта і чаму? Працую да прэм'еры. Што тычыцца гукавых фарбаў, адценняў, яны могуць з'яўляцца да бясконцасці, у залежнасці ад настрою і нават надвор'я.

— Ці любіце вы імправізаваць?

— У прынцыпе люблю. Дарэчы, адзіны спектакль "Гульня ў джын", дзе я кожны раз спрабую іграць па-рознаму. Гэта называецца — купацца ў матэрыяле. Каб мы не гаварылі пра тэатр, пра яго многія негатыўныя з'явы, але, калі акцёру надараецца выпадак падобнага "купання" — гэта найвысокая асалода ў прафесіі. Дзеля гэтага варта пражыць усё жыццё ў тэатры, калі нават у цябе нічога вартага не было, а здарыўся гэты цуд адзін раз у жыцці.

— Вы пражылі вельмі багатае творчае жыццё і яшчэ ў добрай форме. Што б вы хацелі пажадаць самі сабе ў гэтыя гады?

— Смеласці, і ў нейкай меры, калі хочаш — мужнасці: своечасова пайсці з тэатра... Я не прыхільнік тых, што марылі і мараць памерці на сцэне. У тэатра ёсць няпісаны закон: своечасова — прыйсці, своечасова — прайсці і своечасова — пайсці...

НАШ ЧАЛАВЕК У ФЛАРЫДЗЕ

Яну ПЯТРОЎСКАМУ — 90

Багатая слуцкая зямля на таленты. Апошнім часам да імён літаратараў, якія былі, як кажуць, ці не ў кожнага на слыху, дабавіліся і імёны тых, пра каго не адно дзесяцігоддзе маўчалі. Гэта пакутнікі, для каго другой радзімай стала замежжа — Янка Золак, Міхась Кавыль, Рыгор Казак, Уладзімір Клішэвіч і іншыя. У гэтай кагорце — і Ян Пятроўскі, якому 20 студзеня спаўняецца 90 гадоў.

Пачалася ж жыццёвая дарога Яна Дзям'янавіча ў Слуцку. Бацька рана памёр. У 1919 годзе маці разам з сынам і дзвюма дочкамі выехала ў Вільню, дзе Ян скончыў гімназію, пасля служыў у польскай арміі. Затым скончыў Тэалагічную школу метадыстаў, працаваў год у Варшаве і чатыры ў Дзярэчыне (Зэльвенскі раён), дзе ці не ўпершыню па-сапраўднаму палюбіў родную беларускую мову. Дарэчы, размяняўшы дзевяты дзесятак гадоў, Ян Дзям'янавіч возьмецца за ўспаміны, напіша і выдасць у ЗША тры тамы "Мемуараў", у якіх знойдзецца месца і жыццю ў Дзярэчыне, і шмат якім іншым выпадкам з яго такога багатага і шматграннага жыцця.

Да пачатку другой сусветнай вайны служыў пастырам у Варшаве, але ў сакавіку 1941 года пераехаў у Германію. Далейшы шлях ляжаў у Аўстралію, ЗША, дзе Я. Пятроўскі жыве з 1953 года ў невялікім горадзе Гейнсвіль штата Фларыда.

З юначых гадоў зацікавіўшыся вывучэннем розных моў, ён з гадамі не растраціў гэтай прагі да духоўнага наталення. Ведае ўкраінскую, польскую, нямецкую, чэшскую, англійскую і іншыя мовы. А, безумоўна, на першым плане — беларуская.

Яшчэ падчас знаходжання ў Германіі, у 1949 годзе Я. Пятроўскі выпусціў па-беларуску паштоўкі, прысвечаныя Ф. Скарыне і Дню 25-га Сакавіка. З 1962 па 1966 год выдаваў газету "Светач Хрыстовае навукі".

І ўсё ж асноўныя набыткі Я. Пятроўскага — у перакладзе. У ЗША ён выдаў у перакладзе на беларускую мову шэсць кніг дыялогаў грэчаскага філосафа Платона. Акрамя таго, Я. Пятроўскі пераўвасобіў па-беларуску працу нямецкага філосафа К. Гумбальта "Унутраная форма мовы", выдаў трохтомнік "Лепшыя думкі чалавека", двухтомны "Грэцка-беларускі слоўнік".

Адным словам, жыве ў далёкай Фларыдзе наш чалавек, які так шмат робіць, каб жыло беларускае слова, каб шырылася колькасць кніг на адной з самых прыгожых і старажытных моў свету.

Хацелася б, каб гэтыя віншаванні дайшлі да спадара Пятроўскага. Каб ён даведаўся, што яго на Радзіме ведаюць, памятаюць і любяць.

НАШ КАЛЯНДАР

Споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння вядомай балерыны, заслужанай артысткі Беларусі Раісы КРАСОЎСКАЙ. Аматары харэаграфічнага мастацтва ведаюць яе не толькі як адну з вядучых у свой час характарных танцоўшчыц у спектаклях ДАВТа. ("Святло і цені", "Пасля балю" Г. Вагнера, "Мара", "Выбранніца" Я. Глебава, "Спячая красуня" П. Чайкоўскага, "Дон Кіхот" Л. Мінкуса і інш.). Гэтае імя звязана таксама з гісторыяй стварэння і поспеху мінскага эстрадна-харэаграфічнага ансамбля "Чараўніцы", дзе рэалізаваўся талент Красоўскай як балетмайстра-рэжысёра. Нагадаем, што арганізатарам і кіраўніком ансамбля "Чараўніцы" быў муж артысткі, вядомы танцоўшчык і педагог Мікалай Красоўскі.

Народнаму артысту Беларусі Зіновію БАБІЮ 27 студзеня было б 60... Яго выдатны, "італьянскі" тэнар на працягу амаль 15 гадоў гучаў у спектаклях Акадэмічнага тэатра оперы і балета Беларусі. Добра ведала спевака публіка ў тэатрах Кіева ды Львова, дзе яму давялося працаваць на пачатку творчага шляху. У ягоным рэпертуары былі партыі Вертэра (аднайменная опера Ж. Масэнэ), Каніё ("Паяцы" Р. Леанкавала), Жэрмона, Радамэса ("Травіята" ды "Аіда" Д. Вердзі), Каварадосі ("Тоска" Д. Пучыні), Германа ("Пікавая дама" П. Чайкоўскага), Сяргея ("Алеся" Я. Цікоцкага) ды інш. Заўсёдны поспех мелі камерныя канцэртныя праграмы З. Бабія. Зямное жыццё артыста раптоўна абарвалася ў 1984 годзе. Але яго непаўторны голас, які захаваўся ў "залатым" фондзе Беларускага радыё, усё гэтак жа гучыць у эфіры, нагадваючы пра цудоўны дыямент нашай музычнай культуры...

Віншуем!

Юрыю СТАНКЕВІЧУ — 50



Юры Станкевіч (сапраўднае імя Георгій) — родам з Барысава. Рана далучыўся да працоўнага жыцця. З пятнаццаці гадоў працаваў на заводах і фабрыках роднага горада. Вучобу працягваў у вячэрняй школе. Без адрыву ад вытворчасці атрымаў вышэйшую адукацыю — скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Быў супрацоўнікам рэдакцыі барысаўскай аб'яднанай газеты "Камуністычная праца", затым перайшоў у часопіс "Маладосць". Цяпер — рэдактар аддзела крытыкі часопіса.

Як празаік, публіцыст, вядомы па публікацыях у той жа "Маладосці", "ЛіМе", іншых перыядычных выданнях. На ягоным рахунку — дзве кнігі прозы: "Луп", што выйшла ў "Бібліятэцы часопіса "Маладосць", і "Анёлы на бальшаку" — яе выпусціла выдавецтва "Мастацкая літаратура".

Прыцягнула ўвагу аповесць Ю. Станкевіча, што дала назву першай кнізе пісьменніка. У гэтым творы ён змог пераканаўча паказаць, як, здавалася б, невялікія маральныя і экалагічныя праблемы ўплываюць на жыццё ўсяго жывога, а лёс "братоў нашых меншых" — гэта, калі глядзець шырэй, і лёс самога чалавека, які тысячамі нябачных ніцяў паяднаны з прыродай.

Аповесць "Жудасны звер Гру" — па-свойму пераўвасоблены аўтарам міф пра Арфея і Эўрыдыку. У гэтай аповесці асэнсоўваецца тэма кахання, закранаюцца праблемы жыцця сучаснай моладзі.

Ад вострых праблем Ю. Станкевіч не адыходзіць і ў сваіх апавяданнях, хоць адначасова робіць спробу зазірнуць у мінулае. Прынамсі, гістарычная праблематыка закранаецца ў апавяданні "Пераправа".

Што тычыцца яго публіцыстычных выступленняў, дык яны, як правіла, прасякнуты адраджэнскім зместам. Ю. Станкевіч узнімае голас у абарону беларускасці, выступае супраць тых, хто цураецца матчынай мовы, асуджае нацыянальных нігілістаў і сучасных прыстасаванцаў.

Віншуем Георгія Васільевіча з поўднем веку! Жадаем яму моцнага здароўя і вострага пяра!

ДЫК ДЗЕ "ХАОС"?

(Пачатак на стар. 6-7)

дакладна ацэньваць варыянты нормы і адхіленні ад яе ў маўленчай практыцы народа, а таксама павышаць навуковы ўзровень і культуру мовы сваіх публікацый, каб не памнажаць нікому непатрэбнага "хаосу".

Беларускім лінгвістам усе савецкія дзесяцігоддзі даводзілася балансаваць паміж рэальным станам і штодзённымі патрэбамі мовы і той гістарычнай перспектывай, "грамадскай неабходнасцю" (К. Крапіва), якую ёй абмалявалі тэарэтыкі "зліцця-злівання" нацый.

Як нейкае ліхое наканаванне: толькі пачынае мова падаваць прыкметы жыцця — адразу актывізуюцца розныя антыбеларускія сілы. Гэтак было ў 20-я гады, калі добрая спроба вярнуць мову ў дзяржаўны, грамадскі, навуковы ўжытак скончылася масавым разгонам і вынішчэннем самых свядомых і дбайных удзельнікаў нацыянальнага Адраджэння.

У канцы 60-х—пачатку 70-х гадоў была бліснула маленькая надзея на ўвагу да мовы ў сувязі з падрыхтоўкай і выданнем Беларускай Энцыклапедыі. Згуртаваныя вакол гэтай пачэснай і высакароднай справы энтузіясты (П. Глебка, Г. Гарэцкі, Я. Скрыган і інш.) паказалі ўзор сумленнай працы з родным словам, дастасоўваючы яго да патрэб навуковага выкладу. Гэта яскрава засведчыў выхад першых тамоў БелСЭ.

Але як тут заварушыліся служакі з ідэалагічных устаноў! Не перастаючы балбатаць пра небывалы росквіт нацый і нацыянальных моў, яны робяць тэрміновыя захады, каб не дапусціць рэальнага ажыўлення беларускай мовы. Арганізуюцца выступы ў друку, закрытыя водгукі (К. Крапіва, А. Жураўскі, Р. Клюсаў і інш.). Разлік і почырк ранейшы, езуіцкі: мовазнаўцы самі мусяць ганьбіць тыя "нацыяналістычныя" словы і сінтаксічныя канструкцыі, якія імі зацвярджаліся на Тэрміналагічнай камісіі БелСЭ (К. Крапіва — старшыня камісіі, у ліку яе членаў — М. Бірыла, М. Лобан, М. Суднік).

Цяжка паверыць, што гэта маглі рабіць людзі, закліканыя служыць беларускай навуцы і культуры. А можа, не сам ці не адзін К. Крапіва пісаў той "гістарычны" артыкул? Засумняваўся ж Б. Сачанка: "Чытаў, вядома, і яго [Крапівовы] артыкулы па пытаннях мовы, не надта верачы, што пісаў ён іх сам... Надта ж казённым, не яго, крапівоўскім, духам патыхала ад іх". ("Полымя". 1993, N 1).

У 70-я гады накіроўцы беларускай лінгвістыкі ўбачылі "хаос" у натуральным працэсе развіцця лексічнай сістэмы. Тады мясцовыя гаворкі былі ці не адзінай крыніцай папаўнення літаратурнай мовы самабытнай лексікай (спецсховы былі яшчэ пазачыняны). Значыць, трэ было хутчэй закруціць кран на гэтым "словаправодзе". Вось чаму такое раздражненне і абурэнне выклікала ў "вядучых" лінгвістаў сапраўды народная, гранічна натуральная мова І. Пташнікава.

Проста дзіва, што пад крытычнае вока і гнеўнае пяро акадэмічных нармадаўцаў не трапіў Р. Барадулін. Ён жа таксама на поўніцу, з вялікім мастацкім плёнам чэрпаў з моўных скарбаў роднай Вушаччыны, прагна дапаў да нерушу матчынага слова. "Чыстка" мінула паэта, відаць, таму, што ён ужо з 50-х гадоў усталяваўся ў свядомасці беларускага чытача як майстар самабытнай мовы, якая дасягаецца ў вялікай меры індывідуальнай словатворчасцю. А наватворы ж і тады былі "ўзаконеныя", кваліфікаваліся як неадымная рыса мастацкай мовы. Да таго ж пільныя "вартавыя слова" неяк не разгледзелі, што сярод так званых аўтарскіх неалагізмаў — вялікая доля слоў мясцовых, дагэтуль не ўжываных у літаратуры. Яны арыгінальна загучалі ў вершах Р. Барадуліна і надалі свежасці і моцы нашай мове. Дарэчы, і сёння бывае нялёгка пазнаць, дзе паэт бярэ з народна-дыялектнай мовы, а дзе стварае сам. Нядаўна, перакладаючы верш М. Лермантава, ён ужыў дасюль невядомае літаратурнай мове слова *аброў* як адпаведнік рускага утёс.

Цяперашні правадзейны корпус дактароў-філолагаў, прафесароў-мовазнаўцаў выхоўваўся ў пасляваенны час на традыцыях (моўнай палітыцы) 30—50-ых гг., калі тэорыя і практыка рускай мовы жыўцом пераносілася на мову беларускую. Навуковая праца нярэдка зводзілася да напаўнення гатовых схем аналізу "мясцовым" матэрыялам, ілюстравання гатовых вывадаў, калькавання, а то і пераносу рускай тэрміналогіі. Што не адпавядала схемам, тое ігнаравалася або залічвалася да застарэлага або дыялектнага. Так гублялася спецыфіка мовы. Вядома, напрыклад, што ў рускім мовазнаўстве моцная традыцыя "забароненасці" — недапусканне ў вышэйшыя, кніжныя стылі сродкаў гутарковай мовы. На гэта ёсць падставы: у рускай мове існуе выразная стылістычная дыферэнцыяцыя моўных сродкаў. Перанесеная ж нятворча на беларускую глебу гэтая "арыстакратычнасць" густу ставіць пэўную перашкоду на шляху слова, формы, сінтаксічнай канструкцыі з жывой гутаркі ў пісьмова-літаратурны ўжытак. Значнае адлюстраванне гэтая з'ява знайшла ў акадэмічных і школьных граматыках і слоўніках.

Усталяванне ў навуковым свеце — абарона доктарскай, атрыманне звання прафесара — у многіх філолагаў-лінгвістаў адбывалася ў перадпенсійным узросце. Здабыўшы жаданыя ступені, званні, але не паспеўшы пакарыстацца з іх, яны стараюцца як найдаўжэй затрымацца ў навуковых і навучальных установах. На базе такіх жыццёва канкрэтных інтарэсаў і "задач" яны салідарызуюцца, аб'ядноўваюцца і сустракаюцца ў розных камісіях, рэдкалегіях, навуковых радах.

Сярод беларускіх мовазнаўцаў, бясспрэчна, ёсць здольныя людзі, якія і абараніліся ў пару, і паспелі стварыць сабе імідж вядучых вучоных. Яны вырашаюць важныя пытанні жыцця і функцыянавання мовы (кадыфікацыя літаратурных нормаў, удакладненне правапісу і г. д.), не выпускаючы з-пад увагі канчатковае мэты нацыянальнай палітыкі... Ім дружна дапамагаюць "прыпазнелыя", імітуючы актыўнасць і навуковую глыбакадумнасць дзеля хоць позняга, а ўсё ж "прызнання". Праз такі мур-сцяну цяжка прабіцца таму новаму, што нараджаецца практыкай зносін, дыктуецца вымогамі паўнакроўнага функцыянавання беларускай мовы.

На заканчэнне хацеў бы заклікаць мовазнаўцаў, журналістаў, пісьменнікаў з большай развагай успрымаць і ацэньваць зрухі ў мове і не ўздымаць "ляманту" і панікі там, дзе мае быць увесьчасная спакойная зацікаўленая праца дзеля жыцця і роскві роднага слова.

ЗАБЛЫТАНЫЯ КАРАНІ

(Пачатак на стар. 5)

мове: нават "зашыфраваная" ў мастацкую алегорыю нацыянальная ідэя знаходзіла водгук у сэрцах беларусаў. "Шляхціц Завальня", з'явіўшыся ў той час па-беларуску, быў бы ўсяго толькі фальклорным зборнікам, у лепшым выпадку накшталт зборнікаў А. Сержпутоўскага.

Перад В. Дуніным-Марцінкевічам, як і перад іншымі літвінамі, аказалася невырашальная задача: хто я — літвін ці беларус? Уся гісторыя нібыта сведчыла на карысць літвінскага паходжання, аднак сёй-той з літвінаў падсвядома цягнуўся да шматмільённага вясковага люду. Створаная палітыкамі блытаніна ў найменнях падзяліла адзіны народ на беларусаў і літвінаў ды штурхала яго ў розныя бакі. І толькі напрыканцы XIX стагоддзя, калі бар'ер між беларусамі ды літвінамі стаў непераадольным (бо зніклі ў віхурах 1863 года тыя, хто спалучаў у сабе два гэтыя пачаткі), літвін пачаў канчаткова атаясамлівацца з жамойтам. Гэтаму спрыяла і афіцыйная палітыка царызму.

Але да 1864 года літвінская ідэя была ў больш блізкіх дачыненнях з беларускай ідэяю, чым з жамойцкай. Прадстаўнікі літвінскага руху не вялі ідэалагічнай вайны з беларускім нацыянальным рухам. Як найлепшае сведчанне гэтаму — "Альбом" А. Вярыгі-Дарэўскага.

Таму непераканаўча гучыць думка А. Латышонка, што "беларуская нацыянальная ідэя (...) несумяшчальная з літоўскаю". Сёння больш правільна гаварыць пра беларуска-літвінскую ідэю. І першая, і другая нацыянальныя ідэі грунтаваліся на адным менталітэце, на адных і тых жа нацыянальна-культурных і духоўных каштоўнасцях.

Памылковай трэба лічыць трактоўку А. Латышонкам рэвалюцыйнай і публіцыстычнай дзейнасці К. Каліноўскага. Нельга на шалі вагаў Гісторыі кідаць тое, што было, і тое, што магло б быць, каб пасля сцвярджаць: паўстанне 1863 года прынесла шкоду развіццю беларускага руху. Даруйце, але ж К. Каліноўскі — гэта толькі адзін шлях развіцця беларускага руху. Быў жа яшчэ адзін — шлях Міхайлы Каяловіча, шлях згодніцтва з царызмам, шлях, які вёў да з'яўлення "истинно русских людей". І ці ж можна адназначна сцвярджаць, што менавіта К. Каліноўскі падштурхнуў беларусаў на шлях "западноруссизма"?

На нашу думку, К. Каліноўскі свядома ахвяраваў сабою. Гераічны чын гэтага чалавека не даў знікнуць у беларускім народзе духу волі. У выніку беларуска-літвінская нацыянальная ідэя ўвабрала ў сябе думку пра дзяржаўную незалежнасць краю. Менавіта з гэтага часу ідэя самастойнага існавання дзяржавы на нашых землях атрымала беларускае гучанне. Неспрыяльныя палітычныя ўмовы апошняй трэці XIX—пачатку XX стагоддзя прымусілі гоманаўцаў (1884) і нашаніўцаў (1906—1915) высунуць на першы план ідэю аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі, але калі сітуацыя змянілася, беларускія дзеячы вярнуліся да ідэі К. Каліноўскага.

Увогуле ж пытанне станаўлення і развіцця беларускай нацыянальнай ідэі патрабуе больш шырокай гаворкі. Памераў артыкула недастаткова, каб аргументавана вытлумачыць усе аспекты гэтай праблемы.

Мікола ХАУСТОВІЧ

1945 -1995

З ВАЙНОЙ НЕ СКОНЧАНЫ РАХУНКІ

"Тогда считать мы стали раны, товарищей считать..." Калі — тады? Лермантаўскія героі зрабілі гэта адразу пасля Барадзінскай бітвы, на яшчэ прапахлым парахавым гарам полі. Салдаты другой вайны, Вялікай айчыннай, не ведалі і не ведаюць дагэтуль, колькі іх баявых таварышаў зжэр малох вайны. Але самае страшнае, што дзесяткі, сотні тысяч іх дагэтуль не пахаваны. У тым ліку і ў нас, на Беларусі. А колькі воінаў хоць і пахаваны, але — у наспех выкапаных магілах, ад якіх ужо праз пару месяцаў не заставалася следу. Колькі іх схавала зямля і хто яны, мы не даведаемся ўжо ніколі.

Толькі за першы тыдзень баёў, да першага ліпеня 1941 года, войскі Заходняга фронту страцілі забітымі больш за 500 тысяч чалавек (77 працэнтаў штатнай колькасці). Калі ж улічыць, што ў першыя дні вайны на тэрыторыі Беларусі ў рэгулярную армію было мабілізавана больш як 400 тысяч чалавек і большасць з іх загінула, так і не трапіўшы ні ў якія спісы, дык можна меркаваць, што колькасць страт перавысіць 650 тысяч чалавек. Дакладную лічбу загінуўшых на Беларусі ў пачатковы перыяд вайны ўстанавіць практычна немагчыма, як немагчыма дакладна вызначыць нават месцы масавых пахаванняў. Гэта ў першую чаргу тлумачыцца тым, што выканаць загад народнага камісара абароны N 138 ад 15 сакавіка 1941 года аб парадку пахавання загінуўшых у баях ва ўмовах, калі тэмп наступлення нямецкіх войск даходзіў да 200 кіламетраў у суткі, — было практычна немагчыма. Такім чынам, сотні тысяч савецкіх воінаў так і засталіся непахаванымі і нават безыменнымі.

Ад пачатку вайны сплыло больш за паўстагоддзя. За гэты час на самых розных узроўнях дзяржаўнай улады было прынята нямала пастаноў аб неабходнасці ўвекавечання загінуўшых. І кожны раз здавалася, што вось ужо цяпер іх удасца вырваць з палону забыцця. Але праходзілі месяцы, гады, а ўсё заставалася па-ранейшаму. Сярод тых дакументаў назавём адзін з апошніх, а менавіта пастанову Савета Міністраў БССР N 763 "Аб увекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў", якая выйшла 21 снежня 1992 года. У адным з пунктаў яе гаварылася, што "... увекавечанне памяці... праводзіцца спецыяльнымі воінскімі падраздзяленнямі з удзелам грамадскіх пошукавых аб'яднанняў". Такія воінскія падраздзяленні ў рэспубліцы так і не былі створаны, а ўся работа ў гэтым напрамку была ўскладзена на грамадскія арганізацыі, якія не мелі ні належных сродкаў, ні вопыту.

Затое на месцах былых баёў сёння праяўляюць зайздросную актыўнасць "шукальнікі" іншага кшталту, так званыя "трафейшчыкі", а прасцей кажучы — звычайныя мараздзёры, узброеныя сучаснымі імпартнымі прыборамі, якія дазваляюць беспамылкова на глыбіні 3—4 метраў адшукваць зброю, боеприпасы, іншыя выбуховыя рэчывы, якія зараз карыстаюцца павышаным попытам у пэўнай катэгорыі грамадзян. Пры раскопках пахаванняў яны шукаюць і залатыя вырабы, нарабаваныя акупантамі ў мясцовага насельніцтва, а таксама жэтоны нямецкіх салдат, якія потым за валюту прадаюць грамадзянам Германіі.

Дарэчы, ёсць яшчэ адзін нюанс, які сведчыць на карысць прыцягнення да пошуку астанкаў загінуўшых у мінулай вайне менавіта воінскіх падраздзяленняў. Справа ў тым, што мясціны, дзе некалі праходзілі жорсткія баі, літаральна нашпігаваны бомбамі, снарадамі, мінамі, якія тояць смяротную небяспеку, перш за ўсё для тых, хто праводзіць пошукавую работу на грамадскіх пачатках. Прывяду такі факт. Пры правядзенні не так даўно суцэльнага разміравання ў Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці сапёрамі было знойдзена і абяшкоджана 50526 выбуховых прадметаў.

Літаральна да апошняга часу дакладныя дадзеныя аб стратах асабовага складу Савецкай арміі ў гады Айчыннай вайны трымаліся ў сакрэце. Па сутнасці пад заслонай тайны трымаюцца гэтыя звесткі і сёння, хоць ваенныя гісторыкі і сцвярджаюць, што ўлік страт у нас заўсёды быў вельмі дакладны.

Сапраўды, 15 сакавіка 1941 года, акурат напярэдадні вайны, Нарком абароны СССР падпісаў загад, які ўводзіў у дзеянне Палажэнне "Аб персанальным уліку страт і пахавання загінуўшага асабовага саставу Чырвонай Арміі ў ваенны час". Паводле гэтага загаду, дарэчы, памечанага грыфам "Зусім сакрэтна", да першага мая 1941 года ўвесь асабовы састаў Чырвонай Арміі павінен быў атрымаць медальёны з укладышамі, на якіх указваліся кароткія біяграфічныя звесткі воінаў, а таксама месца жыхарства іх родных. Укладыш медальёна запаўняўся ў двух экземплярах. Адзін з іх у выпадку гібелі яго ўладальніка пахавальнай камандай з медальёна вымаўся і перадаваўся ў штаб часці або лячэбнай установы, дзе памёр паранены. Другі экземпляр заставаўся ў медальёне пры забітым. Адсюль вынікае, што выяўленне на месцах былых баёў медальёнаў з адным укладышам сведчыць пра тое, што пахаванне тут не было безыменным, і другі ўкладыш недзе захоўваецца.

Такім чынам, пахаванне загінуўшых на полі бою праводзілася не стыхійна (за выключэннем пачатковага перыяду вайны), а ў пэўным парадку, які зноў-такі рэгуляваўся раздзелам пятым нагаданага Палажэння.

У прыватнасці, для збору трупаў у месцах баёў загадам камандзіра палка прызначалася спецыяльная каманда (ва ўжытку яе часта называлі "пахавальнай"), у абавязкі якой уваходзіў пошук і рэгістрацыя (па ўкладышах медальёнаў) загінуўшых, збор і дастаўка іх на дывізійныя пункты пахавання.

Пасля заканчэння збору трупаў старшы каманды прадстаўляў у двух экземплярах спіс начальніку штаба палка з указаннем месца іх знаходжання. Да спісу прыкладалася дакладная схема размяшчэння магілы. Пахаванне праводзілася толькі ў маштабе дывізіі (брыгады) у братніх магілах. Згодна з патрабаваннямі адпаведных дакументаў магілы капаліся на глыбіню да паўтара метра, зверху насыпаўся магільны груд вышынёй да паўметра, які пакрываўся дзёрнам або каменем. На магіле ўстанаўлівалася піраміда, зробленая з дошак або каменя, на якой выпальваўся або пісаўся нумар магілы. Загінуўшы камандны састаў (ад камандзіра палка і вышэй) хаваўся ў драўляных трунах, астатні афіцэрскі састаў — у асобных магілах.

Акрамя таго, у кнізе пахавання супраць кожнага прозвішча дакладна вызначалася месца знаходжання загінуўшага ў магіле, упісваўся парадкавы нумар магілы і дакладна ўказвалася на талаграфічнай карце буйнога маштабу яе размяшчэнне. Па гэтай кнізе і сёння можна даведацца не толькі, дзе знаходзіцца магіла, а нават і размяшчэнне астанкаў у ёй. Адзін экземпляр карты з абазначэннем магілы высылаўся ва Упраўленне па ўкамплектаванні войск Генштаба Чырвонай Арміі разам са спісамі загінуўшых.

Такім чынам, улік сапраўды вёўся, але, праўда, толькі з лета 1943 года, калі нашы войскі перайшлі да наступальных дзеянняў. Можна сцвярджаць, што калі пахаванне не парушана, то і сёння можна дакладна вызначыць месца пахавання воінаў, якія загінулі пры вызваленні Беларусі ў 1944 годзе.

У 50—70-х гадах па ўказанні адпаведных партыйных і савецкіх органаў, якія лічылі, што ад наяўнасці такой вялікай колькасці пахаванняў можа стварыцца ўражанне аб вельмі вялікіх стратах нашых войскаў у гады Айчыннай вайны, пачаліся кампаніі (як правіла, перад чарговым юбілеем) па звядзенні пахаванняў (нярэдка з тэрыторыі ўсяго раёна) у адну брацкую магілу. У выніку такой акцыі, натуральна, парушаўся парадак размяшчэння астанкаў у пахаваннях, і сёння ўжо немагчыма іх ідэнтыфікаваць.

Для ўпарадкавання аховы месц пахаванняў пастановай Савета Міністраў РБ ад 21 снежня 1992 года былі забаронены ўсе віды работ, якія могуць стварыць пагрозу для воінскіх могілак. Што ж адбываецца на самой справе? Карты з дакладнымі каардынатамі месц пахаванняў знаходзяцца ў Цэнтральным архіве Міністэрства абароны РФ у г. Падольску, у нас няма дакладных звестак аб размяшчэнні многіх воінскіх пахаванняў на тэрыторыі рэспублікі. У выніку за імі ніхто не сочыць, і здараюцца выпадкі міжвольных ускрыццяў пахаванняў у час правядзення сельскагаспадарчых, будаўнічых і іншых відаў работ. Так што наспела пытанне аб перадачы ўсіх гэтых дадзеных нам, і вырашыць гэта трэба на міждзяржаўным узроўні.

У гэтым жа архіве, акрамя таго, ёсць звесткі пра больш чым 15 мільёнаў загінуўшых. Гэтыя дадзеныя даюць магчымасць іх сваякам упершыню за многія гады даведацца аб дакладным месцы пахавання іх блізкіх.

Шмат для вырашэння гэтых і іншых праблем зрабілі актывісты пошукавага руху мінчане Н. Трабянок і В. Лунёў. Але два чалавекі не ў стане зрушыць з мёртвай кропкі вырашэнне гэтых пытанняў.

За апошнія пяць гадоў членамі грамадскіх пошукавых груп, атрадаў і аб'яднанняў пры ракопках былі знойдзены астанкі больш 3 тысяч загінуўшых воінаў. Многа гэта ці мала? Для грамадскіх арганізацый, вядома, нямала, ды калі яшчэ мець на ўвазе, з якой рызыкай звязана правядзенне гэтых работ. Але калі ўлічыць, што многія пахаванні перыяду 1941 года дагэтуль з'яўляюцца безыменнымі, а ў іх жа, як мы гаварылі, па самых прыблізных разліках могуць знаходзіцца астанкі больш за 500 тысяч нашых воінаў, то гэта з'яўляецца кропляй у моры.

І. КУЗНЯЦОЎ,
кандыдат гістарычных навук

Памяць

НА ПОМНІК Г. КАХАНОЎСКАМУ

Краіны, што доўгі час былі пад прыгнётам таталітарызму, цяжка выходзяць на каляіну сапраўднага народаўладдзя. Беларусь не з'яўляецца выключэннем. Наадварот, у нашым выпадку справа ўскладняецца зародкавасцю дэмакратычных традыцый, трываласцю выхаваных камуністамі люмпенскіх настрояў, мала зменнай палітычнай сістэмай, створанай яшчэ пры аднапартыйным рэжыме. Аднак у цэнтры Еўропы не можа захавацца другая Куба, і край будзе рухацца да цывілізаванага грамадства, заснаванага на прынцыпах агульначалавечых каштоўнасцей, дзе без рэвалюцый і грамадзянскіх войнаў сфармуецца сацыяльна гарманічная, у межах дасягальнага, супольнасць. Толькі трэба ўсвядоміць, што такая супольнасць немагчымая без дэмакратыі, а апошняй не бывае ў калоніях. Таму так важныя сёння не толькі выхаванне дэмакратычнай ментальнасці, але і захаванне і ўмацаванне дзяржаўнасці Рэспублікі Беларусь.

Улічваючы ўсё гэта, група беларускай пераважна навуковай інтэлігенцыі заснавала Фонд сацыяльных ініцыятыў і даследаванняў імя выдатных беларускіх адраджэнцаў Івана і Антона Луцкевічаў. Прэзідэнтам фонду абраны акадэмік Радзім Гарэцкі. Гэта грамадская арганізацыя прызначаецца для вывучэння і прапаганды гісторыі, тэорыі і практыкі як беларускага, так і замежнага дэмакратычнага сацыяльнага руху, для даследавання праблем сучаснага сацыяльнага і культурнага развіцця і нацыянальнага адраджэння Беларусі. Сярод іншага фонд ставіць за мэту публікаванне лепшых здабыткаў еўрапейскай сацыял-дэмакратычнай думкі, а таксама творчай спадчыны дзеячаў беларускага адраджэння, пошукі і ўшанаванне мясцін, звязаных з іх жыццём. Надзённая задача фонду — стварэнне Беларускага народнага універсітэта з аддзяленнямі айчыннай гісторыі і гісторыі сусветнага сацыялістычнага і рабочага руху.

Сёння пачалася работа па стварэнні і ўстаноўцы помніка на магіле выдатнага беларускага вучонага і патрыёта Генадзя Каханоўскага, які так заўчасна пайшоў ад нас.

Аднак без грамадскай падтрымкі ажыццявіць задуманае будзе цяжка, асабліва без адпаведнага фінансавання адукацыйных праграм. Таму жадаючыя дапамагчы могуць пералічваць грашовыя ахвяраванні на разліковы рахунак фонду 700430 у АКБ "Дукат", код банка 767.

Пералічэнні на помнік Генадзю Каханоўскаму павінны суправаджацца адпаведнай дапіскай.

Міхась ЧАРНЯЎСКІ,
сябра рады Фонду сацыяльных ініцыятыў і даследаванняў імя братоў Луцкевічаў

ДЭМАКРАТЫЯ І ДЭМАС

(Пачатак на стар. 3)

вектар руху. У рэальнасці ж адносіны паміж свабодай і чалавекам складваюцца больш драматычна. Тое, што свабода неабходна для развіцця, зусім не азначае, што выбар заўсёды і абавязкова адбываецца на карысць свабоды. Больш таго, куды часцей людзі выбіраюць менавіта несвабоду.

Чаму так адбываецца?

Каб наблізіцца да разумення гэтага феномена, зірнём на характар узаемаадносін двух паняццяў — **свабоды і справядлівасці**. У масавай свядомасці яны звычайна стаяць побач, калі наогул не зліваюцца. І гэта правільна: свабода і ёсць вышэйшая праява справядлівасці, а справядлівасць магчыма толькі на грунце свабоды. Пытанне ў тым, **што** разумець пад справядлівасцю. Менавіта ў рознай трактоўцы гэтага паняцця і знаходзіцца нервовы вузел многіх гістарычных супярэчнасцей і калізій.

Справядлівасць у народным усведамленні асацыіруецца звычайна з ураўнілаўкай. Такая яе інтэрпрэтацыя робіцца асабліва відавочнай, калі народная стыхія выходзіць з берагоў і становіцца некіруемай. Нецярпімасць да ўсяго, што вышэй за сярэдні ўзровень, да ўсяго, што вышэй разумення масавай свядомасці, нянавісць да багацця — вось асноўны лейтматыў падобных рухаў. (У Англіі у перыяд рэвалюцыі нават існавала палітычная плынь, якая называла сябе ўраўняльнікамі).

"Спісы адабраны, пісцы знішчаны, кожны можа браць збожжа колькі захоча... Краіна круціцца, як ганчарны круг: высокія саноўнікі галадаюць, а гараджане вымушаны сядзець ля млына, знатныя дамы ходзяць у рызманах, яны галадаюць і не рашаюцца гаварыць. Рабыням дазволена балбатаць, у краіне рабаўніцтвы і забойствы. Ніхто больш не рашаецца ўрабляць зямлю... людзей становіцца ўсё менш, нараджальнасць скарачаецца. І ў рэшце рэшт застаецца толькі жаданне, каб усё гэта хутчэй скончылася. Няма ніводнай пасаднай асобы на месцы, і краіну рабуюць некалькі недалёкіх людзей царства. Пачынаецца панаванне галоты, яна ўзвышаецца над усімі, радуецца гэтаму па-свойму... У той час як тыя, хто не меў анічога, сталі багатымі, ранейшыя багатыя людзі ляжаць безабароннымі пад ветрам, не маючы пасцелі. Нават саноўнікі старой дзяржавы вымушаны ў сваім няшчасці запабягаць перад колішнімі жабракамі-выскачкамі". Так апавядае старажытнаегіпецкі папірус аб тым, што атрымліваецца, калі галота дасягае ўлады. Тое, што здарылася на берагах Ніла больш чым чатыры тысячы гадоў назад, ці не нагадвае падзеі 1917 года на берагах Нявы і Волгі?

Справядлівасць — гэта глыбока творчае, а значыць, іерархічнае паняцце. Сапраўдная справядлівасць супрацьстаіць усяму, што ўроўнівае, нівеліруе. Чым больш у грамадстве няроўнасці, тым больш яно справядлівае. Але толькі ў тым выпадку, **калі гэтая няроўнасць вырастае са свабоды.** У гэтым значэнні няроўнасць — бясконцая колькасць варыянтаў, калі кожны чалавек самастойна творыць свой лёс, зыходзячы са сваіх здольнасцей, магчымасцей, жаданняў. Такая няроўнасць не мае нічога агульнага з той няроўнасцю, якая існуе ў дэспатычных ці сацыяльна-каставых рэжымах, дзе яна з'яўляецца прымусовай, а таму нятворчай, несправядлівай і неэфектыўнай.

Многія, вельмі многія людзі адпачатку варожа настроены да такой справядлівасці, у аснове якой ляжыць няроўнасць. І гэтая сітуацыя прыводзіць да таго, што такі парадак даводзіцца ўтрымліваць сродкамі прымусу. Першапачаткова гэты прымус абапіраўся пераважна на непасрэдны дзяржаўны гвалт, падаўленне. Аднак паступова эвалюцыя сацыяльнай думкі, а ўслед за ёю і дзяржаўных інстытутаў дазволіла замяніць яго іншымі, больш гнуткімі і мяккімі метадамі: паявілася палітычная сістэма, якая здолела мірна інтэграваць у свае структуры асноўныя пласты грамадства, дзякуючы разумнаму сацыяльнаму курсу прымірыць асноўныя грамадскія страты з існуючым становішчам. Але гэта не мяняе саму сутнасць праблемы: непрыняцце часткай народа неўраўняльнай справядлівасці зберагаецца, працягвае жыць у яго калектыўнай падсвядомасці і кожны раз выходзіць напаверх, як толькі парушаецца статус-кво, рушыцца дасягнутая стабільнасць.

У гэтай сувязі важна зразумець, як успрымаецца чалавекам свабода. Гэтае ўспрыманне залежыць ад творчага ўзроўню асобы, яе накіраванасці на вышэйшыя духоўныя каштоўнасці. Таму калі народ у масе сваёй неадукаваны, дык у такім выпадку свабода разумеецца ім як нічым не абмежаваная вольніца. У Дастаеўскага ёсць такая думка: кажуць аб свабодзе, а маюць на ўвазе бунт. Гаворка ідзе пра тую прагу ўсёдазволенасці, якая дрэмле ў падсвядомасці чалавека і якая па вялікім рахунку не з'яўляецца свабодай. Па сутнасці, гэта свабода звера, выпушчанага з клеткі.

Крыху іншая сітуацыя ў цывілізаваным грамадстве, тут народ ужо прывучаны да высокіх жыццёвых стандартаў і разглядае свабоду як сродак для задавальнення сваіх патрэб. Сапраўдны сэнс свабоды тут у многім застаецца незапатрабаваным, яна набывае аднабаковы утылітарны ўхіл, стварае так званае грамадства спажывання. І калі, як гэта часцей за ўсё здараецца, пры пераходзе ад таталітарызму да дэмакратыі дрэва свабоды напачатку не прыносіць сакавітых пладоў, больш таго, узровень жыцця рэзка знижаецца, дык народ адварочваецца ад свабоды і ў лепшым выпадку абыякава назірае, як яе топчуць яе праціўнікі, а ў горшым — сам ахвотна ўдзельнічае ў гэтым дратаванні.

3.

Як вядома, у аснову сучаснай дэмакратычнай сістэмы ляглі ідэі Мантэск'е аб падзеле галін улады. Неабходнасць такога падзелу звязана з тым, што любая ўлада імкнецца да сваёй абсалютызацыі. Каб перашкодзіць гэтаму, неабходны абмежавальнікі. Іх ролю і выконваюць розныя галіны ўлады, якія, кантралюючы адна адну, перашкаджаюць дамініраванню адной з іх. яшчэ адным шлагбаўмам на шляху неабмежаванага ўсеўладдзя робіцца закон; гэта той граніт, у які быццам бы закоўваецца свабода. З аднаго боку, гэта вядзе да пэўнага абмежавання грамадзянскіх свабод, але з другога — стварае ўмовы для таго, каб максімальная колькасць людзей без боязі магла б карыстацца такой заканадаўча абмежаванай свабодай. У гэтым выпадку чалавек як быццам прызнаецца сабе, што хоць для развіцця яму патрэбна свабода, аднак для таго, каб ён мог без шкоды для сябе карыстацца ёю, ён павінен імкнуцца не нанесці шкоды іншым членам грамадства.

Задача, якую спрабуе вырашыць сучасная дэмакратыя, заключаецца ў тым, каб стварыць такія ўмовы, калі ў грамадстве захоўваецца і ўсяляк падтрымліваецца прынцып народаўладдзя, у той жа час сам народ адхіляецца, ці, калі больш дакладна, аддаляецца на досыць значную адлегласць ад улады. Гаворка ідзе не пра нейкі асаблівы цынізм уладных эліт, а пра аб'ектыўную неабходнасць. Дзяржава заўсёды аддаецца пад кіраванне элітарных груп, але калі раней яны ажыццяўлялі сваё панаванне, зыходзячы выключна з уласных інтарэсаў, не надта лічачыся з думкаю сваіх падданых, дык у эпоху ўсеагульнага выбарчага права ім неабходна заручацца падтрымкай выбаршчыкаў.

У свой час правячыя колы патрацілі нямала намаганняў, каб прывіць грамадзянам сацыяльныя ідэі і навыкі, якія, уласна, і склалі аснову сучаснай дэмакратыі. Праўда, варта адзначыць, што на самай справе гэтае навучанне было ўзаемным. Правячыя эліты ад метадаў прамога падаўлення перайшлі да больш гнуткай тактыкі з выкарыстаннем спосабаў сацыяльнага маніпулявання. Прадпрымальніцкі клас хоць і з вялікай цяжкасцю, але засвойваў ідэалогію сваіх галоўных апанентаў — наёмных рабочых, праўда, у прымальным для сябе варыянце: быў заключаны гістарычны кампраміс — сацыялістычныя і камуністычныя ідэі, якімі былі моцна "заражаны" народныя масы, шляхам эвалюцыі пераўтварыліся ў сацыял-дэмакратычныя, якія ўжо не толькі не пагражалі інтарэсам буржуазіі, але і ў многім аказаліся карыснымі ёй, бо давалі магчымасць, з аднаго боку, каналізаваць незадаволеных у цывілізаваныя бяспечныя рамкі, з другога — назапашваць вопыт сацыяльнага рэгулявання грамадскіх працэсаў.

Такая сітуацыя знаходзіць сваё ўвасабленне ў сістэме палітычных партый і арганізацый, галоўная задача якіх — адхіліць народ ад непасрэднага ўплыву і прамога ціску на ўладу і ў той жа час захаваць гэты ўплыў, зрабіўшы яго больш апасродаваным. Рэальныя рычагі кіравання дзяржавай знаходзяцца ў руках палітычных эліт, але права на валоданне гэтымі рычагамі тая ці іншая эліта атрымлівае са згоды ўсяго грамадства. Гэта цалкам працаздольная мадэль, паколькі ў адрозненне ад ранейшых часоў сённяшнія правячыя эліты маюць не закрыты, а адкрыты характар. Рух людзей па сацыяльных стратах, з'яўленне новых членаў у элітных пластах адбываецца досыць інтэнсіўна: практычна любы чалавек валодае рэальнымі магчымасцямі трапіць у прывілеяваныя саслоўі, падняцца на самую высокую грамадскую вяршыню. А задачы, якія ставяць сёння правячыя групы, істотна адрозніваюцца ад тых мэт, якіх яны дамагаліся раней: яны сапраўды заклапочаны не толькі сваімі кланавымі інтарэсамі, але і інтарэсамі самых шырокіх пластоў соцыуму і ўвогуле спрабуюць па меры сваіх сіл і здольнасцей служыць яму.

Ды і ў прынцыпе поўнае адхіленне народа ад улады нявыгаднае палітычным элітам. Самастойна яны не могуць адолець усё больш складаныя задачы па кіраванні грамадствам (хоць на розных ступенях улады ўзровень допуску народа да пульта кіравання дзяржавай моцна вагаецца). Так, на Захадзе зараз інтэнсіўна адбываецца развіццё сістэмы самакіравання: у нейкім сэнсе тут можна гаварыць пра выкарыстанне метадаў прамой дэмакратыі, калі народ без пасрэдніцтва палітычных эліт вырашае свае справы. (Аднак чым вышэй мы падымаемся па лесвіцы ўлады, тым меншы ўплыў народа, тым большае значэнне набываюць палітычныя лідэры і функцыянеры).

Цяперашнія парламенцкая дэмакратыя, увогуле, даказала сваю здольнасць да паспяховага функцыянавання. Але такая магчымасць узнікае ў тым выпадку, калі ў грамадстве існуе грамадзянская згода. Зараз вельмі папулярная ідэя прававой дзяржавы, пад якой разумеецца верхавенства закона. Аднак сутнасць прававой дзяржавы не ў гэтым. Умовы для яе будаўніцтва узнікаюць тады, калі асноўныя пласты грамадства прыходзяць да згоды па пытанні, што існуючая эканамічная і палітычная мадэль адпавядае інтарэсам большасці грамадзян. І толькі пасля таго, як спыняецца саслоўна-класавая вайна, складваецца рэальная сітуацыя, калі закон становіцца на варце агульначалавечых каштоўнасцей, правоў чалавека, а не эгаістычных памкненняў прывілеяваных груп.

4.

Шлях Расіі да дэмакратыі па сваіх магістральных накірунках увогуле супадае з той дарогай, якою рухаліся ад яе іншыя краіны. Аднак па шэрагу прычын ён аказаўся больш пакручастым і доўгім. Зразумець яго адметнасці — гэта зразумець адметнасці самой Расіі. Неабходна адразу адзначыць адну акалічнасць: дэмакратыя для Расіі зусім не чужы інстытут, яна мае патрэбу ў ёй не менш, чым любая іншая дзяржава. З гэтай высновы і трэба зыходзіць, разважаючы аб лёсе дэмакратыі ў Расіі.

Адным з гістарычных перыядаў, што найбольш моцна паўплываў на фармаванне сучаснага аблічча Расіі, быў, як ужо даўно і добра вядома, час царавання Пятра І. Двоесны характар пятроўскіх рэформ аказаў самы сур'ёзны ўплыў на наступнае развіццё дзяржавы.

Пётр быццам разарваў душу Расіі на дзве часткі. З аднаго боку, ім была зроблена велізарная работа па вызваленні краіны з палону абскурантызму, невуцтва, эканамічнай адсталасці. Менавіта ў ягонае цараванне ў Расію стаў пранікаць спачатку кволы, а пасля ўсё больш магутны паток заходніх ліберальных ідэй, якія ўрэшце заразілі рускае адукаванае грамадства. Пад іх уплывам гэтае грамадства дэмакратызавалася, паступова мяняўся не толькі яго лад думак, але і лад жыцця, адбываўся паступовы пераход ад патрыярхальнага барства да больш цывілізаваных форм жыцця. Але бяда заключалася ў тым, што новыя ідэалы ўступалі ў вострую і глыбокую супярэчнасць з рэальнай рэчаіснасцю — узмацненнем прыгоннай залежнасці сялян, адсутнасцю элементарных грамадзянскіх свабод большай часткі расіян. Такое спалучэнне неспалучальнага прыводзіла да паяўлення самых неспадзяваных, фантасмагарычных карцін, праклятых Радзішчавым і высмеяных Салтыковым-Шчадрыным. Для чалавека, выхаванага на кнігах французскіх энцыклапедыстаў ці на ўзорах брытанскай палітычнай сістэмы, айчынныя рэаліі рабіліся крыніцай заўсёдных пакут, штурхалі на пошук крайне радыкальных шляхоў па пераадоленні ўнутранага крызісу. Менавіта гэта і абумовіла зараджэнне і станаўленне рэвалюцыйных партый і тыя трагедыі, якія трэба было перажыць краіне.

Разрыў паміж вярхамі і нізамі ў той ці іншай ступені характэрны для любога грамадства. Аднак у Расіі ён аказаўся катастрафічна вялікі: у той час як адукаваная меншасць развівалася досыць інтэнсіўна і ў пэўных галінах нават перагнала сваіх заходніх калег (найбольш яркае пацвярджэнне гэтай думкі — паяўленне вялікай рускай літаратуры), свядомасць народных мас мянялася досыць марудна. Ідэі, якімі жыло асвечанае саслоўе, не даходзілі да ніжніх ступеняў грамадскай піраміды. Розныя пласты грамадства рухаліся быццам у розных накірунках. Калі грамадскія саслоўі падзяляе бездань, такі супрацьход заўсёды нясе сур'ёзную пагрозу грамадзянскаму міру ў дзяржаве і ў выніку вядзе да грамадзянскай вайны, якая і надарылася ў Расіі ў 1918 годзе.

Сутнасць трагедыі, перажытай (і ўсё яшчэ перажываемай) Расіяй у XX стагоддзі, заключаецца яшчэ і ў тым, што тыя працэсы, фармаванне новай сацыякультурнай, цывілізаванай і дзяржаўнай мадэлі, якія адбываліся ў заходніх краінах, адбываюцца ў нас з вялікім гістарычным спазненнем.

Станаўленне дэмакратыі на Захадзе ішло пераважна ў XIX стагоддзі і адзначалася жорсткімі класавымі баямі. І жорсткімі падаўленнямі ўладамі выступленняў нізоў. У якасці найбольш яркага прыкладу можна прывесці расправу над парыжскімі камунарамі. Вядома, можна па-рознаму адносіцца да т'ераў і кавяньякаў, стаць на бок іх бескампраміснага асуджэння, але калі адысці ад маральных ацэнак і стаць на глебу аб'ектыўнага гістарычнага падыходу, дык робіцца зразумелым, што гвалтоўныя меры тадышніх еўрапейскіх уладароў былі ўвогуле непазбежныя і нават неабходныя. Тая варожасць ніжэйшых пластоў насельніцтва ў дачыненні да маладых дэмакратычных дзяржаў, аб якой вышэй ужо гаварылася, вымагала ў многіх выпадках жорсткіх форм падаўлення смут і мяцяжоў. Паспяховы зыход гэтай барацьбы аказаўся магчымым у немалой ступені яшчэ і таму, што рэальны ўзровень гуманнасці грамадства быў тады вельмі далёкім ад сённяшніх, стаўшых ужо звычнымі стандартаў. Захаду ўдалося выканаць асноўную "брудную" (і крывавую) работу па станаўленні сучаснай дэмакратычнай дзяржавы **своечасова.** Інакш кажучы, там аказалася дастаткова часу для таго, каб грамадству ўдалося скончыць школу дэмакратыі, перш чым там запанавала сапраўдная дэмакратыя. Прычым гэта ў роўнай ступені адносіцца не толькі да пралетарыяту, але і да буржуазіі, і да кіруючага чыноўніцтва.

Інакш складвалася сітуацыя ў Расіі. З тае прычыны, што рух да дэмакратыі тут пачаўся значна пазней, ён супаў з перыядам, калі ўлада ўжо не магла безаглядна выкарыстоўваць рэпрэсіі. Вышэйшыя пласты грамадства былі ўжо, як ні парадаксальна гучыць гэта, занадта цывілізаванымі, а сусветная грамадская думка ўжо

ВЕРНУТЫ ДА ЖЫЦЦЯ



У абноўленым пасля рэканструкцыі помніку архітэктуры — касцёле св. Варвары ў Віцебску пабываў і правёў службу пасол Ватыкана ў Рэспубліцы Беларусь папскі нунцый архіепіскап Агасціна Маркето.

Варварынскі касцёл быў узведзены яшчэ ў 1785 годзе, а ў канцы XIX стагоддзя — перабудаваны. Доўгія гады стаяў ён бязгасным і толькі нядаўна сіламі прыхаджан і вернікаў удалося аднавіць гэты цудоўны помнік архітэктуры Беларусі вярнуць яго да жыцця.

На здымку: касцёл св. Варвары ў Віцебску.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛІНФАРМ

ШАНЦ НА ЗБАВЕННЕ + МП "ШАНЦ" = ШАНЦ НА ПОСПЕХ?

Падобна на тое, што драматург Ігар Сідарук, які з нядаўняга часу пачаў стала пісаць для тэатра лялек, яшчэ цалкам не задаволіўся тэмаю стасункаў Нараджэння Хрыстова ды Цара Ірада. Пасля таго, як пастаноўка ягонай п'есы "Меч Анёла" была летась ажыццёўлена на сцэне Берасцейскага тэатра лялек (не вельмі ўдала) і сёлета маладзечанскім тэатрам "Батлейка" (з відавочна большым поспехам), аўтару заманілася напісаць яшчэ адну калядную гісторыю. Так з'явіўся на свет Божы спектакль "Збавіцель", у які ўдыхалі жыццё берасцейскі рэжысёр-пастаноўшчык Сяргей Палешчанкаў, мастак з Івана-Франкоўска Мікола Данько, гарадзенскі кампазітар Сяргей Багданаў і бабруйскі майстар па пластыцы Валянцін Шчарбін.

А сама гісторыя вядомая яшчэ з даўніх батлейкавых часоў, калі паўставалі перад прагнымі да відовішчаў юнымі і дарослымі гледачамі Дзева Марыя ды Святы Язэп, Пастухі, Магі, Цар Ірад ды Чарнакніжнік, Воіны, Рахіль ды Анёлы... Вядома, сучасны пагляд на старажытны беларускі тэатр вымагае й сучаснага сцэнічнага прачытання, што й паспрабавалі спраўдзіць стваральнікі новага спектакля.

А яшчэ ў якасці калі не збаўцы, то добрага чынніка выступіла берасцейскае малое прадпрыемства "Шанц", якое не толькі фундавала "Збавіцеля", але й падрыхтавала для ўсіх дзяцей работнікаў тэатра шыкоўныя навагоднія падарункі.

Урэшце, не абышлі ўвагай прэм'еру ў Берасцейскім тэатры лялек і людзі мастацтва: якраз пад яе прымеркаваў свой дарунак мастак Мікола Маеўскі — цяпер сцены тэатра ўпрыгожвае ягоная работа "Паводка ў Камянцы-Літоўскім". І завяршылася ўсё лагічным і чаканым клічнікам: поўным аншлагам на прэм'еры.

І. Х.

На здымку: сцэна са спектакля "Збавіцель".

Фота Уладзіміра ДОЛЬКІНА

чуйна ставілася да выкарыстання жорсткіх метадаў у супрацьстаянні кіраўнікоў і народа. І хоць царскі міністр унутраных спраў пры абмеркаванні ў Дзяржаўнай думе пытання аб ленскім расстрэле адказаў: "Так было і так будзе", ён хутчэй гаварыў пра жаданае, чым пра рэальнае. Лібералізм да таго часу ўжо надзейна ўгрунтаваўся як у грамадскай свядомасці, так і ў свядомасці кіруючай эліты Расійскай імперыі. Можна сцвярджаць, што гэты лібералізм быў не заходнім, а расійскім, гэта значыць непаслядоўным, але ён ужо не дазваляў пераходзіць пэўную рысу, звязваў рукі рэпрэсіўным органам. У гэтым плане вельмі паказальнае прызнанне першага, і няўдачлівага, прэм'ера Часовага ўрада князя Львова. Пасля сваёй адстаўкі ў адной з прыватных размоў ён гаварыў: "Па сутнасці, я пайшоў таму, што мне нічога не заставалася рабіць. Для таго, каб уратаваць становішча, трэба было разагнаць Саветы, страляць у народ. Я не мог гэтага рабіць". Расійскія дэмакраты не маглі запраста страляць у народ, аднак найбольш актыўная і радыкальная частка народа аказалася зусім здольнай забіваць расійскіх лібералаў.

Перамога бальшавізму сталася вынікам раўнадушша большай часткі народа да індывідуальнай свабоды і яго веры ў свабоду агульную, у тое, што **несвабода ўсіх** дае на выхадзе **свабоду для ўсіх.** Гэты дзіўны сілагізм угрунтаваўся ў свядомасці не толькі рускай нацыі. Аднак яго ўплыў у Расіі адчуваецца асабліва востра.

...І вось ужо некалькі гадоў у Расіі робіцца чарговая спроба па вырошчванні ў краіне дрэва дэмакратыі. Сённяшняя сітуацыя ўвогуле ўкладваецца ў намаляваную намі схему, хоць і валодае цэлым наборам своеасаблівых рыс. Спушчаная зверху "ўстаноўка на дэмакратыю", па сутнасці, аказалася непатрэбнай большасці насельніцтва. Першапачаткова ўзнікшы дэмакратычны парыў расіян быў звязаны не так з усвядомленым непрыняццем камуністычнай сістэмы, як з надзеяй на хуткае паляпшэнне эканамічнага становішча ў краіне, на скоры рост жыццёвых стандартаў простых працаўнікоў і, нарэшце, на ліквідацыю ненавісных народу прывілеяў савецкай партакратыі. Аднак пасля таго, як надзеі на падняцце жыццёвага ўзроўню не спраўдзіліся (больш таго, ён пачаў хутка пагаршацца), пасля таго, як атрыманая з чужых рук свабода прынесла з сабой многія негатыўныя з'явы, такія, як карупцыя, рэзкі рост злачыннасці, імклівае расслаенне грамадства на багатых і бедных, мільёны людзей адхіснуліся ад дэмакратыі. Выбары ў Федэральны сход, поспех антыдэмакратычнага блоку (ліберал-дэмакратаў, камуністаў, якія ўзялі на ўзбраенне, па сутнасці, толькі адзін сродак — нястрымную дэмагогію) сведчаць аб тым, што па-ранейшаму ні дэмакратыя, ні свабода не ўспрымаюцца народам як вышэйшыя каштоўнасці.

Скажу яшчэ раз: галоўная наша бяда ў тым, што мы пастаянна прыпазняліся і прыпазняемся са станаўленнем у краіне дэмакратычнай сістэмы. Гэта прыводзіць да таго, што ў прэзідэнта і ўрада застаецца надзвычай вузкае поле для манеўра.

Дэмакратычная сістэма не можа прарасці глыбока каранямі ў грамадства і ва ўмовах татальнага сацыяльна-эканамічнага крызісу. Падзеі ў кастрычніку 1993 года ў Маскве — гэта адчайная спроба ліберальнага ўрада і прэзідэнта выбрацца з дэмакратычнай пасткі, у якую патрапіла кіраўніцтва дзяржавы, калі антыдэмакратычная большасць Вярхоўнага Савета, скарыстоўваючы дэмакратычныя працэдуры парламенцкай дзейнасці, вяла адчайную барацьбу супраць дэмакратыі. Гэты канфлікт быў **абсалютна непазбежны,** паколькі ў аснове яго было супрацьстаянне няўстойлівай слабай дэмакратыі і значнай, па абскурантысцку настроенай часткі посткамуністычнага грамадства — **дэмакратыі** і ахлакратыі. (Выбраная замест ВС Дзяржаўная дума аказалася не менш антыдэмакратычнай, што, па ўсёй верагоднасці, абяцае новыя палітычныя навальніцы).

Вядома, ёсць фактары, якія працуюць на ўмацаванне дэмакратычнага рэжыму ў краіне. Перш за ўсё гэта досыць высокі адукацыйны ўзровень насельніцтва, які да пэўнай ступені стрымлівае антыдэмакратычныя тэндэнцыі: расчараванне многіх расіян у ранейшых сацыялістычных ідэалах, разуменне большасцю народа, што вяртанне ў мінулае не прынясе нічога добрага. Але калі сітуацыя ў краіне будзе пагаршацца, уплыў гэтых фактараў будзе слабець, бо чалавек, якога жыццёвыя варункі пастаянна вымагаюць змагацца за сваё фізічнае выжыванне, паступова страчвае здольнасць да цвярозай ацэнкі рэальнага становішча рэчаў. Ён гатовы схапіцца за любую саломінку, нават калі розум падказвае яму, што нічога добрага з гэтага не атрымаецца. Эмоцыі і пачуцці ў такой сітуацыі бяруць верх над голасам розуму. Гэтым якраз тлумачыцца поспех дзеячаў тыпу Жырыноўскага і Зюганава, чыя балбатня не адлавядае аніякім запатрабаванням нават самай прымітыўнай логікі, але валодае вялікім эмацыянальным і ірацыянальным зарадам, з'яўляецца амаль ідэальным вербальным выяўленнем тых эмацыянальных стрэсаў, у палоне якіх знаходзяцца мільёны людзей. І ўсё-такі, як бы ні скончылася цяперашняя спроба ўгрунтавання на расійскай глебе дрэва свабоды, Расіі без дэмакратыі ў сучасным свеце не выжыць. І таму спроба гэтая будзе паўтарацца зноў і зноў. Прынамсі, да таго часу, пакуль існуе на геаграфічнай карце наша краіна.

Уладзімір ГУРВІЧ

("Новый мир", N 12, 1994 г.)

Павел ДЗЮБАЙЛА

24 студзеня на 64 годзе жыцця раптоўна памёр пісьменнік Павел Дзюбайла.

Павел Кузьміч Дзюбайла нарадзіўся 5 жніўня 1931 г. у вёсцы Кукарава Бярэзінскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1954), адначасова працаваў у школах на Маладзечаншчыне. Служыў у арміі (1954—1955). Быў дырэктарам Бакштанскай сярэдняй школы Юрацішкаўскага раёна, інспектарам Маладзечанскага аблана. У 1960 годзе скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук і з таго часу яго жыццё было звязана з працай у гэтым інстытуце, дзе ён прайшоў шлях ад навуковага супрацоўніка да загадчыка аддзела сучаснай беларускай літаратуры і крытыкі. Абараніў доктарскую дысертацыю, атрымаў навуковае званне прафесара.

У друку з артыкуламі і рэцэнзіямі выступаў з 1956 года. Яго пяру належаць такія літаратуразнаўчыя і літаратурна-крытычныя працы, як "Беларускі раман аб Вялікай Айчыннай вайне", "Праблемы стылю ў сучаснай беларускай прозе", "Вобраз нашага сучасніка ў беларускай прозе", "У вялікай дарозе", "Беларускі раман. Гады 70-я", "Наш сучаснік у жыцці і ў літаратуры", "Панарама сучаснай беларускай прозы", "У пошуках духоўных каштоўнасцей: Беларуская проза сёння", "Станоўчы герой у беларускай літаратуры", "Час, літаратура і крытыка" і інш.

Яго працы вызначаліся прафесійнасцю, прынцыповым падыходам да літаратурных з'яў, пільнай увагай да сучаснага літаратурнага працэсу. За ўдзел у двухтомным даследаванні па гісторыі беларускай літаратуры быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй імя Якуба Коласа.

Павел Дзюбайла быў клапатлівым выхавацелем маладых навукоўцаў і даследчыкаў роднай літаратуры.

Пайшоў ад нас руплівы працаўнік на ніве літаратуразнаўства і мастацкай крытыкі, чулы таварыш.

Светлы вобраз Паўла Кузьміча Дзюбайлы назаўсёды застанецца ў сэрцах сяброў і ўсіх, хто яго ведаў.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ АН БЕЛАРУСІ

Мартыралог

"ПАКУТНІКІ ГУЛАГу"

САМСАНОВІЧ Мікалай Львовіч, 1919 г. н., ураджэнец г. Давід-Гарадок Беларусі. Асуджаны ў 1952 г. лагсудом Мінлагу МУС па арт. 58 п. 10 ч. 1 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

ЛЕВІН Марк Рахмілавіч, 1909 г. н., ураджэнец г. Гомеля. Асуджаны лагсудом Мінлагу МУС па арт. 58 п. 10 ч. 1 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

ЖУК Пётр Маркавіч, 1896 г. н., ураджэнец вёскі Лескі Брэст-Літоўскай вобл. Асуджаны ў 1942 г. Комі АССР па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

КОЗЕЛЬ Яўген Хрысціянавіч, 1892 г. н., ураджэнец г. Горкі Беларусі. Асуджаны ў 1942 г. судкалегіяй Вярхоўнага суда Комі АССР па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу.

ГУЛІДА Аляксандр Лаўрэнцьевіч, 1888 г. н., ураджэнец вёскі Белякоўшчына Гродзенскай вобл. Асуджаны ў 1942 г. судкалегіяй Вярхоўнага суда Комі АССР па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да вышэйшай меры — расстрэлу.

БАРУТА Аляксандр Іванавіч, 1888 г. н., ураджэнец вёскі Дубава Дзяржынскага раёна Беларусі. Асуджаны ў 1939 г. па арт. 58 п. 10 ч. 1 КК РСФСР да 8 гадоў пазбаўлення волі і 3 гадоў паражэння ў правах.

ВЕРАСАВОЙ Стэфан Аляксеевіч, 1907 г. н., ураджэнец вёскі Казацкія Балсуны Беларусі. Асуджаны ў 1941 г. судкалегіяй Вярхоўнага суда Комі АССР па арт. 58 п. 10 ч. 1 КК РСФСР да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу.

ЛІЧКО Павел Лук'янавіч, 1888 г. н., ураджэнец сяла Рубілкі Дзяржынскага раёна Мінскай вобл. Асуджаны ў 1941 годзе судкалегіяй Вярхоўнага суда Комі АССР па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

КАМАРОЎ Іван Сямёнавіч, 1913 г. н., ураджэнец г. Віцебска. Асуджаны ў 1939 г. Вярхоўным судом Комі АССР па арт. 58 п. 10 ч. 1 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

УР'ЕЎ Барыс Сямёнавіч, 1898 г. н., ураджэнец г. Мсціслаўля Беларусі. Асуджаны ў 1938 г. Вярхоўным судом Комі АССР па арт. 58 п. 10 ч. 1 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

ЕСІПОВІЧ Адам Адамавіч, 1902 г. н., ураджэнец вёскі Заракавец Беларусі. Асуджаны ў 1938 г. Вярхоўным судом Комі АССР па арт. 58 п. 10 ч. 1 КК РСФСР да 5 гадоў пазбаўлення волі.

БЕЛАНОЖКА Мікалай Лаўрэнцьевіч, 1894 г. н., ураджэнец вёскі Дзюдкі Полацкага раёна Мінскай вобл. Асуджаны ў 1942 г. Ваенным трыбуналам войск НКУС па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу.

ГУСЕЎ Васіль Андрэевіч, 1904 г. н., ураджэнец М.Гарадок Беларусі. Асуджаны ў 1942 г. Ваенным трыбуналам войск НКУС па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу.

БІЛЬДЗЕРТ Андрэй Янавіч, 1920 г. н., ураджэнец Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобл. Ваенным трыбуналам войск НКУС па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР прысуджаны да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу.

ЯКАЎЧУК Афанасій Фёдаравіч, 1898 г. н., ураджэнец вёскі Даўбяклі Гродзенскай губерні. Асуджаны ў 1943 годзе Ваенным трыбуналам войск НКУС па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да 6 гадоў пазбаўлення волі і 3 гадоў паражэння ў правах.

МАХНАЧ Аляксандр Сямёнавіч, 1893 г. н., ураджэнец вёскі Насіцын Пухавіцкага раёна Мінскай вобл. Асуджаны ў 1942 г. Ваенным трыбуналам войск НКУС па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

САВЕНКАЎ Аляксандр Пятровіч, 1892 г. н., ураджэнец сяла Кошалева Гомельскай вобл. Асуджаны ў 1941 г. Ваенным трыбуналам войск НКУС па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

ГУР'ЕЎ Уладзімір Яўгенавіч, 1894 г. н., ураджэнец г. Мінска. Асуджаны ў 1942 г. Ваенным трыбуналам войск НКУС па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 3 гадоў паражэння ў правах.

МІХЕЕВІЧ Серафім Фаміч, 1906 г. н., ураджэнец г. Гродна. Асуджаны ў 1942 г. Ваенным трыбуналам войск НКУС па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да 7 гадоў пазбаўлення волі і 3 гадоў паражэння ў правах.

СТУЛЬБА Уладзімір Міхайлавіч, 1904 г. н., ураджэнец г. Мінска. Асуджаны ў 1942 г. Ваенным трыбуналам войск НКУС па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

БАГДАНАЎ Пётр Міхайлавіч, 1920 г. н., ураджэнец г. Мазыр Гомельскай вобл. Асуджаны ў 1947 г. спецлагсудом Інцінскага ІТЛ МУС па арт. 58 пп. 10, 11 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах.

ЧАЧОТКА Мікалай Васільевіч, 1904 г. н., ураджэнец г. Мінска. Асуджаны ў 1945 г. судкалегіяй Вярхоўнага суда Комі АССР па арт. 58 п. 10 ч. 2 КК РСФСР да 7 гадоў пазбаўлення волі і 3 гадоў паражэння ў правах.

Г. УСЦІЛОЎСКІ,
старшыня Саснагорскага таварыства "Мемарыял" (Рэспубліка Комі)

(Працяг будзе)

Працяг. Пачатак у нумарах за 13, 20 студзеня г.г.

Калектыў супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага музея архітэктуры і побыту выказвае глыбокае спачуванне вучонаму сакратару Галіне Латош і супрацоўніку Аляксандру Адамовічу з прычыны смерці бацькі Адамовіча Яўгена Міхайлавіча.

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спачуванне пісьменніцы Ніне Мацяш у сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю сястры Ганны.

ЛіМ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

Заснавальнікі:
Саюз пісьменнікаў Беларусі і Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь

Выходзіць з 1932 года

Газету рэдагавалі

Х.Дунец	*(1932–35)*
І.Гурскі	*(1935–41)*
А.Куляшоў	*(1945–46)*
М.Горцаў	*(1947–49)*
П.Кавалёў	*(1949–50)*
В.Вітка	*(1951–57)*
М.Ткачоў	*(1957–59)*
Я.Шарахоўскі	*(1959–61)*
Н.Пашкевіч	*(1961–69)*
Л.Прокша	*(1969–72)*
Х.Жычка	*(1972–76)*
А.Асіпенка	*(1976–80)*
А.Жук	*(1980–86)*
А.Вярцінскі	*(1986–90)*

Галоўны рэдактар
Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Міхась ЗАМСКІ
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ
Барыс ПЯТРОВІЧ
намеснік галоўнага рэдактара
Юрась СВІРКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі *332-461*
намеснікі галоўнага рэдактара *332-525, 331-985*
аддзелы:
публіцыстыкі *332-525*
пісьмаў і грамадскай думкі *331-985*
літаратурнага жыцця *332-462*
крытыкі і бібліяграфіі *332-204*
паэзіі і прозы *332-204*
музыкі *332-153*
тэатра, кіно і тэлебачання *332-153*
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў *332-462*
навін *332-462*
мастацкага афармлення *332-204*
фотакарэспандэнт *332-462*
бухгалтэрыя *268-640*

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра «ЛіМа»

Апаратныя сродкі і тэхнічная падтрымка — фірма «Дайнова»

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку". (г.Мінск, пр. Ф.Скарыны, 77)

Індэкс 63856. Наклад 10216. Нумар падпісаны 26.1.1995 г.

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Тэлетыдзень

ПАНЯДЗЕЛАК, 30.01

Беларускае тэлебачанне

7.35 Ранішні кактэйль
7.50 Мультфільмы
8.20 "Фуэта", м/ф
9.55 Студыя "Палітыка"
10.10 Чароўны экран
10.45 "Корцік", м/ф, с. 1
12.25 "Гімназісты", д/ф
15.20 Тэлебачанне — школе. Музыка
15.50 Канцэрт памяці З. Бабія
18.00 Навіны
18.10 "На добры лад"
18.20 Урокі Наталлі Наважылавай
18.50 "Цінка-павуцінка", мульт
19.00 Навіны (Бі-бі-сі)
19.20 Праспект
19.50 "Цудоўны Гоша", мульт
20.00 Слова
20.10 Дзень стагоддзя
20.15 Люстэрка Сі-эн-эн
20.30 Тэлеанонс
20.35 Калыханка
21.00 Навіны
21.40 Спартыўны тэлекур'ер
22.00 Кліп-канцэрт
22.10 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь; "Музыка без межаў"; Пад купалам Сусвету

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа"
8.25 "Дзікая Роза"
9.00 Чалавек і закон
9.30 Дзівееўскія прароцтвы
14.00 Пад знакам Меркурыя
14.20 Фондавы рынак
14.30 Хроніка дзелавога жыцця
14.40 Тэлемікс
15.00 Зорная гадзіна
15.40 Наша заўтра
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 Ва ўсіх на вуснах
17.30 У гэтыя дні 50 гадоў таму
17.45, 20.30 Надвор'е
18.00 Гадзіна пік
18.30 "Дзікая Роза"
19.00 Мужчына і жанчына
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час
20.40 Сустрэча з А. Салжаніцыным
21.00 Гол
21.35 У пошуках страчанага
22.15 Прэс-клуб
23.50 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.05 Рытміка
6.20 Зоркі гавораць
6.25 Між іншым
6.55 Рака часу
7.25 Тэлегазета
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны Эй-бі-сі
8.25 Дэпеша
8.55 "Дні і ночы", м/ф
10.25 Гандлёвы дом
10.40 Сялянскае пытанне
11.05, 13.20 Дзелавая Расія
13.45 Шэдэўры з правінцыі
15.05 Там-там навіны
15.20 Свята кожны дзень
15.30 Мульці-пульці
16.05 Зрабі дабро
16.45 "У гэты дзень..."
16.50 Казкі для бацькоў
17.20 Рэпартажы з месцаў
17.30 Выратаванне 911
18.25 Вуснамі дзіцяці
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Жоўтыя касачы", м/ф
20.40 Рэпарцёр
21.00 Без рэтушы
22.30 Аўтаімгненне
22.40 Рака часу
22.45 "Дасканалы шпіён", м/ф (Вялікабрытанія)
23.50 Цішыня N 9

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 Мультфільм
12.30, 14.45, 17.50, 19.05 Музычны момант
12.35 "Нямецкая хваля"
13.00 Тэст
13.15 "За чорным собалем", д/ф
13.30 "Мануэла"
14.20 "Слова гонару", мульт
14.50 "Каханая жанчына механіка Гаўрылава", м/ф
16.05 Чароўная лінія
16.20 "Залатое сіта", мульт
16.30 "Трамплін"
17.15 Свята на вуліцы А. Марынескі
17.55 Крыжыкі-нулікі
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.25 "Мануэла"
20.15 "На роўным месцы", тэлегульня
20.45 "Ваня, ты як тут", м/ф
21.10 Тэлемагазін
21.15 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Зорны вечар у Доме кіно, ч. 1

АЎТОРАК, 31.01

Беларускае тэлебачанне

7.35 Ранішні кактэйль
7.50 Эканамікст
8.00 Мультфільмы
8.20 Люстэрка Сі-эн-эн
8.35 "Прызнанне ў каханні", д/ф
8.55 Дзень стагоддзя
9.00 Тэлебачанне — школе. Музыка
9.30 "Тэлесярбрына"
10.00 Студыя "Палітыка"
10.15 Чароўны экран
10.30 "Корцік", м/ф, с. 2
11.40 "Мой свет"
12.25 "Месца сустрэчы змяніць нельга", м/ф, с. 4
13.40 "Канцэрт — фронту"
16.00 "Хутар", д/ф
16.30 Тэлебачанне — школе. "Беларускай песні ўладар" (Янка Купала і яго настаўнікі)
16.55 "Мой свет". Асоба
17.15 Народны майстар М. Тарасюк
17.40 "Блакітная страла", мульт
18.00 Навіны
18.10 Навіны (Бі-бі-сі)
18.30 Да 5-х угодкаў Закона аб мовах
19.30 Рэзерв
19.35 Студыя "Эксклюзіў"
19.40 "Маё каханне, мой смутак"
20.15 Люстэрка Сі-эн-эн
20.30 Тэлеанонс
20.35 Калыханка
21.00 Навіны
21.40 Студыя "Палітыка"
21.55 Кліп-канцэрт
22.05 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь; Хакей. "Цівалі" (Мінск) — "Хімік" (Васкрасенск)

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа"
8.25 "Дзікая Роза"
9.00 Ты помніш, таварыш...
9.30 Іграюць В. Гайдукоў і С. Ларыёнаў (баян)
14.00 Дзверы ў малы бізнес
14.20 Справа і права
14.30 Хроніка дзелавога жыцця
14.40 Культура і бізнес
15.00 Дамісолька
15.30 Чароўны свет, ці Сінема
16.00 Джэм
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 Рускі свет
17.30 Загадка СБ
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Вільгельм II
18.00 Гадзіна пік
18.25 "Дзікая Роза"
18.55 Мы.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час
20.40 З першых рук
20.50 "Гульня сур'ёзна", м/ф
22.40 Р. Шуман. "Арабескі"
23.05 Хакей. ЦСКА — "Іціль" (Казань)

Канал "Расія"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.05 Рытміка
6.20 Зоркі гавораць
6.25 Між іншым
6.55 Рака часу
7.25 Тэлегазета
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны Эй-бі-сі
10.25 Гандлёвы дом
10.40 Сялянскае пытанне
11.05, 13.20 Дзелавая Расія
13.45 Выратаванне 911
15.05 Там-там навіны
15.20 Свята кожны дзень
15.30 "Асабліва сакрэтная місія", м/ф (Аўстралія), с. 4
16.05 Новая лінія
16.35 Рэпартажы з месцаў
16.45 "У гэты дзень..."
16.50 Бясшумныя лідэры
17.20 Ніхто не забыты
17.25 "Мая вайна", д/ф
17.50 Ваша права
18.05 L-клуб
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Гарачы снег", м/ф
21.35 Кінафіша
21.50 Кліп-антракт
22.30 Аўтаімгненне
22.40 Рака часу
22.45 ЭКП
22.55 "Дасканалы шпіён", м/ф (Вялікабрытанія), с. 2
23.55 Парыжскія сезоны

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 Мультфільмы
12.30, 14.45, 17.40, 19.05 Музычны момант
12.35 "Нямецкая хваля"
13.00 Хуткая дапамога
13.30 "Мануэла"
14.20 Мультфільм
14.50 "Расстанемся, пакуль добрыя", м/ф, 1-я і 2-я серыі
17.05 Чароўная лінія
17.20 Мультфільмы
17.45 Па ўсёй Расіі
17.55 Мы і банк
18.55 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.25 "Мануэла"
20.15 Тэатральны бінокль
20.50 "Пяты туз"
21.10 Тэлемагазін
21.15 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Зорны вечар у Доме кіно, ч. 2

СЕРАДА, 1.02

Беларускае тэлебачанне

7.35 Ранішні кактэйль
7.50 Мультфільмы
8.15 Люстэрка Сі-эн-эн
8.30 "Маё каханне, мой смутак"
9.00 Тэлебачанне — школе. "Беларускай песні ўладар" (Янка Купала і яго настаўнікі)
9.30 "Павуціна-2", м/ф (Італія), с. 4
10.30 Урокі Наталлі Наважылавай
10.50 Студыя "Палітыка"
11.05 Чароўны экран
11.40 "Корцік", м/ф, с. 3
12.50 "Мой свет". Асоба
13.10 Відзьма-нявідзьма
14.10 "Месца сустрэчы змяніць нельга", м/ф, с. 5
15.35 "Плыве човен", д/ф
15.50 "Край перакуленых нябёсаў", д/ф
16.20 Чароўны экран
16.30 Фільм-канцэрт
17.40 "Скупы два разы плаціць"
18.00 Навіны
18.10 "Крок". "Закон і ты"
19.00 Навіны (Бі-бі-сі)
19.20 Дыялогі аб спорце
19.40 Рэзерв
19.45 "Маё каханне, мой смутак"
20.15 Люстэрка Сі-эн-эн
20.30 Тэлеанонс
20.35 Калыханка
21.00 Навіны
21.40 Студыя "Палітыка"
21.55 Кліп-канцэрт
22.05 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь; "Павуціна-2", м/ф, с. 5; Пад купалам Сусвету

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа"
8.25 "Дзікая Роза"
9.00 Клуб падарожнікаў
14.00 Навука і рынак
14.20 Грошы і шчасце
14.30 Хроніка дзелавога жыцця
14.40 Агенцтва "Шанц"
15.00 Паглядзі, паслухай
15.20 "Падарожжа ў мінулае", мульт (ЗША)
16.00 Цін-тонік
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 Кампанія "Мір"
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Аятала Хамейні
18.00 Гадзіна пік
18.30 "Дзікая Роза"
18.55 "Сярэбраны шар"
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час
20.40 Маналог
20.50 "Далёка ад вайны". Краснаярск
21.50 "Целаахоўнік", м/ф
23.35 Аўта-шоу
23.50 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.05 Рытміка
6.20 Зоркі гавораць
6.25 Між іншым
6.55 Рака часу
7.25 Тэлегазета
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны Эй-бі-сі
8.25 Ключавы момант
8.35 Мемуары
9.05 Зусім сакрэтна
9.55 П. І. Чайкоўскі. "Францэска да Рыміні"
10.25 Гандлёвы дом
10.40 Сялянскае пытанне
11.05, 13.20 Дзелавая Расія
13.45 "Незанятая вакансія". Э. Олбі
15.05 Там-там навіны
15.20 Свята кожны дзень
15.30 Студыя "Рост"
16.05 Далёкі Усход
16.45 "У гэты дзень..."
16.50 Залатая галіна
17.20 Рэпартажы з месцаў
17.30 Ніхто не забыты
17.35 Тэледэбаты
18.05 Непапулярная тэма
18.20 Свая гульня
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Санта-Барбара"
20.30 Астралогія кахання. Ала Пугачова
21.05 Прафесія — рэжысёр
22.30 Аўтаімгненне
22.40 Рака часу
22.45 ЭКП
22.55 Футбол. "Арсенал" (Англія) — "Мілан" (Італія)

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 "Гарманісты", т/ф
12.30, 14.45, 17.45, 19.00 Музычны момант
12.35 "Нямецкая хваля"
13.00 Хуткая дапамога
13.30 "Мануэла"
14.20 Мультфільм
14.50 "Расстанемся, пакуль добрыя", м/ф, 1-я і 2-я серыі
17.05 Чароўная лінія
17.20 Мультфільмы
17.45 Па ўсёй Расіі
17.55 Мы і банк
18.55 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.25 "Мануэла"
20.15 Блеф-клуб
20.50 Песні мінулых гадоў. Спявае В. Талкунова
21.10 Тэлемагазін
21.15 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 А. П. Чэхаў. "На вялікай дарозе". Тэлеспектакль

ЧАЦВЕР, 2.02

Беларускае тэлебачанне

7.35 Ранішні кактэйль
7.50 "Чыпаліна", мульт
8.30 Люстэрка Сі-эн-эн
8.45 "Маё каханне, мой смутак"
9.20 Вытокі. Урокі беларускай мовы
9.30 "Павуціна-2", м/ф, с. 5
10.20 "Малахіт", д/ф
10.45 Студыя "Палітыка"
11.00 Чароўны экран
11.50 "Недзе грыміць вайна", м/ф, с. 1—2
15.40 "Іосіф і яго брат Петр", д/ф
16.10 Тэлебачанне — школе. К. Крапіва і яго драматургія
16.50 Чароўны экран
17.30 "Харошкі". Фільм-канцэрт
18.00 Навіны
18.10 А жыць трэба!..
18.55 Тэлеанонс
19.00 Навіны (Бі-бі-сі)
19.20 "Фрагменты"
19.30 Студыя "Эксклюзіў"
19.35 "Крок". "Ін тайм"
20.05 Дзень стагоддзя
20.10 "Стрэлачнік", мульт
20.15 Люстэрка Сі-эн-эн
20.35 Калыханка
21.00 Навіны
21.40 Студыя "Палітыка"
21.55 Кліп-канцэрт
22.05 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь; "Павуціна-2", м/ф, с. 6; Пад купалам Сусвету

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны
8.00 Мультфільм
8.20 "Дзікая Роза"
9.00 У свеце жывёл
9.40 Экслібрыс
14.00 Сяло і рэформы
14.20 Мой маленькі бізнес
14.30 Хроніка дзелавога жыцця
14.40 Дазвольце прадставіцца
15.00 Мульцітролія
15.30 На балі ў Папялушкі
16.00 Камп'ютэр-хол
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 ...Да 16 і старэйшым
17.30 Мініяцюра
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Х. Капабланка
18.00 Гадзіна пік
18.30 "Дзікая Роза"
18.55 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час
20.40 Масква—Крэмль
21.00 Лато "Мільён"
21.30 Баскетбол. ЦСКА—"Рэал" (Мадрыд)
23.00 Лёгкая атлетыка. Міжнародныя спаборніцтвы "Сусветны клас" у Маскве
23.50 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.05 Рытміка
6.20 Зоркі гавораць
6.25 Між іншым
6.55 Рака часу
7.25 Тэлегазета
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны Эй-бі-сі
8.25 "Санта-Барбара"
10.05 Тэлемарафон "Крокі Перамогі"
10.45 Гандлёвы дом
11.05, 13.20 Дзелавая Расія
13.45 "Лад-"галерэя
15.05 Там-там навіны
15.20 Тэлемарафон "Крокі Перамогі"
18.20 "У гэты дзень..."
18.25 У свеце аўта- і мотаспорту
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Санта-Барбара"
20.30 Гарадок
21.00 60 хвілін
22.30 Аўтаімгненне
22.40 Рака часу
22.45 Навагодняя ноч N 1995

Санкт-Пецярбург

15.00 "Мальва", м/ф
16.25 Чароўная лінія
16.40 "Снегл". Тэлеспектакль для дзяцей
17.50 Тры колы, фаліянт і...
18.10, 19.05 Музычны момант
18.15 Па ўсёй Расіі
18.30, 21.30 Інфарм ТБ
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.25 "33", м/ф
20.45 Фільм-канцэрт
21.10 Тэлемагазін
21.15 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 "Тэлекампакт"
23.00 "Век танца", м/ф (Францыя), с. 1

ПЯТНІЦА, 3.02

Беларускае тэлебачанне

7.35 Ранішні спектакль
7.50 "Новая казка", мульт
8.05 Эканамікст
8.15 Люстэрка Сі-эн-эн
8.30 "Пра бурага мядзведзя", д/ф
8.55 Дзень стагоддзя
9.00 Тэлебачанне — школе. К. Крапіва і яго драматургія
9.40 "Павуціна-2", м/ф, с. 6
10.30 Студыя "Палітыка"
10.45 Чароўны экран
10.55 "Гэты нягоднік Сідараў", м/ф
12.00 "Крок" "Ін тайм"
12.30 "Зорка з зоркаю гаворыць..." Шоу-праграма
12.55 "Недзе грыміць вайна", м/ф, с. 3
16.15 Фільм-канцэрт
16.45 "Мой свет"
17.10 "Аперэта — любоў мая..."
18.00 Навіны
18.10 Мультфільм
18.45 "Сваімі рукамі"
19.00 Навіны (Бі-бі-сі)
19.20 Калумбус. Высокі стыль
19.40 "Эдзінбургскія масты". Міжнародны фестываль мастацтваў
20.05 Вясёлы ўік-энд
20.15 Люстэрка Сі-эн-эн
20.30 Тэлеанонс
20.35 Калыханка
21.00 Навіны
21.40 Студыя "Палітыка"
21.55 Кліп-канцэрт
22.05 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь; Пад купалам Сусвету; "Прывітанне, артыст!", м/ф (Францыя, Італія); Эканамікст; Хакей. "Цівалі" (Мінск) — СКА (Санкт-Пецярбург)

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 22.50 Навіны
8.00 "Сарока"
8.25 "Дзікая Роза"
9.00 Сюіта з музыкі А. Хачатурана да драмы М. Ю. Лермантава "Маскарад"
9.20 Дапамажы сабе сам
14.00 Улада і рэформы
14.20 Наш прагноз
14.30 Хроніка дзелавога жыцця
14.40 Да вашых паслуг
15.00 "Важкая асоба з 2 "А", м/ф
16.10 Рок-урок
16.40 Свет сёння
16.50 Чалавек і закон
17.20 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы
18.15, 20.30 Надвор'е
18.20 "Дзікая Роза"
18.50 Поле цудаў
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час
20.40 Чалавек тыдня
21.00 "Клан". Тэлесерыял (Францыя)
22.10 Адзіны дубль
23.00 Хакей. ЦСКА — "Тарпеда" (Яраслаўль)

Канал "Расія"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі
6.05 Рытміка
6.20 Зоркі гавораць
6.25 Між іншым
6.55 Рака часу
7.25 Тэлегазета
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны Эй-бі-сі
8.25 Без рэтушы
9.20 Ваенны кур'ер
9.35 "Санта-Барбара"
10.25 Гандлёвы дом
10.40 Сялянскае пытанне
11.05, 13.20 Дзелавая Расія
13.45 Сусветная вёска
15.05 Там-там навіны
15.20 Свята кожны дзень
15.30 Студыя "Рост"
16.05 Новая лінія
16.45 "У гэты дзень..."
16.50 Дысней па пятніцах
17.45 Экспавідэа
18.00 Тэніс. Бельгія — Расія
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Санта-Барбара"
20.30 Я — лідэр
20.55 Ніхто не забыты
21.05 "К-2" прадстаўляе: "Перпендыкулярнае кіно"
22.30 Аўтаімгненне
22.40 Рака часу
22.45 "Донар", м/ф (ЗША)
0.20 Уваход па запрашальных білетах

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 Тэлефільм
12.30, 14.45, 19.05 Музычны момант
12.35 "Нямецкая хваля"
13.00 Хуткая дапамога
13.25 Мультфільм
14.15 Урок нямецкай мовы
14.50 "33", м/ф
16.05 Чароўная лінія
16.20 Фільм-канцэрт
17.05 Казка за казкай
17.55 Храм
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.25 Фільмаскоп
19.30 "Дзеці з аталя "Амерыка", м/ф
21.00 "Справа мінулая..." Мульт
21.10 Тэлемагазін
21.15 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Лёгкая атлетыка. Міжнародныя спаборніцтвы
22.45 "Цім", м/ф (ЗША)

СУБОТА, 4.02

Беларускае тэлебачанне

8.00 Фільм-канцэрт
8.40 Люстэрка Сі-эн-эн
8.55 Здароўе
9.25 "Нямыя сведкі гісторыі". Навагрудскі замак
9.40 "Лупу — анёл кветак"
10.15 Студыя "Край"
10.45 Пасля "Мядовага месяца"
11.35 "Трывожная памяць". І. Шамякін успамінае франтавыя часы
12.05 "Бацька", м/ф
13.45 "Абнаўленне"
14.15 Шматгалоссе
14.45 "Крок". "Пабудаваць дом..."
15.45 Тэлекрама
15.55 "Пасля 2000 года"
16.25 "Джон Рос. Афрыканскія прыгоды", м/ф, с. 1 (ЗША)
16.55 "Пяць вечароў са Стэфаніяй Станютай", ч. 1
17.30 На музычных паралелях
17.50 "Пяць вечароў са Стэфаніяй Станютай", ч. 2
18.35 Запрашаем на вячоркі
19.35 Вячэрні роздум
19.45 Вясёлы ўік-энд
19.55 Міжнародныя спартыўныя навіны
20.25 Пад купалам Сусвету
20.35 Калыханка
21.00 Навіны
21.40 Кліп-канцэрт
21.50 Бон тон
22.10 "Акалада".
22.40 "Арбітр", м/ф
0.05 "Каралі эстрады". Група "Айран Мэйдэн"
0.40 Відзьма-нявідзьма

Канал "Астанкіна"

6.30 Раніца дзелавога чалавека
7.15 Спорт-шанц
7.45 Слова пастыра
8.00 "Марафон-15" — малышам
8.30 Тэлерадыёкампанія "Мір"
10.00 Ранішняя зорка
10.50 Пад знакам "пі"
11.30 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы
12.10 Эканоміка і рэформы
12.40 "Шпаргалка" з падарункам
12.55 Сусветная геаграфія
13.50, 17.00, 22.50, 23.50 Навіны
14.00 "Памяць аб вялікай вайне. Марынеска", д/ф
14.30 Жывое дрэва рамёстваў
14.35 Галасы Расіі
14.50 Люстэрка
15.35 Клуб падарожнікаў
16.30 Амерыка з М. Таратутам
17.10 Тэлелоцыя
17.30 Малыя гарады Расіі. Надым
18.00 "Уіджэт" (ЗША), "Флона на цудоўным востраве" (Японія). Мультсерыялы
19.00 Надвор'е
19.05 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы
21.00 Нядзеля
21.50 Спартыўны ўік-энд
22.05 Праграма італьянскай культуры і моды ў Масквы
23.05 Каханне з першага погляду

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 16.00, 22.00 Весткі
7.20 Зоркі гавораць
7.30 Рака часу
7.35 "Музычная мяцеліца", ч. 1
8.05 Пілігрым
8.50 Парламенцкі тыдзень
9.35 Тэлеэрудыт
9.40 Рэтра-шлягер
10.10 Зваротны адрас
10.55 "Жывы труп", м/ф
12.30 Кіно ў лютым
12.40 Сялянскае пытанне
13.20 Дэ факта
13.35 "Эдэра"
14.30 Футбол без межаў
15.15 Зоркі Амерыкі
15.45 "Апошні з магікан". Прэм'ера мультфільма (ЗША)
16.40 Свята кожны дзень
16.50 Тэніс. Бельгія — Расія
17.45 Тэлеэрудыт
17.50 Шарман-шоу
19.25 "Каханне", м/ф
21.30 Футбол. Кубак чэмпіёнаў Садружнасці. Фінал
22.30 Аўтаімгненне
22.40 Рака часу
22.45 Праграма "А"
23.45 "Вітгенштэйн", м/ф (Вялікабрытанія)

Санкт-Пецярбург

6.30 "Гадзіна Фрэйзера"
7.00 Добрай раніцы
10.00 Чароўная лінія
10.15 Я і мой кот
10.35 Мультфільмы
11.05 "Прынц за сямю марамі", м/ф
12.25 Музыка на заказ
13.00 Хуткая дапамога
13.30 "Пунсовыя ветразі", м/ф
15.00 "Комік маскоўскага цырка", т/ф
16.05 "Вальдорфская школа", д/ф
16.55 Мультфільм
17.00 Кідайка
17.40 Экспрэс-кіно
17.55, 21.15 Уік-энд з дэтэктывам
18.30, 21.30 Інфарм ТБ
18.50 Эканоміка і мы
19.10 Вялікі фестываль
19.25 "Нана", м/ф (Францыя), с. 4
20.30 Фільм-канцэрт
21.00 Песні нашай памяці
21.45 "Не хочаш — не глядзі"
22.55 Зоркі опернай сцэны. Пласіда Дамінга

НЯДЗЕЛЯ, 5.02

Беларускае тэлебачанне

8.00 Фільм-канцэрт
8.50 "Ну, пачакай!", с. 1—2
9.10 Добрыя весткі
9.20 "Агмень". Беларусы замежжа (Карэлія)
9.50 Урокі Наталлі Наважылавай
10.20 "Не пакідай", м/ф, с. 2
11.30 Фестываль "Тэлебом" у Магілёве
12.30, 13.15 "Мы жадаем шчасця вам..."
13.00 Аўта-парк
13.45 Да 50-годдзя Перамогі. "Стужка ўспамінаў"
14.25 "Іспанскае капрычыо"
14.55 Сітуацыя
15.40 "Усе за ўсмешку"
16.15 Тэлекрама
16.25 Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па бадмінтону. Фіналы
17.15 Мультфільмы
17.35 "Банка коміксаў". Гумарыстычная праграма
18.10 "Рок-каранаванне-94"
19.40 Праспект
20.10 Вясёлы ўік-энд
20.20 Тэлеанонс
20.25 Пад купалам Сусвету
20.35 Калыханка
21.00 Навіны
Канал "Каралеўскае паляванне"
21.40 "Падзорная труба"
21.50 "Стыль"
22.20 36,6 градусаў
22.30 "Вачамі сведкі", м/ф (ЗША)
24.00 "Нов і К"-топ-рэвю
0.30 Бумеранг

Канал "Астанкіна"

7.15 Алімпійская раніца
7.50 Спортлато
8.00 Марафон-15
8.30 Раным-рана
9.00 Палігон
9.30 Пакуль усе дома
10.00 Ранішняя зорка
10.50 Пад знакам "пі"
11.30 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы
12.10 Эканоміка і рэформы
12.40 "Шпаргалка" з падарункам
12.55 Сусветная геаграфія
13.50, 17.00, 22.50, 23.50 Навіны
14.00 "Памяць аб вялікай вайне. Марынеска", д/ф
14.30 Жывое дрэва рамёстваў
14.35 Галасы Расіі
14.50 Люстэрка
15.35 Клуб падарожнікаў
16.30 Амерыка з М. Таратутам
17.10 Тэлелоцыя
17.30 Малыя гарады Расіі. Надым
18.00 "Уіджэт" (ЗША), "Флона на цудоўным востраве" (Японія). Мультсерыялы
19.00 Надвор'е
19.05 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы
21.00 Нядзеля
21.50 Спартыўны ўік-энд
22.05 Праграма італьянскай культуры і моды ў Масквы
23.05 Каханне з першага погляду

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.20 Зоркі гавораць
7.30 Рака часу
7.35 Студыя "Рост"
8.05 Вялікі хакей
8.40 Сусветная вёска
9.10 Добрай раніцы, Еўропа
9.40 Аты-баты...
10.10 Рускае лато
10.55 Каробка перадач
11.10 Лепшыя гульні НБА
12.00, 13.35 Хакей. "Дынама" (Масква) — ЦСКА (Масква)
12.40 Шэсць сотак
13.20 "Не высечы..."
15.05 "Эдэра"
15.55 У свеце жывёл
16.50 Свята кожны дзень
17.00 Чароўны свет Дыснея
18.00 "Застануцца ў памяці" ... А Барысаў, Я. Лявонаў, І. Смактуноўскі, М. Прудкін
19.25 "Партрэт чалавека" ("Гульня ў смерць"), м/ф
21.25 У Ксюшы
22.30 Аўтаімгненне
22.40 Рака часу
22.45 Тэніс. Бельгія — Расія
23.40 Поўня

Санкт-Пецярбург

6.30 "Гаючае слова"
7.00 Добрай раніцы
10.00 "Паглядзім"
10.15 Чароўная лінія
10.30 Экспрэс-кіно
10.45 "Узоры Белага мора", д/ф
11.00 Нядзельны лабірынт
12.35 "Мая музыка". А. Пятроў
13.05 "Эма Цунц", м/ф (Францыя)
14.00 "Класіка-5"
15.25 Чэмпіянат Італіі па футболе
17.25 Канцэрт-рэтра
17.45 "Шубка для хмары", мульт
17.55 Залаты ключ
18.10 "Іржавы дрот"
18.40 Наўздагад
18.55 Вакол антэны
19.30 Інфарм ТБ
19.50 "Тэрарыстка", м/ф
21.25 "Паглядзім"
21.40 Адамаў яблык
22.40 "Хрустальны ключ". Фестываль відэакліпаў

30 студзеня-5 лютага